Направленность репертуара по существу заложена в самом названии театров. Так, для Республиканского театра белорусской драматургии приоритетным направлением является работа с молодыми белорусскими драматургами с последующей постановкой их пьес, что не исключает воплощения национальной и мировой классики. На сцене театра в разное время были поставлены пьесы Я. Купалы, А. Макаёнка, Н. Матуковского, С. Ковалёва, Н. Рудковского, И. Сидорука, Е. Таганова, В. Панина, А. Карелина, А. Щуцкого, С. Бартоховой, Д. Балыко, С. Гиргеля, Д. Богославского и многих других известных и начинающих авторов.

Творчество Белорусского государственного молодёжного театра и Белорусского академического театра юного зрителя в соответствии с их названиями рассчитано на определённую зрительскую аудиторию, основу которой в первом случае составляет молодёжь, во втором – дети младшего, среднего и старшего возраста, а также юношество. Поэтому репертуарная афиша наряду со спектаклями для школьной, взрослой аудитории предполагает включение постановок для маленьких зрителей. В сегодняшней репертуар-

ной афише ТЮЗа: «Полёты вдвоём» М. Богдановича и А. Пашкевич, «Дикая охота короля Стаха» В. Короткевича, «Восемь любящих женщин» Р. Тома, а также известные сказки «Пиноккио», «Кот в сапогах», «Красная Шапочка» и другие.

Разнообразие названий характерно для драматических, кукольных и музыкальных театров Минска. Иной принцип формирования репертуара существует в областных и городских коллективах республики, где театр, как правило, является единственным (за исключением Гомеля) культурным центром. Поэтому их театральная афиша должна быть рассчитана на социально-дифференцированную аудиторию с учётом всех возрастных категорий зрителя.

Очевидно также, что репертуарная политика кукольных театров Беларуси чётко выверена и сориентирована на своего конкретного зрителя. Возможно, поэтому неслучайно отдельные постановки кукольных театров соперничают со спектаклями театров драмы и часто превосходят их по своему художественному уровню. Лидерство театров кукол в последние годы – одна из тенденций современного театрального процесса Беларуси. Так, спектакль «Пиковая дама» А. Пушкина Гродненского театра кукол (реж. О. Жюгжда) стал обладателем Гран-при VIII Международного фестиваля театров кукол, отмечен Призом зрительских симпатий на VI Международном фестивале театров кукол и анимационного кино для взрослых «Кукла тоже человек» (г. Варшава, 2011 г.), а также признан лучшим спектаклем II Национальной театральной премии Беларуси. Из премьерных спектаклей можно выделить: «Записки юного врача» М. Булгакова в постановке Е. Корняга (Белорусский государственный театр кукол), «Локис» С. Ковалёва в режиссуре О. Жюгжды (Гродненский театр кукол).

Что же касается музыкального театра Беларуси, то он продолжает соперничать с самим собой. И в нём очевидна необходимость обновления репертуара новыми произведениями белорусских авторов. Так, балеты для детей хотя и пишутся белорусскими композиторами, но обычно не берутся в постановочный план. Среди имеющихся в творческом багаже авторов назовём следующие произведения: балеты «Тарзан» и «Дюймовочка» В. Савчика, балет-мюзикл «Жила-была Ёлочка» Д. Долгалёва, балеты «Золотой ключик» и «Золушка» О. Ходоско (последний ставился в Латвийской национальной опере, 2006 г.), «Новогоднее счастье» А. Новохроста (по сказке Х. К. Андерсена «Девочка со спичками»), «Дюймовочка» В. Каретникова и т. д.

Обозначим тенденции развития современного театрального искусства Беларуси, которые заключаются, на наш взгляд, в следующем:

– ориентация репертуарной политики ряда театров в большей степени на зарубежную драматургию («Красавица из Линена» М. Донаха – Минский областной драматический театр, Гомельский городской молодёжный театр; «Больница на краю света» Х. Бойчева, «Игра в джин» Д. Ликобурна, «Целуй меня, Кэт!» С. и Б. Спивак – Театр имени Я. Коласа; «Трамвай “Желание”» Т. Уильямса – Национальный академический драматический театр имени М. Горького; «Мышеловка» А. Кристи – Театр-студия киноактёра; «Похищение Джонни» О. Генри – Брестский театр драмы) и другие названия зачастую драматургии развлекательного характера;

– всё более частые постановки классической драматургии («Профит» («Доходное место») А. Островского – Республиканский театр белорусской драматургии; «Дядюшкин сон» по мотивам Ф. Достоевского – Могилёвский областной драматический театр; «Смерть Тарелкина» А. Сухово-Кобылина – Гродненский областной драматический театр; «Крейцерова соната» по мотивам Л. Толстого, «Братья Карамазовы» Ф. Достоевского – Национальный академический драматический театр имени М. Горького) и другие названия; в конечном итоге отдельные спектакли требуют серьёзного критического анализа;

– уход на второй план постановок современной белорусской драматургии, национальной классики, исключением в репертуаре являются немногие спектакли; очевидно исчезновение из репертуара пьес многих популярных молодых белорусских драматургов; тем не менее социально-нравственная тематика, проблемы современности по-прежнему остаются актуальными для театра;

– отсутствие пьес военной, патриотической тематики (исключением является «Не покидай меня!» А. Дударева – Минский областной драматический театр, г. Молодечно).

Открытием театрального сезона, на наш взгляд, стала «Фальшивая нота» Д. Карона Театра-студии киноактёра. Спектакль несёт в себе неразрешимые вопросы морали, личного выбора и нравственной ответственности человека за свои поступки. Обращает на себя внимание яркая, убедительная работа Владимира Мищанчука в главной роли.

Как показывает практика, зрители – будь то совсем юные, молодёжная аудитория и старшее поколение – любят смотреть хорошие, художественные, то есть качественные во всех своих составляющих спектакли. И в каждом из

таких сценических произведений зрителя притягивает профессионализм, который заключается в талантливом сочетании драматургии, режиссёрском замысле, актёрском исполнении, визуально-пластическом решении сценографа, работе композитора. Многие спектакли не имеют названных возрастных категорий. Они интересны любой аудитории.

Театр последнего десятилетия во многом отличается от театра начала XXI в. Он выделяется появлением и новой драматургии, и нового режиссёрского языка, продиктованного ею. Очевидно, что театру начала века были присущи масштабные полотна, такие как «Князь Витовт», «Чёрная панна Несвижа», «Ядвига», «Полочанка» А. Дударева, не только поставленные на Купаловской сцене, но и широко прошедшие в театрах страны и за её пределами. Театр выводил на свои подмостки настоящих героев, красивых и внешностью, и поступками. Они были идеалами конкретного времени, в чём-то примерами для подражания. Таким образом, театр знакомил с историей, стремился быть высокой трибуной. Появление новой драматургии Павла Пряжко, Дмитрия Богославского, Ивана Вырыпаева и других ранее неизвестных авторов продиктовало зарождение иного театра, не плохого и не лучшего, а театра нового времени. Режиссура отдельных современных постановок стремится не к масштабности, а, скорее, к камерности. Выводит совсем иного героя, нашего с вами современника, поднимает проблемы повседневности. Появляются спектакли, в которых персонажи говорят на языке улиц, молодёжи. И зрители, уходя после таких постановок, узнают в героях себя, своих друзей, близких и родных людей. Такой театр идёт в ногу со временем, а иногда опережает его. При этом современный театр имеет и свой взгляд на классику. Он приглашает её в наше время, всё с теми же проблемами, которые не устаревают столетиями. Таким примером может быть спектакль Республиканского театра белорусской драматургии с необычным названием «Профит» по мотивам «Доходного места» А. Островского в постановке А. Гарцуева. Всё те же знакомые (Жадов, Юсов, Белогубов, Юлинька и Полинька), но в спектакле – наши современники в стильных костюмах, платьях и кроссовках. Герои узнаваемы, и многие по их поступкам не вызывают сочувствия.

Популярность театра не падает на протяжении многих веков. Прежде всего потому, что театр – это живое искусство. Оно создаётся профессиональными актёрами на глазах у зрителя. И в этом его неиссякаемая сила. Театральное искусство является неотъемлемой частью духовной культуры современного общества. Большие и малые залы театров сегодня не пустуют. В

них по-прежнему стремятся люди самого разного возраста. Современного зрителя всё так же привлекает неразгаданное искусство переживания, на котором основывается и держится славянский театр, в том числе и театр нашей страны. Этот театр единственный, своеобразный и непохожий на другие. Его своеобразие не только в высоком профессионализме академической сцены, в мощной энергетике её лучших спектаклей, но и в каждом областном театре, драматическом и кукольном коллективе.

В современной театральной эстетике по-прежнему трудно выделить какое-то одно доминирующее направление. Различные течения, стили, направления сосуществуют в своеобразном перекрёстке гармонии контрастов. Театр сохраняет плодотворные традиции психологического реализма и активно усваивает модернистскую эстетику. Психологический вербальный театр, где главное внимание уделяется слову, является таким же жизнеспособным, как и условно-метафорический, ритуально-обрядовый, где предпочтение отдаётся невербальным средствам сценической образности: пластике, хореографии, пантомиме, музыке и т. д. В современном театральном искусстве продолжаются поиски новых театральных форм, приёмов и неожиданных средств визуальной выразительности.

На развитие и укрепление творческих связей большое влияние оказывают ставшие уже традиционными международные и республиканские фестивали, конкурсы, смотры сценического искусства, которые постоянно проводятся в нашей стране. Это фестиваль в городе Гомеле «Славянские театральные встречи», Международный фестиваль «Белая вежа» в городе Бресте; в городе Минске в октябре-ноябре с успехом проходит Международный театральный фестиваль студенческих и молодёжных театров «Тэатральны куфар», в рамках которого проводятся мастер-классы ведущих театральных деятелей России для студентов Белорусской государственной академии искусств и Белорусского государственного университета культуры и искусств, круглые столы практиков и теоретиков по вопросам современного театрального искусства. Продолжает развиваться на сцене Могилёвского областного драматического театра Международный молодёжный театральный форум «Март@контакт», а также «Республиканский фестиваль национальной драматургии имени Винцента Дунина-Мартинкевича», который проводится на базе Могилёвского театра драмы и комедии имени В. Дунина-Марцинкевича в Бобруйске; особенно престижным стал театральный конкурс «Национальная театральная премия», которая проводится раз в два года и демонстрирует состояние и развитие сценического искусства нашей страны.

Руководству театров страны в творческой деятельности, на наш взгляд, следует направить внимание на:

– формирование репертуара, ориентированного на социально дифференцированную аудиторию, сохранение нравственных ценностей, традиционных для нашего народа и его национального менталитета, духовное формирование нации и содействие её национально-культурному обновлению средствами сценического искусства, воспитание у зрителя, особенно у молодёжи, чувства патриотизма, уважения к старшему поколению.

– поиск новых театральных идей и расширение образных средств сценической выразительности;

– сочетание творческих традиций и новаций через совместную работу в спектаклях актёров разных поколений.

Приоритетным в деятельности театров должно стать:

– активное освоение белорусской классической драматургии и произведений, которые воспроизводят национальную историю;

– разработка современной проблематики, поиск и открытие имён новых белорусских драматургов;

– творческое сотрудничество с зарубежными театральными деятелями через фестивальное движение и опыт разных театральных школ;

– направленность на создание программных (этапных) спектаклей, которые бы определяли основные эстетические направления и творческие особенности каждого из коллективов;

– формирование репертуара с учётом наиболее полного раскрытия творческого потенциала труппы.

Такие подходы, постепенная и неотвратимая их реализация, на наш взгляд, не только окажут плодотворное влияние на творческое развитие национальной театральной культуры, но и будут способствовать её более активной и созидательной роли в современных процессах государственного строительства.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Бузук, Р. Л. Беларускі тэатр і глядач на парозе XXI стагоддзя / Р. Л. Бузук. – Мінск : БДІПК, 2004. – 254 с.

2. Гаробчанка, Т. Я. На мяжы стагоддзяў: сучасны беларускі драматычны тэатр / Т. Я. Гаробчанка. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 367 с.

3. Орлова, Т. Д. История театра в вольном изложении / Т. Д. Орлова. – Минск : Медисонт, 2010. – 235 с.

4. Орлова, Т. Д. Театральная критика нового времени / Т. Д. Орлова. – Минск : Літаратура і мастацтва, 2010. – 230 с.

5. Ярмалінская, В. М. Міжнародны тэатральны фестываль «Белая Вежа»: вопыт і школа майстэрства / В. М. Ярмалінская // Музычнае і тэатральнае мастацтва. – 2009. – № 1. – С. 137 – 149.

6. Ярмалінская, В. М. Сучаснае тэатральнае мастацтва Беларусі: рэжысура, акцёрскае майстэрства, сцэнаграфія / В. М. Ярмалінская // Беларускі гістарычны часопіс – 2011. – № 7. – С. 30 – 37.

РЕЗЮМЕ

Основным исследованием автора является репертуар как выявление концептуальной программы театра. Доказано, что репертуар способен показать как систему нравственных ориентиров и ценностей, так и идейно-художественную позицию театра.

SUMMARY

The author's main research is the repertoire – as the identification of the conceptual program of the theater. It is proved that the repertoire is able to show both the system of moral guidelines and values, and the ideological and artistic position of the theater.

***Ячная Т. А.***

# УЛАДЗІМІР ТЭРАЎСКІ І ЯНКА КУПАЛА: ДА ПЫТАННЯ АСАБЛІВАСЦЕЙ МАСТАЦКАГА ЗМЕСТУ ЛІТАРАТУРНАЙ АСНОВЫ ВАКАЛЬНЫХ ТВОРАЎ

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 12.03.2022)*

У рэчышчы пошуку літаратурнай асновы для вакальнага твора нацыянальныя кампазітары надаюць вялікую ўвагу беларускай літаратуры. Сучасныя выканаўцы вакальнай музыкі на беларускай мове імкнуцца да высокамастацкага ўзнаўлення, якое патрабуе спецыяльнага аналізу твора, яго партытуры. Пры гэтым аналіз мастацкага зместу літаратурнай асновы вакальнага твора – першапачатковы этап [1 – 3]. Для прафесійнага выканання і стварэння канцэпцыі трактоўкі музычнай цэласнасці спявак-вакаліст (або дырыжор хору) павінен глыбока ўнікнуць у мастацкі змест літаратурнай асновы, паколькі менавіта тэкст інспіруе шлях творчай думкі кампазітара. Вакальная музыка належыць да вобласці сінтэтычных жанраў (разам з музычна-тэатральнымі), у якіх шляхам сінтэзу слова і музыкі ствараецца сістэма мастацкіх вобразаў партытуры. Для вакальнага твора кампазітар (падобна да таго, як гэта адбываецца ў оперы), абірае і кампануе літаратурную аснову, стварае свайго рода «лібрэта». Такім чынам, літаратурны тэкст, як правіла, інспіруе мастацкую канцэпцыю, што паўстае ў выніку сінтэзу слова і музыкі ў партытуры. У сваю чаргу выканаўца, прыступаючы да аналізу партытуры,

таксама звяртае ўвагу спачатку на аўтара тэксту і саму літаратурную аснову. І калі аналізу музычнага тэксту, які ўключае ў сябе спасціжэнне музычнага жанру і стылю, формы, фактуры і іншых кампанентаў, у адукацыі музыканта нададзена дастаткова ўвагі, то выканальніцкі аналіз літаратурнай асновы вакальнага твора спецыяльна не прадугледжаны ў падрыхтоўцы прафесійных музыкантаў [4 – 7]. Між тым для стварэння выканальніцкай канцэпцыі патрабуецца глыбокае спасціжэнне мастацкага зместу літаратурнага тэксту. Менавіта сэнс слова дае падставу на стварэнне выканальніцкай канцэпцыі, а музыканты не валодаюць інструментамі спецыяльнага аналізу, які ставіць перад сабой мэту азначэння зместу слова. Выканальніцкаму аналізу вакальнага твора надаецца нямала ўвагі ў харазнаўчых працах У. Л. Жывава, Г. А. Дзмітрэўскага, Т. С. Багданавай і іншых [1; 2; 8], але да гэтага часу не распрацаваны алгарытм для выканальніцкага аналізу літаратурнага тэксту партытуры. Гэта актуалізуе праблематыку дадзенага артыкула, мэта якога – выяўленне асаблівасцей мастацкага зместу літаратурнай асновы вакальных твораў. Для дасягнення гэтай мэты за аснову ўзяты распрацаваны намі раней алгарытм выканальніцкага аналізу літаратурнага тэксту, прыменены на прыкладзе абранага намі твора.

Шмат кампазітараў звярталіся да тэксту верша Янкі Купалы «А хто там ідзе?», які ўвайшоў у цыкл хораў «Янка Купала» Андрэя Мдзівані. Рыгор Пукст напісаў кантату «А хто там ідзе?» для хору, салістаў і сімфанічнага аркестра. Кім Цесакоў стварыў араторыю «Мы – беларусы» на словы Янкі Купалы, Пімена Панчанкі і Максіма Танка, дзе ў пралогу і эпілогу гучыць верш «А хто там ідзе?». Але адзін з першых харавых варыянтаў быў напісаны Уладзімірам Тэраўскім і змешчаны ў зборніку «Беларускі лірнік» (1922). Таму далей мы будзем разглядаць менавіта гэты вакальны твор.

На нашу думку, першым этапам выканальніцкага аналізу літаратурнага тэксту павінна быць выяўленне асаблівасцей функцыянавання літаратурнай асновы твора ва ўмовах пэўнай сацыякультурнай парадыгмы.

Верш «А хто там ідзе» быў напісаны ў 1905 – 1907 гг., калі Янка Купала працаваў у Яхімоўшчыне памочнікам вінакура Сасноўскага на бровары ў маёнтку пана Любанскага. У пачатку XX ст. нацыянальная свядомасць беларусаў была вельмі слабай. Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. у Беларусі не перарасла ва ўзброенае паўстанне, але не магла не адгукнуцца ў думках беларускай інтэлігенцыі. Праз шмат гадоў сам Янка Купала так выказваўся пра свой верш: «Мне хацелася крыкнуць на ўвесь свет аб тым, як цяжка пакутуе народ пад прыгнётам цара і капіталістаў. Мне хацелася намаляваць вобраз народа,

які ідзе з рукамі ў крывавых мазалях, з нагамі ў лапцях і нясе на плячах сваю крыўду. Мне хацелася, каб гераічны і свабодалюбівы беларускі народ знішчыў усіх сваіх крыўдзіцеляў» [9]. Верш быў апублікаваны ў зборніку «Жалейка» у 1908 г.

Другім этапам з'яўляецца фундаментальнае разуменне генезісу і лексічнай семантыкі, а трэцім – вызначэнне асаблівасцей кампазітарскай (аўтарскай) трактоўкі літаратурнага арыгінала (ці першакрыніцы) у працэсе кампаноўкі літаратурнага тэксту вакальнага твора.

Арыгінальны верш напісаны лагаэдам (памер, калі ў вершаваных радках у строгай паслядоўнасці чаргуюцца розныя па характары стопы). Гэты невялікі па аб'ёму твор уражвае сваёй ёмістасцю. У ім Янка Купала разважае над лёсам беларусаў. У 16 радках ён малюе партрэт цэлага народа ў адзін з найбольш важных перыядаў яго гісторыі – калі беларусы ператвараюцца ў нацыю. Гэты верш перакладзены на больш чым восемдзесят моў.

Янка Купала пачынае свой твор з рытарычнага пытання, а потым нібы пашырае гэтае пытанне і надае яму больш канкрэтную форму. Але паэт не спяшаецца стварыць пытаннем нейкі вобраз. Ён дэманструе, што трапіць пад прыгнёт можа любы народ. Тое, што гэта беларусы, бачна толькі ў трэцім радку верша – адказ на пытанне, кароткі і рэзкі, нібы выбух.

Паэт выкарыстоўвае розныя формы гукапісу (паўторы аднолькавых гукаў, гукаспалучэнняў, рытмічных малюнкаў, слоў, словазлучэнняў і нават фраз), алітэрацыю, асананс, анафару, эпіфару, каб паказаць нарастаючы рух думак і пачуццяў, масавасць і згуртаванасць: *«А хто **там** ідзе, а хто **там** ідзе? У агромністай **такой** грама**дзе**?»*. Усё гэта аказвае пэўнае зрокавае і слыхавое ўздзеянне.

Выкарыстанне слова «агромністы» таксама звяртае на сябе ўвагу. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы дае наступнае азначэнне гэтага слова: «Агромністы – вельмі вялікі, велізарны» [10, с. 30]. «Беларуска-рускі слоўнік» вызначае слова як размоўнае, што малюе ўжо сацыяльны вобраз тых, хто рушыць гэтай грамадой [11, с. 115]. Суфікс «-іст-», з дапамогай якога ўтварыўся дадзены прыметнік, паказвае, што нехта ці нешта валодае чымсьці ў вялікай колькасці. Такім чынам, ужо з першых трох радкоў адчуваецца сіла і моц, якія паступова павялічваюцца і якія немагчыма спыніць.

З лексічнага боку цікавае слова «грамада», што даволі складана перакладаецца на іншыя мовы. З аднаго боку, гэта «натоўп», а з другога – «грамадства». Слова адначасова паказвае на колькасць і дэманструе, што людзі ў гэтым гурце звязаны моцнымі сацыяльнымі сувязямі. Гэта вельмі

важна, што на пытанні, пастаўленыя паэтам, адказвае менавіта не «натоўп», а «грамада» – людзі, якія ўжо усвядомілі сябе народам.

Амаль усе гэтыя сэнсы Уладзімір Тэраўскі здолеў адлюстраваць і ў музычным тэксце. Першая фраза ва ўсіх чатырох партыях ідзе ва ўнісон. У другой ужо гучыць чатырохгалоссе. У трэцяй ёсць музычныя паўторы з першых фраз. І адказ «Беларусы» зноў гучыць ва ўнісон, што дадае гэтай музычнай частцы закончаную форму (нотны прыклад 1).

Нотны прыклад 1.




Увесь верш разбіты на лагічныя часткі па тры радкі. У двух радках сфармулявана пытанне, а трэці дае на яго адказ. У наступнай частцы верша амаль не выкарыстоўваецца гукапіс, але вялікая ўвага надаецца лексічнаму складніку слоў, якія абірае паэт. Яго цікавіць, што нясуць беларусы *«на худых плячах, на руках ў крыві, на нагах у лапцях»*. Ключавымі тут з'яўляюцца лексічныя адзінкі «худых, у крыві, у лапцях», якія адпавядаюць голаду, здзекам, катаванням. Такім чынам, вымалёўваецца вобраз пакуты, якая ідзе побач з беларускім народам. І гэтыя няшчасныя людзі нясуць на сябе крыўду.

У. Тэраўскі ў гэтай частцы ставіць дзве ферматы (на канцы пытальнага сказа і на самім адказе) і гэтымі паўзамі прыцягвае ўвагу слухача да тэксту (нотны прыклад 2).

Нотны прыклад 2.






«Крыўда» – адно з асноўных слоў верша (і харавога твора). На яго выканаўца абавязкова павінен звярнуць увагу, бо пад крыўдай тут разумеюцца няшчасце і боль. Слоўнік сінонімаў дае адпаведнікамі слову «крыўдна» «горка» і «балюча» (у пераносным сэнсе) [12, с. 261].

Наступныя шэсць радкоў верша вытрыманы у той жа манеры двухрадковага пытання і кароткага адказу. У гэтай частцы Янка Купала распрацоўвае тэму «крыўды», і тут ужо з'яўляюцца словы «бяда, гора», якія пацвярджаюць наша папярэдняе выказванне. Тут сустракаецца лічэбнік «мільён», прычым ён не адзін, які ўдакладняе слова «грамада» з першай часткі верша. Гэта не сотні людзей, і нават не тысячы. Гэта ўся Беларусь. Янка Купала паказвае, што менавіта незадаволенасць беларусаў жыццём падштурхнула іх вынесці сваю крыўду «на паказ», «на цэлы свет», разбудзіла іх нацыянальную свядомасць і прывяла да таго, што яны асэнсавалі сваю нацыянальную ідэнтычнасць.

Але У. Тэраўскі не ўключыў гэтыя шэсць радкоў у тэкст песні, напэўна, палічыўшы, што папярэдняй тэкставай інфармацыі дастаткова для раскрыцця тэмы. Дзякуючы гэтаму твор атрымаўся нават больш выразным, бо ўвага слухача не адцягваецца на дадатковую інфармацыю, а накіравана на самыя вострыя моманты літаратурнага тэксту.

Ніжэй прыведзены верш. Для таго, каб прааналізаваць, як кампазітар кампануе тэкст свайго твору, мы тлустым шрыфтам вылучылі агульны тэкст як для верша, так і для харавога твора, а звычайным шрыфтам пазначылі радкі, якія кампазітар прыбраў, калі кампанаваў літаратурны тэкст для свайго хору:

***А хто там ідзе, а хто там ідзе***
***У агромністай такой грамадзе?***
***– Беларусы.***
***А што яны нясуць на худых плячах,***
***На руках ў крыві, на нагах у лапцях?***
***– Сваю крыўду.***
*А куды ж нясуць гэту крыўду ўсю,*

*А куды ж нясуць на паказ сваю?*
*– На свет цэлы.*
*А хто гэта іх, не адзін мільён,*
*Крыўду несць наўчыў, разбудзіў іх сон?*
*– Бяда, гора.*
***А чаго ж, чаго захацелась ім,***
***Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?***
***– Людзьмі звацца.***

Непасрэдная кульмінацыя верша – апошнія тры радкі. Яны раскрываюць жаданне ўсяго гэтага «сляпога, глухога, пагарджанага век» народа. Беларусы хочуць «людзьмі звацца», патрабуюць павагі, прызнання, жадаюць, каб іх лічылі нацыяй, каб знік Паўночна-Заходні край і на картах свету і ў сумленні іншых народаў з'явілася незалежная, вольная Беларусь. «Людзьмі звацца» – гэта не проста быць, існаваць, а з'яўляцца роўнымі іншым народам свету. Фраза «людзьмі звацца» стала лозунгам для шматлікіх пакаленняў беларусаў, якія ў розныя часы змагаліся за незалежнасць сваёй бацькаўшчыны.

У. Тэраўскі арыгінальна падышоў да коды. Пасля асцярожнага піянісіма і ферматы хор уступае на форта, меладычна паўтараючы пачатак твора. Але потым ідзе нарастаючая лавіна адказу (басы, пасля да іх далучаюцца тэнары, альты і сапрана). Галоўная фраза купалаўскага верша «людзьмі звацца» паўтараецца ў творы У. Тэраўскага чатыры разы (нотны прыклад 3).

Нотны прыклад 3.






Мы прыйшлі да высноў, што выканальніцкая канцэпцыя стварэння інтэрпрэтацыі вакальнай (харавой) музыкі патрабуе дасканалага ўяўлення аб сэнсе і змесце літаратурнага тэксту партытуры. Нацыянальная вакальная музыка жыве ў асяроддзі пэўнай моўнай культуры, інтэгравана ў сацыяльнае жыццё, абумоўлена ім. Таму навукова абгрунтаваная канцэпцыя выканальніцкага аналізу літаратурнага тэксту вакальных твораў уключае тры ўзаемазвязаныя этапы: 1) фундаментальнае разуменне генезісу і лексічнай семантыкі; 2) выяўленне асаблівасцей функцыянавання літаратурнай асновы твора ва ўмовах пэўнай сацыякультурнай парадыгмы; 3) вызначэнне асаблівасцей кампазітарскай (аўтарскай) трактоўкі літаратурнага арыгінала (ці першакрыніцы) у працэсе кампаноўкі літаратурнага тэксту вакальнага твора.

У выканальніцкім аналізе твора У. Тэраўскага «А хто там ідзе?», у аснову якога пакладзены верш Янкі Купалы, мы надалі ўвагу генезісу і лексічнай семантыцы літаратурнага арыгінала, якім карыстаўся аўтар музыкі, і прыйшлі да высновы, што тэкст Янкі Купалы мае вострасацыяльны генезіс і патрыятычны напрамак. Паэт выкарыстаў розныя формы гукапісу, каб паказаць нарастаючы рух думак і пачуццяў, масавасць і згуртаванасць. Янка Купала абраў своеасаблівыя лексічныя адзінкі для ўзмацнення вобразнасці. Мы выявілі асаблівасці функцыянавання літаратурнай асновы арыгінальнага твора, што выкарыстаў кампазітар, і паказалі, у якіх сацыягістарычных умовах і біяграфічных абставінах яны былі напісаны. На трэцім этапе выканальніцкага аналізу вызначаны асаблівасці кампазітарскай (аўтарскай) трактоўкі літаратурнай першакрыніцы ў працэсе кампаноўкі літаратурнага тэксту вакальнага твора; заўважана, што У. Тэраўскі не ўключае пэўныя радкі верша ў тэкст песні і тым самым робіць яе больш выразнай, бо ўвага слухача не адцягваецца на дадатковую інфармацыю, а накіравана на самыя вострыя моманты літаратурнага тэксту.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Дмитревский, Г. А. Хороведение и управление хором: элементарный курс / Г. А. Дмитревский. – М. : Госмузиздат, 1957. – 106 с.

2. Живов, В. Л. Хоровое исполнительство. Теория. Методика. Практика : учебное пособие для студентов ВУЗов / В. Л. Живов. – М. : Владос, 2003. – 272 с.

3. Краснощёков, В. И. Вопросы хороведения / В. И. Краснощёков. – М. : Музыка, 1969. – 300 с.

4. Ручьевская, Е. А. Слово и музыка / Е. А. Ручьевская. – Л. : Музгиз, Ленинградское отд-е, 1960. – 55 с.

5. Васина-Гроссман, В. А. Музыка и поэтическое слово : в 3 ч. / В. А. Васина-Гроссман – М. : Музыка, 1972 – 1978. – Ч. 1. Ритмика. – 1972. – 149 с.

6. Васина-Гроссман, В. А. Музыка и поэтическое слово : в 3 ч. / В. А. Васина-Гроссман. – М. : Музыка, 1972 – 1978. – Ч. 2. Интонация ; ч. 3. Композиция. – 1978. – 368 с.

7. Холопова, В. Н. Русская музыкальная ритмика / В. Н. Холопова. – М. : Советский композитор, 1983. – 281 с.

8. Богданова, Т. С. Основы хороведения : учебное пособие / Т. С. Богданова – Минск : БГПУ, 2009. – 132 с.

9. Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала ; прадм. У. Гніламёдава. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. – Т. 1. Вершы, пераклады, 1904 – 1907. – 462 с.

10. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / уклад.: І. Л. Капылоў [і інш.] ; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : БелЭн, 2016. – 968 с.

11. Беларуска-рускі слоўнік : у 3 т. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – 3-е выд. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 1. А – З. – 1120 с.

12. Клышка, М. К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М. К. Клышка. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 592 с.

РЕЗЮМЕ

В статье автор обращается к проблеме исполнительского анализа литературного текста вокальных произведений. Т. А. Ячная предлагает разработанный ею алгоритм осуществления данного типа анализа для создания высокохудожественной исполнительской концепции.

SUMMARY

In this article the author addresses the problem of performing analysis of the literary text of vocal works. T. A. Yachnaya offers an algorithm developed by her to implement this type of analysis for creating a highly artistic performance concept.

# РАЗДЗЕЛ III
# ПРАБЛЕМЫ ЭТНАЛОГІІ, АНТРАПАЛОГІІ, ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ І СЛАВІСТЫКІ

***Азарова И. Б.***

## ВЛИЯНИЕ ПРИТЧЕЙ Ф. СКОРИНЫ НА ФИЛОСОФСКО-АЛЛЕГОРИЧЕСКУЮ ПРОЗУ М. БОГДАНОВИЧА

*Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины*

*(Поступила в редакцию 10.03.2022)*

Франциск Скорина является крупнейшим культурным деятелем белорусского Средневековья. Он, по мнению таких исследователей, как А. Ф. Коршунов [1], Е. Л. Немировский [2], В. А. Чемерицкий, В. И. Мелешко, З. Ю. Копысский [3], О. А. Лойко [4], был одним из первых в славянском мире, кто обратился к фольклорному жанру притчи, поскольку видел его исключительно важное значение, отмечал глубокий символический смысл, роль этого дидактического жанра для популяризации практической мудрости.

Притча – дидактико-аллегорический жанр литературы – обладает рядом характерных особенностей: «1) возникает в некотором контексте, 2) допускает отсутствие развитого сюжетного движения и может редуцироваться до простого сравнения, сохраняющего, однако, особую символическую наполненность; 3) с содержательной стороны притча отличается тяготением к глубинной “премудрости” религиозного или моралистического порядка. Притча в своих модификациях есть универсальное явление мирового фольклорного и литературного творчества» [5].

Именно поэтому своё понимание сущности притчи Ф. Скорина изложил в предисловиях к таким книгам Библии, как «Притчи Соломона», «Премудрости Иисуса, сына Сирахова», «Екклесиаст» и других, в которых белорусский гуманист рассмотрел проблемы духовности и смысла жизни. Например, в предисловии к книге «Притчи Соломона» Ф. Скорина утверждал, что главное предназначение человека заключается в утверждении земной жизни, а объектом этики является проблема, *«яко ся имамы справовати и жити на сем свете»* [6].

В качестве безусловного жизненного ориентира, сборника важнейших моральных, нравственных, этических и других норм Ф. Скорина предлагал читать притчи: *«…притчи или пресловия, понеже иными словы всегда иную мудрость и науку знаменують, а иначей ся разумеють, нежели молвены бывають, и болши в*

*собѢ сокритых таин замыкають, нежели ся словами пишуть»* [6]. Известный гуманист чрезвычайно высоко ценил полезный для всех сословий и возрастов жанр – мудрых и необразованных, бедных и богатых, старых и молодых: «Ест бо в сих притчах сокрита мудрость, якобы моць в драгом камени, и яко злато в земли и ядро во ореху» [6].

Притчи Соломона содержат свод морально-этических норм, которые в переводе Ф. Скорины преображаются, традиционный библейский текст приобретает некоторую житейскую привычность и повседневность: *«Лучши есть позвану быти к капусте с любовию, нежели к тучному тельцу со враждою»* [6]. В притчи, обличающие ленность, органично вплетается лексика разговорного стиля: *«И доколе, ленивый, спишь, скоро ль встанешь от сна твоего? Маленько поспишь, маленько подремлешь, маленько сложишь руце твое абы поспал, и придет на тя... нищета и... убожество»* [6]. Поражает точность характеристики человека поверхностного и необязательного, так называемого «человека-бегуна», который, по мнению Ф. Скорины, *«есть муж непотребный... моргает очима, копочет ногою, перстом говорит, сердцем злым мыслит злая и по свя часы свары розсевает»* [6].

В комментариях к «Екклесиасту» белорусский гуманист констатировал многогранность и сложность жизненных ситуаций и позиций реального человека, многообразие его ориентаций в системе ценностей. К примеру, Ф. Скорина отмечал, что автор «Екклесиаста» *«пишет о науце всех людей посполите сущих в летех мужства, приводячи им на памець суету, беду и працу сего света, поняже в розмантых речах люди на свете покладают мысли и кохания своя; едины в царствах и панованиии, друзии в богатестве и в скарбах, инии в мудрости и в науце, а инии в здравии, в красоте и в крѢпости телесной, неции же во множестве имения и статку, а неции в роскошном ядении и питии и в любодеянии, инии теже в детях; в приятелех, во случаях и во иных различных многых речах. А тако единый каждый человѢк имать некоторую речь пред собой, в ней же ся наболей кохает и о ней мыслит»* [7].

Намного позже, четыреста лет спустя, белорусский поэт, писатель, духовный наследник Ф. Скорины М. Богданович обратился к древнему фольклорному жанру притчи, преобразовав его в авторский литературный жанр, тем самым определяя новое направление в формирующейся белоруской прозе – философско-аллегорическое. Именно М. Богданович первым в стихотворении «Безнадзейнасць» ввел в художественную традицию образ великого первопечатника и гуманиста – «доктара лекарскіх навук» [8].

Как и Ф. Скорина, М. Богданович обратился к фольклорному материалу, обработал его и создал сказку «Башня мира», всевременную и чрезвычайно акту-

альную. Она очень похожа на дидактико-аллегорические притчи Ф. Скорины по важности и глубине освещения общечеловеческих «вечных» вопросов.

М. Богданович творчески подошёл к обработке традиционного сказочного сюжета. В неком пространстве и времени, на перекрёстной грани четырёх ветров правил могучий царь. Всё было в его власти: Земля, Океан, Вулкан, Солнце, природные красоты и люди. Был он мудр, и сила его равнялась его мудрости. Время от времени шли войны, которые поощрял владыка, так как *«в них видел торжество силы и разума <...> А жизнь слабых была ничтожна в его глазах <...> Он был слишком велик, чтобы жалеть о ничтожном и слабом, – слишком мудр, чтобы сокрушаться о малом»* [9, с. 138 – 139]. Однако в одном он был уязвим, беззащитен и совершенно безотказен: его дочь, печальная царевна, обратилась к отцу с просьбой о постройке высокой хрустальной башни, с которой можно следить за миром. В случае войны или междоусобицы царевна забросала бы их клочьями белых облаков, ветры же, по её просьбе, засыпали бы глаза воюющих песком, а солнце закрыло бы источник света. Не по душе пришлась царю просьба дочери, но сильная отцовская любовь не позволила ему отказать. Однако попытки строительства башни оказались неудачными, так как строили её зодчие с «грязными руками» [9, с. 144]. Последняя реализация этого проекта на телах безгрешных младенцев и слезах их матерей тоже не увенчалась успехом. До сих пор «царь ищет зодчих с чистыми руками» [9, с. 144]. Эта «сказка» имеет глубокий философский смысл. Символическая хрустальная башня, построенная чистыми руками зодчих, воплощает высокую, но хрупкую мечту человека со светлыми помыслами о гармоничном мироздании. Бескомпромиссно подвергается осуждению культ зла и насилия. Грязные мысли не рождают добро. Каждый человек должен начать с себя, с собственного очищения.

В данном случае жанр притчи служит своеобразным ориентиром в мире морально-этических норм. Притча – универсальное явление мирового фольклора и литературного творчества. Её дидактико-аллегорический и афористический характер заключён в рамки библейских, фольклорных, авторских книг [10]. Для определённых культурных эпох, особенно тяготеющих к дидактике и аллегоризму, притча была центральным жанром, эталоном для других.

В начале XX в. М. Богданович будет осмысливать в аллегорических формах, как и его великий предшественник, новое, а именно понятие Красоты как высшей субстанции духовности и нравственности [11; 12]. Красота везде: в искренней мечте царевны о мире, она в «Сон-траве» – сказках и мечтах, которые входят в мир человека, наделённого умом и чувствами. Его душа ждёт чего-то необычного, тайного. Он никогда не станет потешаться над сказочником и предла-

гать ему заняться чем-то более земным. Такой *«послушает – послушает <... > и начнёт томиться бог весть о чём <... > Не найдёт себе покоя такой человек, будет он всю жизнь свою томиться, обо всём этом людям рассказывать»* [9, с. 56]. Прекрасны цветущие синие васильки среди золотых колосьев. И не поднимается рука человека вырвать их с корнем, потому что *«с детских лет красоту их полюбила душа <...> Пусть растут и радуют, как в детстве, сердце моё <...> хорошо быть колосом; но счастлив тот, кому пришлось стать васильком. Потому что к чему колосья, когда нет васильков?»* [9, с. 59]. Красота в Мадоннах, созданных художниками, которые, *«жаждая образ высшей красоты создать <...> попробовали в одном лице слить между собой черты и девственной, и материнской красы. Слить, понимаете, и образом этим завершить всё здание искусства, выросшее из преклонения перед женственностью и её красотой»* [9, с. 45].

Философско-аллегорическая проза молодого автора характеризуется выходом за круг земных проблем, разработкой общечеловеческих вопросов жизни на земле, обращением к образу Спасителя в миниатюре «Калейдоскоп жизни». Поэтому неслучайно высшей инстанцией выступает Христос с мудрой речью, что *«нет бесполезной красоты, ибо сама красота и есть то, от чего растёт душа человека»* [9, с. 59].

Жанр притчи, который М. Богданович пытался привить в начале XX в., оказался весьма плодотворным для реализации философской идеи в конце столетия в творчестве А. Адамовича, В. Быкова, соединив тем самым устремления Ф. Скорины и его потомков.

**ЛИТЕРАТУРА**

1 Коршунаў, А. Ф. Літаратурна-публіцыстычная спадчына Францыска Скарыны / А. Ф. Коршунаў // Прадмовы і пасляслоўі / Ф. Скарына ; аўт. пасляслоўя А. Ф. Коршунаў, М. І. Прашковіч. – Мінск, 1969. – С. 182 – 196.

2 Немировский, Е. Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорусского просветителя / Е. Л. Немировский. – Минск : Мастацкая літаратура, 1990. – 597 с.

3 Скарына і яго эпоха / В. А. Чамярыцкі [і інш.] ; рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 482 с.

4 Лойка, А. А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд / А. А. Лойка ; пад рэд. Ю. С. Пшыркова. – Мінск : Вышэйшая школа, 1980. – 440 с.

5 Большая советская энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://dic.academic.ru/dic.nsf/bse/123924/%D0%9F%D1%80%D0%B8%D1%82%D1%87%D0%B0. – Дата доступа: 12.03.2022.

6 Скорина, Ф. «Притчи Соломона» [Электронный ресурс] / Ф. Скорина. – Режим доступа: https://viewer.rusneb.ru/ru/rsl01004087060?page=3&rotate=0&theme=white. – Дата доступа: 13.03.2022.

7 Библия. Еклесиастес, или Соборник премудраго царя Саломона Екклезиаст [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://belbook.nlb.by/exhibits/show/skaryna/item/9#?c=0&m=0&s=0&cv=0. – Дата доступа: 12.03.2022.

8 Багдановіч, М. Вянок. Кніжка выбраных вершаў [Электронны рэсурс] / М. Багдановіч. – Рэжым доступу: http://rv-blr.com/literature/2693#313. – Дата доступу: 12.03.2022.

9 Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – Т. 2. Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы. – 600 с.

10 Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В. М. Кожевникова, П. А. Николаева. – М. : Советская энциклопедия, 1987. – 752 с.

11 Макарэвіч, А. М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст. / А. М. Макарэвич. – Магілёў: Выд-ва Магілёўскага дзяржаўнага ўн-та імя А. А. Куляшова, 1999. – 332 с.

12 Мушынскі, М. І. Навуковая і літаратурна-крытычная спадчына М. Багдановіча / М. І. Мушынскі // Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1993. – Т. 2. Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы. – С. 446 – 480.

РЕЗЮМЕ

Предметом исследования статьи является фольклорный жанр притчи, к которому одним из первых обратился Франциск Скорина. Своё понимание сущности притчи он изложил в предисловиях к книгам Библии «Притчи Соломона», «Премудрости Иисуса, сына Сирахова», «Екклесиаст», где рассмотрел проблемы духовности и смысла жизни.

Как и Ф. Скорина, М. Богданович обратился к фольклорному материалу, создал сказку «Башня мира», похожую на дидактико-аллегорические притчи Ф. Скорины по важности и глубине освещения общечеловеческих «вечных» вопросов. Фольклорный жанр притчи, освоенный Ф. Скориной и развитый в начале XX в. М. Богдановичем, оказался весьма плодотворным для реализации философских идей в конце XX в.

SUMMARY

The subject of the article is the folklore genre of the parable, which was one of the first to be addressed by Francysk Skaryna. He sets out his understanding of the essence of the parable in the prefaces to the well-known anthological books of the Bible: «The Parables of Solomon», «The Wisdom of Jesus, the son of Sirach», «Ecclesiastes», in which the Belarusian humanist considers the problems of spirituality and the meaning of life.

Like F. Skorina, M. Bogdanovich turns to folklore material, creates a fairy tale «The Tower of Peace», similar to Skorina's didactic-allegorical parables in terms of the importance and depth of coverage of universal «eternal» issues. The folklore genre of the parable, mastered by F. Skorina, and which M. Bogdanovich is trying to instill at the beginning of the XX century, turned out to be very fruitful for the realization of a great philosophical idea.

*Аўсейчык У. Я.*

# СТАРАВЕРЫ БЕЛАРУСКІХ ПАВЕТАЎ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIX СТ.: АРЭАЛЫ ПАСЯЛЕННЯ І КОЛЬКАСНЫ СКЛАД

*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 21.02.2022)*

Адна з асноўных зон рассялення старавераў на тэрыторыі Беларусі лакалізуецца ў паўночна-ўсходняй яе частцы. Як сведчаць крыніцы, стараверскае насельніцтва перасяляецца на гэтыя землі яшчэ з XVIII ст. Аднак у крыніцах утрымліваюцца дастаткова фрагментарныя звесткі аб іх колькасці і асаблівасцях рассялення ў гэты перыяд у рэгіёне. Не хапае такіх звестак і напачатак XIX ст. Больш поўныя і сістэмныя даныя аб рассяленні стараверскага насельніцтва ў рэгіёнеадносяцца толькі да сярэдзіны XIX ст. У гэты перыяд значная частка гэтага рэгіёна тэрытарыяльна адносілася да Віцебскай губерні.

Мэта артыкула – выявіць арэалы рассялення стараверскага насельніцтва і ахарактарызаваць яго колькасны склад у сярэдзіне XIX ст. на беларускіх землях Віцебскай губерні. Крыніцамі для даследавання з’явіўся комплекс статыстычных матэрыялаў і архіўных даных.

Адносна сістэмныязвесткі аб колькасці старавераў на беларускіх землях адносяцца да канца 1830-х гадоў. Згодна з прадпісаннем міністра ўнутраных спраў ад 24 кастрычніка 1835 г. у губернях павінен быў ажыццяўляцца збор інфармацыі аб колькасці старавераў і іх храмаў. Звесткі павінны былі сістэматызавацца і штогод прадстаўляцца ў міністэрства [11, с. 151 – 152]. У адпаведнасці з прадпісаннем ажыццяўляўся збор даных па губернях, паветах і асобных населеных пунктах. Таму з гэтага часу маецца даволі сістэмнаяінфармацыя аб колькасці старавераў у беларускіх губернях і месцах іх пражывання.

Як вынікае з аналізу статыстычных даных, у сярэдзіне XIX ст. Віцебская губерня з’яўлялася лідарам па колькасці старавераў як сярод заходніх губерняў Расіі, так і сярод беларускіх губерняў. Згодна з архіўнымі данымі, у 1837 г.у губерні,без уліку Рэжыцкага і Веліжскага паветаў, налічвалася каля 22 тысяч старавераў [3, арк. 59 – 71 адв.]. Беларускі гісторык А. А. Гарбацкі падае гэтую лічбу за агульную колькасць стараверскага насельніцтва ў Віцебскай губерні [2, с. 105], што не адпавядае рэчаіснасці. Улічваючы той факт, што Рэжыцкі павет на працягу ўсяго перыяду з’яўляўся лідарам па колькасці старавераў у Віцебскай губерні, можна сувярджаць, што іх колькасць была значна большай за прыведзеную. Так, у 1838 г. у Рэжыцкім павеце налічвалася 15 742 стараверы. У той жа час у Веліжскім павеце старавераў, як сведчаць крыніцы, у гэты перыяд пражывала мала. Такім чынам, ужо ў 1837 г. у Віцебскай губерні пражывала каля

38 тысяч стараверaў. Даныя на наступны, 1838 г. таксама сведчаць аб такой жа лічбе стараверaў у Віцебскай губерні [3, арк. 59 – 71 адв.]. Гэтая колькасць заставалася даволі стабільнай на працягу сярэдзіны XIX ст. (з невялікім ростам у 1-й палове 1860-х гг.). Дынаміка колькасці стараверскага насельніцтва ў Віцебскай губерні прадстаўлена ў табліцы 1. Пры гэтым адзначалася наяўнасць у губерні значнай колькасці аднаверцаў. У 1-й палове 1860-х гадоў іх тут налічвалася каля 3 тысяч чалавек(у 1861 г. – 3 615, у 1865 г. – 3 117) [8, с. 613; 9, с. 293].

Табліца 1.

| Год | 1840 | 1843 | 1859 | 1861 | 1865 |
|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць стараверaў (чал.) | 38 425 | 39 036 | 37 873 | 37 027 | 45 830 |

Складзена аўтарам на аснове: [4, арк.164 адв. – 165; 5, арк. 96 адв. – 97; 6, арк. 96; 8, с. 613; 9, с. 293].

Тэрыторыя Віцебскай губерні ахоплівала ўсходнія землі сучаснай Віцебскай вобласці, а таксама паўднёва-ўсходнія раёны Латвіі, раёны Пскоўскай і Смаленскай абласцей Расіі. Уадпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам таго часу беларускія землі знаходзіліся ў складзе Віцебскага, Гарадоцкага, Дрысенскага, Лепельскага і Полацкага паветаў. Як вынікае з аналізу статыстычных даных, асноўная колькасць стараверaў Віцебскай губерні пражывала якраз не на беларускіх землях. У сярэдзіне XIX ст. большая частка стараверaў (70%) Віцебскай губерні знаходзілася ў так званых латгальскіх паветах – Рэжыцкім, Дзвінскім і Люцынскім (сучасная тэрыторыя Латвіі). Акрамя таго, істотная колькасць стараверaў (10- 12%) налічвалася ў Веліжскім, Невельскім і Себежскім паветах, тэрыторыя якіх у сучасны перыяд адносіцца да Расійскай Федэрацыі. У той жа час, як сведчаць статыстычныя даныя, на беларускія землі прыпадала толькі каля 15% ад агульнай колькасці стараверaў Віцебскай губерні. У табліцы 2 прадстаўлены звесткі аб колькасці стараверaў у беларускіх паветах Віцебскай губерні ў 1837 – 1865 гг.

Табліца 2.

| Год | Колькасць стараверaў у паветах Віцебскай губерні (чал.) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віцебскі | Гарадоцкі | Дрысенскі | Лепельскі | Полацкі | Усяго |
| 1837 | 1 747 | 406 | 49 | 615 | 3 281 | 6 098 |
| 1838 | 1 792* | 262 | 163 | 498 | 3 321 | 6036 |
| 1843 | 1852 | 254 | 238 | 593 | 3934 | 6871 |
| 1861 | 1 412 | 225 | 268 | 367 | 2 141 | 4 413 |
| 1865 | 2 167 | 427 | 256 | 812 | 3 626 | 7 288 |

Складзена аўтарам на аснове: [3, арк. 24 – 91а; 5, арк. 96 адв. – 97, 8, с. 613; 9, с. 292 – 293].

*Згодна з рапартам ад 24 снежня 1838 г., па Віцебскім павеце (без горада) мясцовымі ўладамі былі пададзены звесткі за мінулы, 1837 г., паколькі не паспелі да справаздачнага тэрміна зрабіць падлікі. Але даныя па горадзе Віцебску былі пададзены ўжо за 1838 г. [3, арк. 77 – 78].

Звяртае на сябе ўвагу некаторае памяншэнне колькасці старавераў у беларускіх паветдадзеных рэгіёнах у пачатку 1860-х гадоў. Аднак калі прыняць да ўвагі, што ў дадзеных рэгіёнах у гэты час налічвалася значная колькасць аднаверцаў, то гэтае «памяншэнне» будзе зразумелым. Так, у 1861 г. у Віцебскай губерні (асноўная маса прыпадала на Полацкі і Віцебскі паветы) іх было 1 594 чалавекі, у 1865 г. – 1 431 [8, с. 613; 9, с. 292 – 293].

На аснове статыстычных даных канца 1830-х – 1-й паловы 1860-х гадоў складзена карта-схема рассялення старавераў на беларускіх землях Віцебскай губерні (малюнак 1).




Малюнак 1. Арэалы рассялення старавераў у межах беларускіх паветаў Віцебскай губерні ў сярэдзіне XIX ст.

Як вынікае з архіўных матэрыялаў і статыстычных даных, асноўная колькасць стараверскага насельніцтва беларускіх зямель Віцебскай губерні пражывала ў Полацкімі Віцебскім паветах (каля 80% ад усёй колькасці).З канца 1830-х да сярэдзіны 1860-х гадоў лідарам па колькасці старавераў быў Полацкі павет (такая сітуацыя захоўвалася да 1880-х гг.). У сярэдзіне XIX ст.

у павеце пражывалакаля паловы ўсіх прыхільнікаў «старой веры», што фіксаваліся ў беларускай частцы Віцебскай губерні. Большасць стараверaў Полацкага павета ў гэты перыяд пражывала ва ўсходняй яго частцы (у сучасны перыяд памежжа Полацкага і Шумілінскага раёнаў). Некаторая колькасць (267 чалавек у 1843 г.) была сканцэнтравана ў арэале на поўначы ад Полацка, цэнтрам якога была вёска Жарцы [5, арк. 13]. Невялікі куст стараверскіх вёсак размяшчаўся на поўдні ад Полацка, у ваколіцах возера Гомля. На 1843 г. у Полацкім павеце стараверы пражывалі ў больш чым ста населеных пунктах. Да сярэдзіны 1860-х гадоў колькасць вёсак у павеце, дзе фіксаваліся стараверы, некалькі вырасла, але неістотна [10, арк. 363 – 450; 5, арк. 17].

У сярэдзіне XIX ст. на тэрыторыі Віцебскага павета стараверы пражывалі дастаткова раўнамерна. На 1837 г. у павеце зафіксавана 47 населеных пунктаў (без уліку губернскага цэнтра), дзе было стараверскае насельніцтва [5, арк. 71]. А згодна з данымі на 1866 г., у павеце налічвалася ўжо звыш 70 населеных пунктаў, у якіхфіксаваліся стараверы [12, арк. 188 – 290]. Значная іх колькасць была сканцэнтравана ў ваколіцах самога Віцебска. Але найбольш істотная колькасць пасяленняў, дзе пражывалі стараверы, размяшчалася ў заходняй частцы павета.

У Гарадоцкім і Лепельскім паветах стараверaў налічвалася значна менш, чым у Віцебскім і Полацкім. Стараверы Гарадоцкага павета ў сярэдзіне XIX ст. амаль выключна пражывалі ў 1-м яго стане. На тэрыторыі павета яны сфарміравалі два невялікія арэалы: адзін – на поўначы (у Обальскай воласці), другі – на захадзе (у Мішневіцкай і Казьянскай валасцях; у сучасны перыяд – тэрыторыя Шумілінскага раёна) [3, арк. 67 адв. – 68; 12, арк. 366 – 396]. Асноўная маса стараверaў Лепельскага павета пражывала ў паўднёва-ўсходняй яго частцы (Гарадчэвіцкая, Цяпінская, Бешанковіцкая і Бачэйкаўская воласці). У сучасны перыяд гэта тэрыторыя памежжа Лепельскага, Чашніцкага і Бешанковіцкага раёнаў. На 1838 г. стараверы фіксаваліся ў 21 населеным пункце павета, а ў 1866 г. пасяленняў, дзе пражывалі стараверы, было ўжо больш за 30 [3, арк. 80 – 89; 10, арк. 8 – 90].

Даследчык звяртаў увагу на недахопы конегадоўлі ў памешчыцкіх гаспадарках графства. Так, памешчыкі з наваколля Крычава мелі заводы коней добрых парод (англійскіх, турэцкіх, татарскіх і ўкраінскіх). Лепшы конны завод знаходзіўся ў падкаморнага Сухадольскага. Тым не менш, нават такія коні выглядалі недагледжанымі, з быццам разбітымі нагамі і з упалымі грудзямі [2, с. 97]. Адсутнасць добрай мясцовай пароды А. К. Меер бачыў у неналежным доглядзе, недастатковасці і няякаснасці кармоў.

Сяляне трымалі не больш за тры-чатыры кані. Сярод забудовы сялянскага двара аўтар узгадваў «хлеўчыкі і паветкі або шатры з плоскім дахам на слупах». Нетрываласць такіх пабудоў была прычынай таго, што ўзімку ваўкі і лісы нападалі на жывёлу.

У лячэнні коней сяляне прытрымліваліся народных ведаў. Калі ў дажджлівыя сезоны на жывёлу нападаў падзеж, то сяляне ў адзін і той жа час па два разы ў дзень паілі хворых коней настоеным з воцатам простым віном з патоўчанымі ягадамі ядлоўцу. Калі здароўе коней псавалася з-за ўкусаў шэршняў і «серабрыстых» вос, тады «зробленыя імі болькі вымазваннем апошніх мёдам, вылечваюцца, роўна як і ад серабрыстых вос» [2, с. 96].

Краязнавец, гісторык літаратуры, этнограф Уладзіслаў Сыракомля ў гісторыка-краязнаўчым нарысе «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» (1853 г., мястэчкі Свержань, Мір, Нясвіж, Гарадзея, Стоўбцы, Койданава, вёскі Жукаў Барок, Семакова, УтанкаМінскага, Навагрудскага і Слуцкага паветаў) узгадваў асобныя гужавыя транспартныя сродкі. Сярод іх «больш-менш прыстойныя павозкі» – так называлі мясцовыя яўрэі-гандляры гужавы транспарт людзей, што прыязджалі у мястэчка Мір. «Вазы са скуранымі

будамі» – транспарт жыхароў Палесся, на якіх яны прывозілі на продаж рыбу на нясвіжскі рынак. Вазы ставіліся ў два шэрагі, такім чынам, павозкі нагадвалі шалашы [4, с. 22 – 25, 53 – 116].

Гужавы транспарт быў неад'емнай часткай побыту тагачасных жыхароў, таму нават вёску Семакова аўтар мімаволі параўнаў з возам: «…вёска Семакова, што, нібы вялікі воз, ад'ехала ад гасцінца ў поле» [4, с. 48].

Аўтар закрануў пытанні карыстання і захоўвання гужавога транспарту прадстаўнікамі розных саслоўяў: сялян, мяшчан, шляхты, манахаў бернардзінскага і былога езуіцкага ордэнаў. Асобна апісваў традыцыі мясцовых татар і цыган, звязаныя з выкарыстаннем транспартных сродкаў.

На думку У. Сыракомлі, адным з галоўных больш-менш прыбытковых промыслаў сялян нёманскага наваколля быў сплаў лесу. Сяляне па найме на сваім гужавым транспарце дастаўлялі лес да прыстаней, а таксама прывозілі тавары на купецкія склады. Так, жыхары з ваколіц мястэчка Мір па панядзелках вазілі туды на продаж дрэва з бліжэйшых лясоў для далейшага яго сплаву. Сяляне з наваколля мястэчка Стоўбцы зімой і ранняй вясной, пакуль была санная дарога, прывозілі тавары на мясцовыя склады для адпраўкі ў Крулявец. Такім чынам, зараблялі грошы для аплаты падаткаў і чыншу.

Разважаючы пра сярэднешляхецкае саслоўе, аўтар адзначыў, што ў іх «не відаць шыкоўных экіпажаў», і растлумачыў гэтую з'яву адсутнасцю «духу прадпрымальніцтва, схільнасці да прамысловасці» [4, с. 141].

Адным з захаваных напрамкаў гаспадаркі засцянковых шляхціцаў было гадаванне коней для продажу на мясцовых кірмашах. У. Сыракомлю ўразілі палі канюшыны каля Гарадзеі, якая належала палкоўніку Брахоцкаму. Традыцыю шляхты гадаваць коней аўтар бачыў у рыцарскіх звычаях продкаў.

Па прыведзеных У. Сыракомлем звестках можна меркаваць пра багатыя традыцыі выкарыстання гужавога транспарту манахамі розных ордэнаў. Знаходячыся ў Міры, аўтар узгадаў пра фурмана Марціна з мясцовага кляштара бернардзінцаў. Пры пераездзе ў мястэчка Нясвіж праз вёску Утанне (былое ўладанне нясвіжскіх езуітаў) звярнуў увагу на мураваныя пабеленыя стайні каля некаторых маёнткаў. Цікавасць выклікае згадка пра «мураваны вакзал Рудаўка, даўнейшае ўладанне езуітаў» [4, с. 27 – 43].

Звяртаюць на сябе ўвагу традыцыі падарожжа, якіх прытрымліваўся і сам даследчык. Нездавальняючы стан дарог, шляхоў і трактаў істотна ўплываў на камфортную і небяспечную паездку. Падарожжа пачыналася з каманды: «Едзьма, фурман!». Паводле старасвецкага звычаю пасажыр зацягваў звыклы псалом вандроўнікаў «Хто аддасць сябе ў апеку Пану свайму!». Абавязковым было спыніцца ў адной з корчмаў, якія стаялі ўздоўж дарог, і значна адрозніваліся шэрагам паслуг. Напрыклад, у корчмах па дарозе да мястэчка Свержань «авёс і сена для коней адносяцца да прадметаў раскошы, пра ежу для падарожных, пра асобы пакойчык для начлегу і пытацца не трэба» [4, с. 122]. Перад тым, як выправіцца ў далейшую дарогу пасля начлегу, неабходна было даць час напасвіцца коням.

Краязнавец, этнограф П. Шпілеўскі ў творы «Путешествие по Полесью и Белорусскому краю» (1853 – 1855) засяродзіў увагу чытачоў на спосабах вандроўкі гужавым транспартам. Для кожнага з відаў вандроўкі характэрны розныя экіпажы, возчыкі, нават хуткасць руху [6].

«Ехаць на доўгіх» – меўся на ўвазе пераезд на далёкую адлегласць на бяссменных конях і паштовых экіпажах у суправаджэнні кандуктара. П. Шпілеўскі апісваў варшаўскія двухпавярховыя дыліжансы вялікіх памераў каўчэгападобнай формы на 15 пасажыраў [6, с. 13]. Салон карэты быў падзелены на два аддзяленні. Паштовыя карэты адпраўляліся па паштовых трактах па зацверджаным раскладзе. У такі вялікі экіпаж запрагалі чатыры-пяць, часам шэсць коней. Экіпаж карэты складаўся з фурмана, фарэйтара (даглядаў коней і вупраж) і кандуктара. У абавязкі кандуктара ўваходзіла сігналіць аб адпраўленні карэты (тры гудкі), адзначаць пашпарты пасажыраў на заставах, сачыць за сняданкамі, якія ўваходзілі ў кошт праезду. На думку аўтара, перавага такога падарожжа заключалася ў прыпынках на начлег у добрых паштовых гасцініцах.

«Ехаць на перакладных» азначала падарожнічаць на экіпажах і конях, якіх мянялі на паштовых станцыях. Каб скарыстацца такой вандроўкай, трэба было аформіць падарожную ў гараднічага. Вандроўка магла адбывацца на шматмеснай дарожнай карэце, «ліхой тройцы» (паштовай брычцы невялікіх памераў). Такімі экіпажамі кіравалі фурманы.

«Ехаць на абывацельскіх» разумелі як падарожнічаць на наёмных конях. У Кобрыне такую паездку называлі «ехаць на рамізе» – на палескай таратайцы ці звычайных калёсах, запрэжаных худым канём.

Аўтар звярнуў увагу на дарожныя здарэнні падчас падарожжаў. Так, каля станцыі Сяняўка з-за няўважлівасці фурмана коні заблыталіся ў

вупражы і пастрамках, у выніку карэта з пасажырамі перавярнулася, адзін з коней зламаў нагу [6, с. 54].

Даследчык апісаў вобразы і некаторыя традыцыі служачых паштовых станцый і возчыкаў. Калі пасажыр баяўся хвацкай язды, кучар казаў: «Нябося, панок: свезомо не горш піцерскіх». Коней падганялі крыкам: «Ух! З горкі на горку! Дасць барын на водку!».

Краязнавец і этнограф, ваенны тапограф, генерал-маёр Генеральнага штаба Міхаіл Восіпавіч Без-Карніловіч у працы «Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии» (1855), засяроджваў увагу на побыце і конегадоўлі беларускіх дваран і сялян, рамізніцкім промысле стараабрадцаў і яўрэяў Віцебскай і Магілёўскай губерняў [1, с. 185 – 215].

М. В. Без-Карніловіч лічыў, што наступствы вайны 1812 г. не спрыялі развіццю гаспадаркі, у тым ліку і конегадоўлі, абумовілі немагчымасцьпамешчыкаўпадтрымаць сялянскія гаспадаркі. «Асноўныя рухавікі земляробства – хлеб, коні, жывёла» знаходзіліся ў заняпадзе.

Лепшыя пароды коней гадавалі памешчыкі, іх павераныя, аканомы, пісары. Жарабяты пэўнага ўзросту траплялі ў памешчыцкую гаспадарку як вупражныя ці рабочыя коні або шлі на продаж. Сяляне гадавалі каней мясцовай беларускай пароды.

Краязнавец і пісьменнік граф Леан Патоцкі ў творы «Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану» (1859) паведамляў пра традыцыі выкарыстання гужавога транспарту магнатамі прыватных маёнткаў у 1750-я, 1800 – 1820-я гады [3].

Гужавы транспарт – неад’емная частка паўсядзённага жыцця магнатаў, таму пры планіроўцы і забудове сядзіб і рыначных плошчаў мястэчак яны ўлічвалі неабходнасць будаўніцтва стайняў і вазоўняў,дзе можна было б размясціць коней і экіпажы тых, хто прыехаў на кірмаш, або запрошаных у горад гасцей. Апошніх магло быць не менш за 100. Так, у 1806 г. у мястэчку Свіслач падчас штогадовага кірмашу гаспадар граф Вінцэнт Тышкевіч толькі для князя Дамініка Радзівіла на стайні падрыхтаваў 40 запрэжаных коней і 20 верхавых.

Планіроўка двара магнацкай сядзібы абавязкова ўключала раз’язное кальцо. Экіпажы пад’язджалі да ганка сядзібнага дома, пасажыры выходзілі, экіпаж ад’язджаў далей, не перашкаджаючы наступным карэтам.

Абавязковымі ў жыцці магнатаў былі падарожжы на колавым, узімку на палозным транспарцез візітамі да родных і знаёмых, па сваіх уладаннях, паездкі за мяжу.

Так, граф В. Тышкевіч кожны дзень, калі жыў у Свіслачы, у ранішні час рабіў візіты дамам і запрашаў да сябе на званы абед, на якім звычайна прысутнічала каля 100 гасцей. Пасляабедзенная праграма баўлення часу ўключала выезды карэтаміў прысядзібным парку.

Аўтар апісваў паездкі князя Францішка Сапегі (1790-я гг.) і графа В. Тышкевіча (1800-я гг.) у Парыж, дзе яны карысталіся наёмнымі фіякрамі, пераезды па Еўропе адбываліся на дыліжансах.

У магнацкіх стайнях можна было ўбачыць чыстакроўных польскіх коней, жарабцоў з усходу, украінскія табуны. Для абслугоўвання выездаў на гужавым транспарце ў магнатаў працавалі конюхі і фурманы.

У залежнасці ад асабістых магчымасцей і жаданняў у кожнага магната былі свае правілы выезду. Так, князь М. Масальскі з Ляхавічаў выязджаў толькі на чатырохконнай калясцы. На стайні трымаў больш за 12 вупражных коней, верхавых – ніводнага.

Для хуткага руху выкарыстоўваліся двуколкі. На званы абед да графа В. Тышкевіча пані Старэньская і Патоцкая, князь Д. Радзівіл прыехалі на двухколцы, запрэжанай чацвёркай англійскіх коней. Дамы ехалі ў двухколцы, а мужчыны – вярхом на конях з запрэжкі.

У вясельным картэжы кожнаму экіпажу адводзілася сваё месца. Аўтар апісаў вяселле ў Ружане у 1752 г. князя М. Масальскага і дачкі князя Сапегі: «Паперадзе ўсяго картэжу ішла сотня сапежынскіх баснякоў, за якімі рухалася прыдворная капэла, іграючы на духавых інструментах урачысты марш. За імі – конна канюшы з конюхамі <…> За пані імі ваяводзіна навагрудская з пані падчашынаю літоўскаю, сваёю сястрою, у адкрытай карэце, усёй пазалочанай, якую цягнулі шэсць белых, як малако, іспанскіх скакуноў. За павозкаю стаялі два выязныя лакеі і гайдук, а з кожнага боку па адным малалетнім пажы на ступеньках усе ў парадных сапежынскіх касцюмах <…> Другая шарэнга разнастайных павозак цягнулася ззаду, а на самым канцы гэты вясельны поезд замыкаў атрад палка пяхоты імя Сапегі» [3, с. 153 – 155].

Паляванне – адзін са спосабаў баўлення вольнага часу ў магнатаў – не абыходзілася без экіпажаў, брычак і шматмясцовых павозак. Удзельнікі лову ў Слуцкай пушчы суправаджалі князя Караля Радзівіла «Пане Каханку» конна або ў экіпажах і брычках. На паляванні ў мястэчку Свіслач, арганізаваным графам Я. Тышкевічам, ехалі конна, у брычках і ў чатырохконным штульвагене, у якім знаходзілася да дзесяці чалавек.

Этнограф і археолаг Яўстафій Тышкевіч у творы «Описание Борисовского уезда» (1874) у тым ліку ўзняў пытанні аб конегадоўлі ў сялянскай і памешчыцкай гаспадарках, рамізным промысле, гандлі коньмі [5].

У 1-й палове XIX ст. Барысаўскі павет уключаў тэрыторыі Барысаўскай, Бярэзінскай, Лагойскай, Крупскай, Смалявіцкай зямель. Сярод павіннасцей мяшчан аўтар пералічыў аддаванне падвод на ваенныя паходы, перавозку хворых арэстантаў і канвою, харчавання для іх, выдзяленне коней для праезду знакамітых і высокапастаўленых асоб.

У залежнасці ад віду хатняй работы і спосабаў атрымання даходаў даследчык падзяляў сялян павета на лясных і палявых. «Лясныя» сяляне паўднёвых і заходніх тэрыторый павета жылі каля лесу, зараблялі на жыццё паляваннем, збіральніцтвам, лясным пчалаводствам, нарыхтоўкай лесу і яго падвозам да месцаў сплаву. Таму гэтыя сяляне мелі дастаткова коней і гужавога транспарту, неабходнага для выканання названых работ.

«Палявыя» сяляне атрымлівалі даход з зямлі, ад падвозу тавараў і прадуктаў на мясцовыя рынкі,клапаціліся пра захаванне сельскагаспадарчага інвентару і драбін, таму што набыццё драўніны каштавала ім грошай.

Конегадоўля, з пункту гледжання Я. Тышкевіча, залежала ад кліматычных і прыродных умоў. Частыя паводкі прыводзілі да псавання сенажацяў, пакошанага сена і стагоў. Таму былі так званыя «выганы» – сенажаці, прызначаныя выключна для пашы.

У Барысаўскім павеце конныя заводы ў той час не атрымалі шырокага распаўсюджання. Часцей за ўсё сяляне самі гадавалі каня для павозкі і для працы на зямлі. Я. Тышкевіч лічыў, што адрозненні паміж сялянскімі і памешчыцкімі каньмі мясцовай пароды заключаліся ў якасці, колькасці кармоў і ўвогуле доглядзе. Тым не менш аўтар адзначыў, што гадавалася мала коней для гужавога транспарту або коннай язды.

Такім чынам, даследчыкі 1-й паловы XIX ст. прыводзілі цікавыя звесткі пра гужавы транспарт прадстаўнікоў розных саслоўяў. Агляд інфармацыі дазваляе зрабіць наступныя вынікі.

Прадстаўнікі розных саслоўяў выкарыстоўвалі разнастайныя тыпы гужавога транспарту. У сялян былі распаўсюджаны калёсы (вазы) і сані, у мяшчан і шляхціцаў – падводы, брычкі. Вялікі выбар транспартных сродкаў быў характэрны для магнатаў.

Назіраюцца адметнасці ў мэтах выкарыстання гужавога транспарту ў прадстаўнікоў розных саслоўяў. Сяляне і мяшчане ў першую чаргу з

дапамогай транспартных сродкаў зараблялі грошы для выплаты падаткаў, наймаліся ламавікамі, радзей пасажырскімі рамізнікамі. Шляхціцы акрамя гаспадарчага мелі пасажырскі транспарт, прызначаны толькі для выездаў. Магнаты ў большай ступені карысталіся транспартам для баўлення вольнага часу (паляванне, падарожжы).

У 1-й палове XIX ст. з увядзеннем паштовых трактаў з'явіўся гужавы транспарт паштовага ведамства. Для яго абслугоўвання прызначаліся кандуктары, ямшчыкі, фарэйтары.

Этап вывучэння Беларусі ў айчыннай гістарыяграфіі з пазіцый міфалагічнай школы ахоплівае канец XVIII ст. – 1861 г. Даследаванні гэтага часу насілі агульнапазнавальны характар, у большасці прысвечаны асобным прыватным уладанням (Крычаўскае графства, мястэчкі Свіслач, Ружаны, Дзярэчын, Ляхавічы, Нясвіж і інш.) і казённым землям Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Інфармацыя мае разрознены характар, часам даследчыкі ў сваіх высновах абапіраліся на здагадкі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии / М. О. Без-Корнилович. – Минск : Алфавит, 1995. – 358 с.
2. Мейер, А. К. Описание Кричевского графства 1786 года / А. К. Мейер // Могилёвская старина. – 1901. – Вып. II за 1900 и 1901 гг. – С. 86 – 138.
3. Патоцкі, Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі. – Мінск : Полымя, 1997. – 268 с.
4. Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах / У. Сыракомля. – Мінск : Полымя, 1992. – 157 с.
5. Тышкевич, Е. П. Описание Борисовского уезда / Е. П. Тышкевич. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2018. – 418 с.
6. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск : Беларусь, 2004. – 251 с.

РЕЗЮМЕ

В статье на основе литературных источников с позиций мифологической школы автор показывает основные тенденции развития гужевого транспорта Беларуси в 1-й половине XIX в.

SUMMARY

In the article on the literary sources from the standpoint of the mythological school, the author shows the main trends in the development of cattle transport in Belarus in the first half of the XIX century.

***Новак В. С.***

# ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 10.03.2022)*

Прапанаваная тэма даследавання звязана з важнай тэарэтычнай праблемай сучаснай фалькларыстыкі – рэгіянальна-лакальным вывучэннем фальклору. Як слушна адзначыла В.М. Шарая, «у межах рэгіянальнага падыходу да вывучэння фальклору любая мясцовая культура прадстаўляецца як нешта самакаштоўнае, што заслугоўвае спецыяльнага даследавання» [1, с. 470]; «Рэгіянальны фальклор, вусна-паэтычная творчасць пэўнага рэгіёна, якая ў той ці іншай ступені адрозніваецца ад агульнаэтнічнага фальклору і вылучаецца самастойнасцю, аўтаномнасцю, характарызуецца наяўнасцю універсалій, уласцівых для канкрэтнай мясцовасці. Улік сукупнасці ўсіх рэгіянальных фактараў (вытворчага, сацыяльна-гістарычнага, этнічнага, генетычнага, кантактнага і інш.) надзвычай важны для разумення рэгіянальнага фальклору <…> Цэласнае ўяўленне аб развіцці народнай культуры, якая паводле сваёй прыроды паходжання і функцыянавання мае рэгіянальна-лакальны характар, немагчыма без канкрэтных назіранняў за творчым жыццём фальклорных традыцый у межах пэўнай вёскі, раёна, вобласці» [1, с. 470].

Вывучэнне традыцый вясельнай абраднасці беларусаў, у якой знайшлі адлюстраванне такія культы, як прыродна-касмічны, ушанаванне продкаў і працяг роду, надзвычай перспектыўна для разумення менталітэту народа. У якасці аб’екта даследавання абраны экспедыцыйныя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, запісаныя падчас шматлікіх экспедыцый у горадзе Гомелі.

Вясельны абрадавы комплекс беларусаў надзвычай складаны па структуры, кожны з вясельных перыядаў (давясельны, уласна вясельны, паслявясельны) уключае шматлікія абрадавыя этапы, якія вылучаюцца адметнымі рытуаламі і песнямі, прыкметамі і павер’ямі. Вясельная абраднасць горада Гомеля, як сведчаць фактычныя матэрыялы, уяўляе сабой своеасаблівы кангламерат розных мясцовых вясельных традыцый, носьбітамі якіх з’яўляюцца не толькі гамяльчане, але і жыхары з розных вёсак Добрушскага, Гомельскага, Лоеўскага, Веткаўскага, Рагачоўскага, Кармянскага, Хойніцкага і іншых раёнаў Гомельскай вобласці, а таксама прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, найперш рускія і ўкраінцы.

Засяродзім увагу на давясельным перыядзе, які займае важнае месца ў сістэме вясельных абрадаў, звычаяў і песень беларусаў. Зыходзячы з этнаграфічных апісанняў вяселля, у сваты часцей за ўсё прыходзілі сват з бацькам жаніха, мэта прыходу якіх агучвалася ў форме іншасказальнага дыялогу. Як правіла, у ролі свата выступаў мужчына, які карыстаўся павагай: *«Хадзілі ў сваты, калі хлопец з дзеўкай ужо дамовіліся паміж сабой. Сваты прыходзілі з хлебам-соллю, з гарэлкай. Выбіралі ў сваты самых паважаных людзей. Сваты пачыналі здалёк: "У нас ёсць купец-маладзец, у вас на прадажу ёсць цялушка-палушка. Ці не прадасцё нам?"»* (зап. А. Кучаравай у г. Гомелі ад Кацярыны Цімафееўны Рабыкінай, 1942 г. н., пражывала ў п. Васток Веткаўскага р-на)[1]. Вырашэнне пытання аб згодзе або нязгодзе нявесты на шлюб суправаджалася пэўнымі сімвалічнымі дзеяннямі. Напрыклад, калі нявеста пагаджалася выйсці замуж, то *«павязвала сватам ручнікі. І па паводзінах бацькоў бачылі, згодныя яны ці не»* (зап ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі), выносіла сватам падарункі: *«Калі нявеста саглашаецца, яна дорыць падарункі: каму платочак, ручнік. А тыя ў адказ кладуць грошы нібы выкуп»* (зап. ад Уладзіславы Антонаўны Белакаваленка, 1922 г. н., у г. Гомелі). Калі дзяўчына адмаўлялася выходзіць замуж за хлопца, то *«значит она не выносила полотенце сватам. Обычно»* (зап. у г. Гомелі ад Надзеі Дзямідаўны Кальковай, 1940 г. н., пражывала ў в. Уваравічы Буда-Кашалёўскага р-на).

У вясельнай абраднасці беларусаў, як было ўжо адзначана вышэй, важнае значэнне надавалася менавіта адорванню сватоў падарункамі: *«Обычно, если она (невеста) соглашалась, то сватов обвязывали полотенцем, а матери выносили кусок ткани»* (зап. у г. Гомелі ад Антаніны Мікалаеўны Сявуцкай, 1925 г. н., пражывала ў в. Маркавічы Гомельскага р-на). Паводле сведчанняў жыхаркі горада Гомеля Аляксандры Іванаўны Дрончанка, 1922 г. н., перасяленкі з вёскі Чахі Хойніцкага раёна, калі ехалі сватацца да нявесты, якая захавала цнатлівасць, то абавязкова абвязвалі бутэльку з гарэлкай чырвонай ніткай або стужкай, у адваротным выпадку – сіняй: *«Жаніх сабірае сваіх радзіцелей і прыяжджае ка мне ў сваты. Хлеб прывозілі. І бутылачку прывозілі. І красную нітачку завязваюць на бутылку ці лентачку. Гавораць, калі красную завязваюць, калі ідуць да дзевачкі, то гэта дзевачка чэсная. А калі не красная лентачка, то гэта пазор на ўсю*

[1] У артыкуле выкарыстаны матэрыялы архіва навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

*дзярэўню. Так паложена. А калі на бутылку завяжуць сінюю лентачку, то гэта дзеўка ўжэ не чэсная была»*.

Важнае значэнне ў беларускай вясельнай традыцыі надавалася пасагу нявесты. Напрыклад, паводле сведчанняў інфармантаў, *«у дзень вяселля дружкі нараджалі нявесту, гатовілі прыданае. Прыданае – вялікі сундук, гэта было вельмі важна. Калі была сваха, то аглядала прыданае – колькі ручнікоў наткана, пярыну, пасцелю»* (зап. ад Кацярыны Цімафееўны Рабыкінай у г. Гомелі).

У сістэме вясельнай абраднасці беларусаў, у прыватнасці жыхароў горада Гомеля, абрадавы этап развітання маладой з сяброўкамі вядомы пад назвамі «зборная субота» («суборная субота»), «дзявошнік», «дзявочнік» і іншымі: *«За дзень перад вяселлем дзяўчына гатуе вячэру ў сябе дома і збірае ўсіх сваіх сябровак <…> На працягу ўсёй вячэры дзяўчыны ўспамінаюць усе лепшыя і цікавыя моманты іх жыцця, якія яны праводзілі разам, п'юць за салодкае жыццё будучай нявесты, даюць ёй розныя парады. Дзявочнік сімвалізуе развітанне са свабодным жыццём і ўступ у новае – сямейнае»* (зап. ад Алены Мікалаеўны Шуманавай, 1980 г. н., у г. Гомелі). Менавіта «вясельны вянок рыхтавалі ў Суборную суботу. Гэты абрад быў своеасаблівай мяжой, якая аддзяляла дашлюбнае жыццё дзяўчыны ад яе будучага сямейнага жыцця. У гэты вечар маладая развітвалася з сяброўкамі, прасіла ў іх прабачэння, апошні раз заплятала касу – сімвал дзявоцтва» [2, с. 298]. Сярод абрадавых дзеянняў зборнай суботы, паводле ўспамінаў жыхаркі горада Гомеля, якая пражывала раней ў вёсцы Свяцілавічы Веткаўскага раёна, вылучаўся рытуал «завівання ёлачкі»: *«У суботу перад свадзьбай нявеста звала сваіх падружак "віць ёлку". Украшалі эту ёлку цвяточкамі і ставілі ў места, штоб ніхто не відзеў»* (зап. ад Тамары Фёдараўны Ермаковай, 1937 г. н.). Пра звычай «ёлку везці» і міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з імкненнем сарваць кветку з ёлкі, каб забяспечыць сабе ў будучым шчаслівы лёс, паведаміла жыхарка горада Гомеля Кацярына Цімафееўна Рабыкіна, ранейшым месцам жыхарства якой быў пасёлак Васток Веткаўскага раёна: *«Дружкі вечарам перад вяселлем нараджалі "ёлку", яе праталі, "ёлку" ніхто не должэн быў бачіць. Украшалі цвятамі бумажнымі каляровымі. Пасля моладзь старалася, калі "ёлку" вязлі, цвяток сарваць: хто сарве, той будзе шчаслівы. Таму яе дружкі трымалі высока-высока, крэпка. Гэта называлася "ёлку везці". "Ёлку" трэба было давезці цэлую. Патом гэтую "ёлку" станавілі перад маладымі на кут, утыкалі яе ў булку хлеба з пшанічнай мукі, хлеб перавязвалі краснай лентай. Спявалі:*

*Ой, ты, ёлачка барава, барава,*
*У бару стаяла, шумела,*
*Дарогаю ішла – звінела, звінела.*
*На стале стаяла – засіяла, засіяла,*
*Ой, ты, ёлачка кучаравая».*

Іншы раз, калі дружкі маладой упрыгожвалі «ёлку», то спецыяльна на яе верхавіну таксама вешалі кветкі, здыманне якіх абазначала, што маладая павінна ўжо была пакінуць родны дом, развітацца з бацькамі: *«А яшчэ так рабілі: калі прыязджаў малады, нараджаюць елку. На самую макаўку вешаюць кветак букет. І калі яго не знімаюць, маладую не аддаюць»* (зап. ад У. А. Белакаваленка ў г. Гомелі).

Заслугоўваюць увагі ўспаміны жыхаркі горада Гомеля Алены Кузьмінічны Карпінскай, 1917 г. н. (нарадзілася ў в. Перапісь Гараднянскага р-на Чарнігаўскай вобл.), звязаныя з момантам, калі ў хаце маладой ішла падрыхтоўка да вяселля: *«Вось часа ў чатыры-пяць вечара прыходзілі "віць ельца". Срубывалі невялікую вішню, потым з цвятной бумагі рабілі кветкі, украшалі ім, і гэтае "ельца" потым ставілі на стол маладых»*.

Паводле ўспамінаў інфармантаў, абрад вянчання на тэрыторыі Гомельшчыны не меў шырокага распаўсюджання. Сустракаюцца рэдкія сведчанні адносна яго правядзення, калі надзвычай важнымі былі такія моманты, як звязванне рук маладых і падкладванне ручніка пад іх ногі: *«Батюшка платком связывал руки молодым, а потом покрывал их руки своим передником, брал за руки молодых и шёл впереди. Над ними несли венец первые друзья, а батюшка молился, потом венцы брали другие друзья, а в конце брала опять первая пара. Под венец молодые стали на полотенце, так что могли стать только они, потом ехали на конях с колокольчиками врозь, это когда в церковь, а домой – вместе»* (зап. ад Ніны Пятроўны Конухавай, 1942 г. н., у г. Гомелі).

Падрыхтоўка абрадавага печыва – важны структурны кампанент вясельнага абрадавага комплексу беларусаў. Пачатак уласна вясельнай часткі быў звязаны менавіта з рытуаламі выпечкі гэтага галоўнага абрадавага хлеба – каравая, які сімвалізаваў багацце і дастатак маладых у шлюбе, што знайшло надзвычай паэтычнае адлюстраванне ў сведчаннях Таццяны Рыгораўны Гаўрылавец, 1933 г. н. (пражывала ў в. Лужок Кармянскага р-на): *«Каравай – шлях у рай»* (зап. у г. Гомелі). «Міфалагічная сімволіка каравая надзвычай багатая: ён сімвал маладых, сонечнага бажаства, нябеснага сямейства, дабрабыту і ўрадлівасці, багацця, шлюбнага саюзу, даўгалецця, добрай долі,

дзетнасці» [2, с. 648]. Невыпадкова для выканання пачэснай місіі, звязанай з падрыхтоўкай каравая, запрашалі жанчын, якія былі паважанымі і шчаслівымі ў сямейным жыцці: *«Каравай, канешні, пяклі, якая-небудзь жэншчына, каторая шчастліва была»* (зап. ад А. М. Сявуцкай у г. Гомелі); *«Но абязацельна жэншчына, каторая лепіць каравай, павінна быць замужам, не ўдавой»* (зап. ад А. К. Карпінскай у г. Гомелі); *«Каравай далжны былі пячы дзве-тры жанчыны, у якіх у сям'і згода, адзяваліся ва ўсё чыстае, пяклі, спявалі, прыгаворвалі: "Расці, расці, каравай, / Маладым шчасце-долю давай"»* (зап. ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі). На пытанне, чаму нельга было бацькам рыхтаваць каравай, атрыманы наступны адказ: *«Каравай пекли не родители, говорили, что будет печаль»* (зап. у г. Гомелі ад Галіны Паўлаўны Ганчаровай, 1929 г. н., пражывала ў в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага р-на).

Паводле ўспамінаў Ніны Пятроўны Конухавай, перад тым як вынесці каравай, пыталі дазволу ў бацькоў: *«Ти есть отец и мать, разрешите каравай вносить. Ставили возле молодых, резали на дольки, звали родителей»* (зап. у г. Гомелі). Кожная з дзяўчат-дружак імкнулася схапіць кавалак каравая, што сімвалізавала замужжа ў будучым: *«Каравай вносили на голове, каждая девка старалась ухватить кусок, чтоб выйти замуж»* (зап. ад Н. П. Конухавай у г. Гомелі).

Дзяльба каравая як важны кульмінацыйны момант у беларускім вяселлі суправаджалася шматлікімі пажаданнямі, у якіх знайшлі адлюстраванне народная мудрасць, маральна-этычныя нормы: *«Дарую сруб, каб нарадзіўся лесаруб», «Дарым мёда бочку, каб нарадзілі сына й дочку»*; *«Дарую пару галубоў, каб была верная любоў»*; *«Дарую пару парасят, каб нарадзілі блізнят»* (зап. ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі); *«Сколько в лесу пеньков, чтоб столько было сынков. Сколько в лесу почек, чтоб столько было дочек. Бульбы подполье и детей застолье»* (зап. ад Н. П. Конухавай у г. Гомелі).

Устойліва захоўваюцца ў памяці жыхароў горада Гомеля звесткі пра такі старадаўні абрадавы этап вяселля беларусаў, як пасад, з якім таксама былі звязаны шчасце і дабрабыт маладых, змена іх статусу, напрыклад, сімвалічны перавод дзяўчыны ў жаноцкі стан. З гэтай мэтай адбываліся пэўныя маніпуляцыі з валасамі («падстрыганне і падпальванне»), пакрыванне кавалкам палатна або хусткай галавы маладой: *«Две подружки молодой расчёсывают её, заплетают волосы и одевают на голову платок, завязывают его под бороду обязательно. Так как она уже будет бабой и, конечно, поют жалосные песни, а молодая плачет. Да ещё молодую садят на*

*кут стола на кожух, это значит, чтобы она была богата и жила в достатке, и она сидит всё время за столом на кожуху»* (зап. ад Варвары Пятроўны Коваль, 1924 г. н., у г. Гомелі).

Устойлівасцю бытавання адрозніваюцца вясельныя прыкметы і павер'і, семантыка якіх звязана найперш з «магіяй першага дня» (У. А. Васілевіч). У сувязі з гэтым заслугоўвае ўвагі выказванне беларускага фалькларыста У. А. Васілевіча: «Пачатак стварэння новае сям'і ўяўлялі тым самым магічным вытокам, які трэба аберагаць паводле ўсіх правілаў народнае этыкі і светаўспрымання. Падобна на тое, як у народзе шануецца, ахоўваецца кожная крыніца, якая, прайшоўшы праз зямныя пласты, выходзіць на паверхню ў крыштальнай чысціні і набывае, як верылі, магічную, гаючую сілу, так і павер'е, атрыманае ў спадчыну ад папярэдніх пакаленняў, калі прыпадае на пачатак адмысловай падзеі, таксама аберагаецца і абавязкова выконваецца, каб не сапсавалася наступнае развіццё справы» [3, с. 9].

Што да народных вераванняў жыхароў горада Гомеля, то варта прывесці наступныя ўзоры прыкмет і павер'яў, якіх прытрымліваліся ў народзе не толькі ў найбольш адказных жыццёвых момантах, але і ў звычайных сітуацыях, бо надзвычай важнай была ідэя працягу роду. Гэтым і абумоўлена семантыка розных сімвалічных дзеянняў, скіраваных на забеспячэнне трывалай сям'і маладых, дзетанараджэння, дабрабыту, на захаванне гармоніі ў жыцці і прыродзе: *«Кавалачак караваю бралі чыстай хустачкай, каб маладыя былі багатыя, голай рукой нельга было браць»* (зап. ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі); *«Когда жених забирает невесту из дома, она, уходя, должна зацепить ногой все половики и тащить их до самого порога, чтобы младшие сёстры или подружки скорее вышли замуж»*; *«На скамью, где сидят молодые, кладут шубу, чтоб жизнь была богатая»* (зап. у г. Гомелі ад Любові Аляксандраўны Жалабковай, 1949 г. н., пражывала ў в. Вайцін Гомельскага р-на); *«Пасля караваю вынасілі "ельца", збіралася многа маладых дзяўчат, і кожная хацела ўхапіць самы прыгожы цвяток, асобенна вярхушку. Лічылі, хто сарве вярхушку, тая раней пойдзе замуж»* (зап. ад А. К. Карпінскай у г. Гомелі).

Калі адбывалася вяселле ў хаце маладога, то, зыходзячы з народных вераванняў, пасля таго, як ужо прайшло вясельнае застолле, *«потом веником выгоняли всех, чтоб невеста не вернулась домой и жила с мужем»* (зап. ад Н. Д. Кальковай у г. Гомелі).

У апісаннях вясельнай абраднасці горада Гомеля даволі маляўніча прадстаўлена паслявясельная частка. Праведзены аналіз фактычных

матэрыялаў дазволіў выявіць цікавыя факты мясцовага вар'іравання яе назваў, а таксама сімвалічных абрадавых дзеянняў, якімі суправаджалася цырымонія наведвання гасцямі хаты бацькоў маладой, маладога, іншых удзельнікаў вяселля. Сярод назваў паслявясельнага перыяду вылучаюцца наступныя: «драць курэй» (*«На трэці дзень дралі курэй, пераапраналіся ў цыганак, бабы ў мужыкоў пераапраналіся»* – зап. ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі; *«На трэці дзень было жартоўнае вяселле. Гэта хадзілі па вёсцы, бралі або кралі петухоў у тых, хто гуляў на вяселлі. Называлася гэта "драць курэй"»* – зап. у г. Гомелі ад Праскоўі Емяльянаўны Кошчанка, 1937 г. н., пражывала ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на Гомельскай вобл.); «гнаць курэй» (*«Гуляли три дня, а на третий курей гнали. Обычай такой был, что каждый приходил на свадьбу и обязательно приносил курицу»* – зап. ад Клаўдзіі Мікалаеўны Любінай, 1937 г. н., у г. Гомелі); «перегулы» (*«Невестина родня гуляет у жениха первый день, а на второй день у невесты вся родня жениха-ва. Проходят эти два дня, опять собираются у жениха с обоих сторон родня. Гулянье продолжается целую неделю, а то и больше. Это называется "перегулы"»* – зап. у г. Гомелі ад Аляксандра Канстанцінавіча Каляпіна, 1935 г. н., пражываў у в. Міхайлаўка Шаткаўскага р-на Ніжагародскай вобл.); «вадзіць бяседы», «пярэзвы» (*«На другі дзень свадзьбы вадзілі бяседы. Збіраліся ў нявесты маладыя, некалькі часоў былі ў нявесты, а пасля ішлі да кожнага з дружак і баяраў. І там ужо хадзілі на галавах. Вадзілі бяседы дня тры-чатыры. Пасля свадзьбы таксама былі пярэзвы ў наступную нядзелю. Родныя жаніха звалі да сябе родных нявесты»* – зап. ад А. К. Карпінскай у г. Гомелі).

Прыведзеныя матэрыялы сведчаць аб тым, што метадалогія і методыка цэласнага фальклорна-этнаграфічнага абследавання з'яўляецца важнай асновай рэгіянальна-лакальнага кірунку даследаванняў. Вясельная абраднасць – унікальны від мастацтва, які мае выразную агульнаэтнічную аснову і ўяўляе сабой пэўную сістэму рэгіянальна-лакальных традыцый. У гарадскім вясельным абрадавым комплексе арганічна паяднаны лакальныя традыцыі Гомельшчыны, а таксама іншых усходнеславянскіх народаў, што і дае падставы сцвярджаць факт выяўлення спецыфічна адметных асаблівасцей, характэрных для асобных абрадавых этапаў вяселля і звязаных з імі рытуалаў, прыкмет і павер'яў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – Т. 2. Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – «Яшчур». – 832 с.

2. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1. Акапэла – Куцця. – 768 с.

3. Жыцця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2 / уклад., прадм. і перакл. У. Васілевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. – 607 с.

РЕЗЮМЕ

В статье охарактеризованы отдельные обрядовые этапы досвадебного и собственно свадебного периодов, а также выявлены отличительные местные особенности послесвадебной части, что нашло подтверждение в этнографических описаниях информантов.

Внимание сосредоточено также на народных верованиях, характерных для разных обрядовых этапов. Приведены интересные примеры примет и поверий, содержание которых позволяет осмыслить глубину и поэтичность восприятия предками окружающей среды. Научную ценность представляют фольклорно-этнографические материалы, которые впервые вводятся в научный оборот.

SUMMARY

The article focuses on the ceremonial stages of the pre-wedding and the wedding periodand it shows the local peculiarities of the post-wedding part that has been proved by the vivid ethnographic descriptions provided by the informants.

Attention is focused on folk beliefs connected with different ritual stages and reflected in omens and beliefs, the content of which helps us to understand the depth and poetry of our ancestors' world outlook. Scientific value is connected with the folklore and ethnographic materials, which are introduced in a scientific way for the first time.

***Паборцава К. В.***

# МІФАЛАГІЧНАЯ ПРОЗА ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА: МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА НАРОДНЫХ ВЕРАВАННЯЎ

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 10.03.2022)*

У сістэме сучаснай духоўнай культуры беларусаў, у тым ліку жыхароў Гомельшчыны, важнае месца займаюць народныя вераванні, звязаныя з вобразамі народнай дэманалогіі. Мэта артыкула – выявіць лакальную спецыфіку бытавання міфалагічных апавяданняў пра персанажы ніжэйшай міфалогіі ў народнай памяці жыхароў Веткаўскага раёна. Аб'ектам вывучэння з'яўляюцца тэксты міфалагічнай прозы (апублікаваныя і архіўныя), запісаныя на тэрыторыі Веткаўскага раёна. Прадмет даследавання складаюць семантыка вобразаў ніжэйшага міфалагічнага ўзроўню і звязаныя з імі матывы, мікраматывы, а таксама рэгіянальна-лакальныя асаблівасці праявы народных вераванняў. Методыка даследавання вызначаецца

рэгіянальным падыходам, што дазваляе глыбока вывучыць міфалагічную традыцыю асобнай мясцовасці. Фундаментальнае чатырохтомнае выданне «Народная демонология Полесья», укладальнікамі якога з'яўляюцца Л. М. Вінаградава і А. Я. Леўкіеўская, – адна з асноўных метадалагічных прац, надзвычай карысных для даследавання міфалагічнай прозы беларусаў. Паводле слушнай заўвагі акадэміка Расійскай акадэміі навук С. М. Талстой, публікацыя поўнага корпусу матэрыялаў па народнай дэманалогіі Палесся не толькі дае даследчыкам у распараджэнне вялікі новы палявы матэрыял аднаго з найбольш архаічных рэгіёнаў славянскага свету і дазваляе ацаніць палескую традыцыю ў агульнаславянскай перспектыве, але і дае магчымасць працягнуць яе вывучэнне [1, с. 60]. У гэтых адносінах прапанаванае даследаванне набывае актуальнасць у сувязі з праблемай рэгіянальна-лакальнай характарыстыкі персанажа ўніжэйшай міфалогіі, кожны з якіх «мае свой устойлівы набор рэлевантных матываў, замацаваных у традыцыі. Гэты набор матываў з'яўляецца алгарытмам апісання персанажа» [2, с. 7 – 8].

Сярод духаў хатняй прасторы ўстойлівасцю бытавання вылучаюцца міфалагічныя тэксты пра дамавіка, зафіксаваныя ў вёсках Старое Сяло, Куты, Неглюбка, Новы Мір, Прысно, Старыя Грамыкі, Хальч, Чамярня, Шэйка і іншых, а таксама ў горадзе Ветка. Аналітычную характарыстыку дадзенага персанажа варта пачаць з апісання яго знешняга выгляду ў розных лакальных традыцыях. Абапіраючыся на вылучаную А. Я. Леўкіеўскай групу матываў, звязаных з дамавіком, у прыватнасці з апісаннем яго знешняга выгляду, выкажам меркаванне, што найбольш папулярнымі з'яўляюцца наступныя: «Дамавік нябачны»; «Дамавік мае выгляд чалавека (мужчыны, старога»); «Дамавік мае выгляд жывёлы (сабакі, ката)» [2, с. 32]. Як вынікае з папярэдне праведзенай сістэматызацыі фактычных матэрыялаў, дамавік можа з'яўляцца ў дзвюх іпастасях: антрапаморфнай і зааморфнай. Што да чалавечага аблічча гэтай істоты, то ў мясцовых запісах сустракаюцца варыянты, калі дамавік мог з'явіцца ў выглядзе дзеда (*«Быў тут дзед, малы, барадаты, смешны і забаўляў мяне, шчыкаціў»* – зап. у г. Ветка)[1], высокага мужчыны (*«Маці мне казала, што дамавік высокі такі дзядзька»* – зап. ад Н. В. Валісавай, 1969 г. н., у в. Прысно), казачнага персанажа гнома (*«Ета такі маленькі чалавек, як гном, у яго дужа вялікая сівая барада і такія ж валасы»* – зап. у в. Чамярня ад Марыі Піліпаўны Грамыка, 1933 г. н., пражывала ў в. Новыя Грамыкі). У другой групе міфалагічных апавяданняў перавага аддаецца

[1] У артыкуле выкарыстаны матэрыялы архіва навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

зааморфнаму вобразу дамавіка (з'яўляецца ў абліччы ката): *«Во, у вёсцы казалі, што раз да адной нашай жэншчыны кот шэры прыбег ды давай каля яе лашчыцца. Гаспадыня яго пашкадавала, добра накарміла, думала, што ён яшчэ прыбяжыць, але ён з таго часу больш не паказваўся. Казалі, што сам хатнік прыходзіў, хацеў сваіх гаспадароў праверыць»* (зап. ад Івана Дзмітрыевіча Рослікава, 1930 г. н., у в. Шэйка,); *«Шчэ старыя ў нас казалі, што калі бачыш часта на панадворку ката ці сабаку незвычайных, галоўнае нічыйных, то, значыць, сам дамавік паказаўся»* (зап. ад Ганны Іванаўны Казіміравай, 1937 г. н., у в. Старыя Грамыкі).

У пераважнай большасці мясцовых міфалагічных тэкстаў гаворыцца аб тым, што дамавік – нябачная істота. Як слушна сцвярджае А. Я. Леўкіеўская, «для палескіх уяўленняў, як і ўвогуле для ўяўленняў пра любы міфалагічны персанаж, характэрна ўніверсальная дыхатамія бачнасці/нябачнасці дамавіка: прынцыпова ён нябачны, але пры гэтым мае пэўнае аблічча» [2, с. 27]. Фактычны матэрыял з'яўляецца пацвярджэннем меркавання даследчыцы, штоз аднаго боку, дамавік – *«ета нявідзімае сушчаство, якое находзіцца ў кожным доме»* (зап. ад Ганны Іванаўны Герасіменка, 1934 г. н., у в. Неглюбка), а з другога – *«быў ён малады, прыгожы, светлавалосы і апрануты быў у светлую кофту і цёмныя штаны»* (зап. ад Людмілы Міхайлаўны Котавай, 1963 г. н., у в. Хальч).

З матывам «Месца жыхарства дамавіка і час яго праявы» звязана найбольшая колькасць варыянтаў міфалагічных тэкстаў. У гэтай групе вылучаецца актыўнасцю бытавання мікраматыў «Дамавік жыве ў доме», пры гэтым удакладняецца і ў многіх тэкстах пацвярджаецца, што гэтая істота знаходзіцца ў кожным доме: *«Дамавік доўжан быць у кожнай хаце, кварціры, калі толькі заселіліся»* (зап. у г. Гомель ад Леаніда Іванавіча Гусакова, 1967 г. н., пражываў у в. Акшынка Веткаўскага р-на); *«Дамавікі бываюць у кожным доме, а калі чым не ўгаварыў, то не спрыяе, а сердзіцца і неспакойна сябе вядзе, як пастаронні»* (зап. ад Н. В. Валісавай у в. Прысно). Вышэйназваны матыў, звязаны з пражываннем дамавіка ў хаце, зыходзячы з веткаўскай калекцыі запісаў, канкрэтызуецца ў мікраматывах «Дамавік жыве ў хаце пад печчу» (*«Жыве ён у хаце найчасцей пад печчу, стараецца дапамагаць гаспадарам сваім»* – зап. у в. Чамярня ад М. П. Грамыка) і «Дамавік жыве ў хаце ў куце» (*«Дамавік жыве ў хаце ў тым вуглу, дзе стаіць венік»* – зап. ад Ніны Канстанцінаўны Рослікавай, 1930 г. н., у в. Шэйка). У адным з варыянтаў знайшлі адлюстраванне два вышэйназваныя мікраматывы, праўда, замест месца «пад печчу» прыводзіцца «прыпечак»:

*«Жывуць аны як у сваім домі, дык на прыпечку, а як у кварціры, дык, наверна, ета я так думаю, у куце»* (зап. ад Л. І. Гусакова ў г. Гомель).

Матыў, звязаны з дзеяннямі дамавіка ў адносінах да чалавека і яго гаспадаркі, выяўляецца ў шэрагу мікраматываў, сярод якіх можна вылучыць: «Дамавік дапамагае, калі любіць гаспадароў»; «Дамавік шкодзіць, калі не любіць чалавека»; «Дамавік помсціць чалавеку за крыўду»; «Дамавік прадказвае, што чалавека чакае ў будучым» і іншыя. Паводле сведчанняў жыхароў Веткаўшчыны, з дамавіком трэба жыць у згодзе, тады і ён будзе дапамагаць гаспадарам: *«Дамавік быў харошы чалавек <...> У каго ў доме жыве, яго абярагалі, клалі на шулу есці, гаварылі, што вось у мяне дамавік жыве»* (зап. ад Л. В. Зайцавай, 1938 г. н., у в. Прысно); *«Дамавіка нада паважаць, каб сабе бяды не нарабіць»* (зап. ад Валянціны Іванаўны Кавалёвай, 1946 г. н., у в. Старое Сяло). У народзе асцерагаліся дамавіка: *«Калі яго абідзіш, ён можа разгневацца. Ён можа абідзіцца і прынясці бяду ў дом»* (зап. ад Г. І. Герасіменка ў в. Неглюбка).

Дамавік шкодзіць тады, калі гаспадары не вераць, што ён жыве ў хаце іпра яго прамаўляюць дрэнныя словы (*«Некаторыя людзі не вераць, што дамавік ёсць. А той на іх зліцца і розныя непрыемнасці ім робіць. А шчэ дамавік не любіць, калі яго нядобрым словам памінаюць»* (зап. ад В. І. Кавалёвай у в. Старое Сяло). Іншы раз дамавік шкодзіць, калі раптам неўзлюбіў чалавека: *«Дамавік быў тут, у Надзі. Так вот, увечары яна ўбірае пасуду, прыбярэць, паставіць і лажыцца спаць. І тая пасуда ўся ходарам ходзіць – пабілася тая пасуда. Яна ўжо пайшла бабкам гаварыць, а яны гавораць: "Дамавік цябе не ўлюбіў у доме"»* [3, с. 324].

Сярод фактычных матэрыялаў выяўлены толькі адзін міфалагічны тэкст з мікраматывам пра прадказанне дамавіком будучыні: «*А яшчэ дамавы можа будучае прадказваць. Калі шчэ дзеўкай была, дык варажыла, як мама вучыла. На вялікае свята запаліла свечку прыхаваную і сказала такія словы:*

*Бацька-дамавы, хатнік дарагі,*
*На мяне ты не гнявіся,*
*Судзьбу маю пакажы,*
*Долю прадкажы.*

*Калі свечка затухала, то, значыць, нешчаслівая будзеш, а калі будзе гарэць, то будзе ўсё, як у людзей*» (зап. ад М. П. Грамыка ў в. Чамярня).

На Веткаўшчыне матыў «Абярэгі ад дамавіка» рэалізуецца ў такім мікраматыве, як «Асвячэнне хаты»: *«А ваабшчэ разныя дамавыя бываюць. Ані могут дзелаць зло людзям, падкідвают клубкі валос, а то і іголкі могут.*

*Усё на зло. Дык нада свяціць хату пасвячонай вадой, ані етага баяцца»* (зап. ад Л. І. Гусакова ў г. Гомель).

Сярод духаў прыроднай прасторы вылучаецца міфалагічны персанаж вадзянік. Заслугоўвае ўвагі заўвага, выказаная А. Я. Леўкіеўскай адносна гэтай істоты: «Паколькі персанаж палескай міфалагічнай сістэмы, які жыве ў вадзе і варожы чалавеку, паводле рада прынцыповых характарыстык адрозніваецца ад рускіх уяўленняў пра *вадзяніка*, у дадзенай главе, каб пазбегнуць ілжывых асацыяцый, ён называецца *вадзяным духам*» [3, с. 299]. Зыходзячы з абазначаныхдаследчыцайматываў міфалагічных тэкстаў пра гэты персанаж («Персанаж, які жыве ў вадаёме», «Знешні выгляд вадзянога духа», «Дзеянні вадзянога духа ў адносінах да чалавека», «Дзеянні чалавека ў адносінах да вадзянога духа»» [3, с. 304 – 305]), паспрабуем выявіць на невялікім фактычным матэрыяле, запісаным у Веткаўскім раёне, тыя з іх, якія геаграфічна лакалізаваны менавіта тут. У некалькіх тэкстах адлюстраваны матыў, звязаны з пражываннем вадзянога духа ў вадзе, пры гэтым у адной з прымхліц выразна адлюстраваны мікраматыў, звязаны з чалавекам-тапельнікам: *«Вадзяныя могуць жыць у любой вадзе»* (зап. ад Аляксандры Анатольеўны Азарушкінай, 1934 г. н., у в. Куты); *«Вадзянік жыве ў вадзе. Абычнае яўленне для ўтопленнікаў»* (зап. ад Г. І. Герасіменка ў в. Неглюбка). Што да знешняга выгляду гэтага персанажа, то сярод мікраматываў пераважаюць наступныя, звязаныя з: антрапаморфным выглядам (*«Вадзянік жывець у вадзе. Стары дзед з доўгай барадою»* – зап. ад А. І. Валасянкінай, 1921 г. н., у в. Палянаўка), адлюстраваннем у іпастасі вадзяніка зааморфных і антрапаморфных элементаў адначасова (вадзяныя *«напамінаюць вялікіх рыб з чалавечым ліцом»* – зап. ад А. А. Азарушкінай у в. Куты; *«Вадзяны выглядае як стары дзед, увесь зялёны, у ціне, а замест нагцей і пальцаў кляшні, як у рака»* – зап. ад М. П. Грамыка ў в. Чамярня).

Матыў «Дзеянні вадзянога духа ў адносінах да чалавека» выяўляецца ў найбольш распаўсюджаныммікраматыве пра патапленне чалавека вадзяніком: *«Сядзім мы з сяброўкай на беразе ракі, аж бачым, што ідзе маладая пара. Селі яны ў лодку і паплылі на сярэдзіну ракі. Глядзім, аж закруцілася лодка і знікла. А потым з-пад вады мы пачулі дзікі смех, які праз некаторы час сціх. Вядома ж, што ета іх вадзінік зацягнуў»* (зап. ад Надзеі Мікалаеўны Пракопчык, 1934 г. н., у в. Новыя Грамыкі). Матыў, звязаны з засцярогай ад вадзяніка, мае некалькі мікраматываў, але ў веткаўскіх запісах сустракаецца толькі адзін з іх, паводле якога абараніцца ад яго можна пры дапамозе крыжыка і малітвы: *«Нельзя сільна зліць яго, бо тады ўтапіць*

*можа. Каб у жывых астацца, нада ўсігда з сабой крэсцік насіць. Толькі ён зможа спасці чалавека»* (зап. ад М. П. Грамыка ў в. Чамярня); *«Вадзяны і сам любіць да сябе маладух зацягваць. Таму ніколі не йдзі ў ваду без крыжа, бо ён галоўны выратавальнік»* (зап. ад Н. К. Рослікавай у в. Шэйка).

Сярод персанажаў, якіх у славянскай міфалогіі прынята адносіць да катэгорыі людзей са звышнатуральнымі ўласцівасцямі, вылучаюцца ведзьма, ваўкалак і іншыя. Заслугоўваюць увагі асноўныя матывы міфалагічных тэкстаў пра ваўкалака, запісаныя на Веткаўшчыне: «Ваўкалак (ваўкулак) – чалавек-пярэварацень, які з дапамогай чараўніцтва ператвараецца сам або ператвараецца іншымі ў ваўка на пэўны тэрмін і захоўвае ў воўчым абліччы чалавечы розум» [4, с. 478]. Варта пагадзіцца з высновай даследчыцы А. Я. Леўкіеўскай аб тым, што «ў палескіх тэкстах добра прасочваюцца ўяўленні пра амбівалентную прыроду ваўкалака, які сумяшчае ў сабе чалавечыя і тагасветныя рысы» [4, с. 480]. У адным з міфалагічных тэкстаў, запісаным у горадзе Ветка, можна знайсці пацвярджэнне выказанай думкі. У дадзеным выпадку мае месца апазіцыя «чалавек / нячыстая сіла»: *«Адны гавораць, што ваўкалакі – гэта тыя ж людзі, але ў ваўчынай скуры. Другія расказвалі, што ваўкалакі – гэта нячыстая сіла»* (зап. ад Людмілы Аляксееўны Кузьменка, 1926 г. н.).

Матыў, звязаны з паходжаннем гэтай істоты, адлюстраваны ў выглядзе мікраматываў «Чараўнік ператвараецца ў ваўка» і «Ведзьма магла ператварыць чалавека без яго волі ў ваўкалака»: *«Чараўнік мог ператварацца ў ваўкалака»* (зап. ад М. П. Грамыка у в. Чамярня); *«Была ў нас вядзьмарка адна. Калі хто што зробіць не як яна хоча, дык яна магла ў ваўкалака любога чалавека закалдаваць»* (зап. ад Марыі Лаўрэнаўны Зуевай, 1926 г. н., у в. Стаўбун).

Сярод спосабаў ператварэння чалавека ў ваўкалака, абазначаных даследчыкамі ў выданні, прысвечаным народнай дэманалогіі Палесся [4, с. 483], вылучаецца ў веткаўскіх запісах адметны мікраматыў, зыходзячы з семантыкі якога, патрабуецца наяўнасць трох нажоў, каб жаданне чараўніка стала рэальным: *«…чараўнік мог ператварацца ў ваўкалака пры дапамозе трох нажоў. Гэтыя чараўнікі ўтыкалі нажы ў зямлю, а потым скакалі праз іх тры разы, пасля чаго ператвараліся ў ваўкалакаў»* (зап. ад М. П. Грамыка ў в. Чамярня). У адным з міфалагічных тэкстаўпра ваўкалака мае месца мікраматыў пра ператварэнне ў гэтую істоту пры дапамозе хамута: *«Адзін хлопец ёй (вядзьмарцы) жыта трохі падмяў, дык тая яго праз хамут правяла і ў валкалака закалдавала»* (зап. ад М. Л. Зуевай у в. Стаўбун).

Вяртанне ваўкалакам чалавечага аблічча – адзін з пашыраных матываў мясцовых міфалагічных апавяданняў, што атрымлівае рэалізацыю ў мікраматывах, звязаных з семантыкай стужкі/пояса і асвячэння месцазнаходжання звышнатуральнай істоты (*«Трэба тое месца, дзе часта бывае ваўкалак, пасвяціць вадой з царквы і паміж дрэвамі завязаць ленту белага колеру. Дык вось, ваўкалак будзе бегчы і, калі пераскочыць гэту ленту, то на некалькі хвілін прыме чалавечы выгляд, а тая лентачка адразу стане чырвонай»* – зап. ад Н. К. Рослікавай у в. Шэйка), нажа (*«А потым, калі яны ў такім выглядзе пераробяць усе свае справы, вяртаюцца на тое самае месца і зноў скачуць праз тыя нажы»* – зап. ад М. П. Грамыка у в Чамярня), біцця ваўкалака (*«Казалі, што яго мужыкі 12 разоў палкай секлі, пакуль з яго шкура гэтая воўчая не злезла»* – зап. ад М. Л. Зуевай у в. Стаўбун).

Прааналізаваныя фактычныя матэрыялы па асобных персанажах хатняй і прыроднай прасторы (дамавік і вадзянік), а таксама па істоце (ваўкалак), звязанай з чалавекам, надзеленым звышнатуральнымі ўласцівасцямі, далі магчымасць выявіць групы матываў і мікраматываў, характэрных для міфалагічнай прозы аднаго з палескіх раёнаў – Веткаўскага. Адзначаны найбольш распаўсюджаныя матывы, якія праілюстраваны на матэрыяле мясцовых міфалагічных тэкстаў пра дамавіка, вадзянога духа і ваўкалака.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Толстая, С. М. Свод материалов по полесской народной демонологии / С. М. Толстая // Живая старина. – 2020. – № 4. – С. 58 – 60.
2. Народная демонология Полесья. Публикация текстов в записях 80 – 90-х гг. XX века : в 4 т. / сост. Л. Н. Виноградова, Е. Е. Левкиевская. – 2-е изд. – М. : Издательский дом ЯСК, 2020. – Т. 4. Духи домашнего и природного пространства. Нелокализованные персонажи. – 832 с.
3. Вечнае: фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна / аўт.-уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2003. – 362 с.
4. Народная демонология Полесья. Публикации тестов в записях 80 – 90-х гг. XX века : в 4 т. / сост. Л. Н. Виноградова, Е. Е. Левкиевская. – М. : Языки славянских культур, 2010. – Т. 1. Люди со сверхъестественными свойствами. – 648 с.



РЕЗЮМЕ

В статье на основе архивных и опубликованных фактических материалов, записанных в Ветковском районе Гомельской области, рассматриваются основные мотивы и связанные с ними микромотивы, которые нашли отражение в мифологических текстах о некоторых духах домашнего и природного пространства, а также о людях со сверхъестественными свойствами.

SUMMARY

The article deals with archival and factual materials published and recorded in Vetka district, Gomel region. The article examines the main motives and related micro-motives, revealed in mythological texts about some spirits of domestic and natural areas, and people with supernatural properties.

***Раюк А. Р.***

# МЯЖА ПАМІЖ БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ ЭТНІЧНЫМІ ТЭРЫТОРЫЯМІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТ.

*ТАА «БурВодСець»*

*(Паступіў у рэдакцыю 10.03.3022)*

Адным з нявырашаных і дыскусійных пытанняў беларускай этналогіі з'яўляецца вызначэнне меж беларускай этнічнай тэрыторыі (кампактнага рассялення беларусаў) у канцы XVIII – пачатку XX ст. Складанасці вызначэння і вялікія разыходжанні ў ацэнках датычацца ў першую чаргу мяжы паміж беларускім і рускім этнічнымі масівамі. У дадзеным артыкуле мы разгледзім навуковыя падыходы і ўяўленні этнографаў-сучаснікаў аб тэрытарыяльнай мяжы паміж беларускім і рускім этнасамі ў часе знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі, даныя Усерасійскага перапісу 1897 г., а таксама абгрунтуем і вызначым найбольш рацыянальны падыход у акрэсленні паўночнай і ўсходняй мяжы беларускай этнічнай тэрыторыі ў адзначаны перыяд.

Расійская акадэмія навук пачала першыя этнаграфічныя даследаванні беларускіх губерняў імперыі толькі ў 1820-я гады, звяртаючы ўвагу галоўным чынам на мову насельніцтва і межы рассялення. Сабраныя ў 1827 г. звесткі рускага этнографа П. Кепена не былі надрукаваны. Часткай гэтай інфармацыі скарыстаўся чэшскі славіст П. Шафарык, які ў даследаванні «Славянскі народапіс» (1842) з-за недахопу звестак не змог вызначыць дакладны арэал распаўсюджання беларускай мовы, таму межы этнічнай тэрыторыі беларусаў на ўсходзе, поўдні і паўночным захадзе ён правёў у многім па былых знешніх паўночна-ўсходніх межах Вялікага Княства Літоўскага (напярэдадні першага падзелу Рэчы Паспалітай), што адпавядалі знешнім паўночным і ўсходнім межам Віцебскай і Магілёўскай губерняў Расійскай імперыі [1, с. 146].

Аднак у Расійскай імперыі да пачатку 1880-х гадоў галоўнай этнавызначальнай прыметай лічылася не мова, а веравызнанне: усіх парафіян

Рускай Праваслаўнай царквы адносілі да «рускага народа», адзінага ў трох галінах (велікарусы, маларусы і беларусы) [2, с. 490 – 495; 3, с. 16, 28]. Па гэтай прычыне ў першыя дзесяцігоддзі пасля ўключэння зямель былой Рэчы Паспалітай у склад Расійскай імперыі расійскія ўлады праяўлялі больш стараннасці не ў дакладных этнаграфічна-статыстычных апісаннях атрыманых тэрыторый (так званага «Заходняга краю»), а ў ідэалагічным абгрунтаванні праў на гэтыя тэрыторыі з вялікай колькасцю каталіцкага і ўніяцкага насельніцтва.

Пачаткова выкарыстоўваліся ў першую чаргу дынастычныя падставы легітымацыі валодання Заходнім краем. Уключэнне беларускіх, украінскіх і літоўскіх зямель у склад Расійскай імперыі аб'яўлялася як законны і справядлівы працэс «збірання рускіх зямель» («Отторженная возвратихъ»), што належалі па праву нашчадкам Рурыка, пад уладу расійскага манарха. У 1795 г. Кацярына II афіцыйна заявіла, што ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай не захапіла «ніводнага кавалка польскай зямлі» і мае поўнае права на «Літву», бо яшчэ кіеўскім князем Уладзімірам Святаславічам Полацкае княства ў X ст. было аддадзена старшаму сыну Ізяславу, а апошні нібыта аддаў «Літву» старэйшаму сыну Святаславу.

Пасля Полацкага царкоўнага сабору (1839) расійскія ўлады пачалі выкарыстоўваць канфесійны падыход у легітымацыі валодання Заходнім краем. Калі да таго часу заходнія губерні разглядаліся толькі як дынастычная (з часоў Старажытнай Русі) спадчына расійскіх імператараў («губерні, вернутыя ад Польшчы»), то перавод уніяцкага беларускага і ўкраінскага насельніцтва ў праваслаўе («рускую веру») успрымаўся ўладамі як духоўнае і этнічнае «вяртанне» насельніцтва «спрадвечна рускіх зямель» [2, с. 490 – 495; 3, с. 16, 163].

У пачатку 1860-х гадоў расійскія ўлады для доказаў «рускасці» каталіцкага насельніцтва заходніх губерняў выкарыстоўвалі лінгвістычны падыход, паводле якога галоўная роля ў вызначэнні этнічнай прыналежнасці асобы адводзілася мове. Аднак па прычыне Студзеньскага паўстання 1863 – 1864 гг. расійскія ўлады адмовіліся ад «эксперыментаў» у вызначэнні «рускасці» насельніцтва толькі праз лінгвістычны (і этнанімічны) падыход, які не дапамог прадухіліць сепаратысцкія настроі і паўстанчыя дзеянні, і вярнуліся да канфесійнага прынцыпу, палічыўшы, што «абрусенне» не з'яўляецца дастатковым без аправаслаўлення насельніцтва [3, с. 226]. Так, у 1863 г. Р. Эркерт выдаў «Этнаграфічны атлас заходнерускіх губерняў», а ў 1864 г. А. Рыціх – «Карту народанасельніцтва Заходне-Рускага краю», дзе за

этнавызначальны крытэрый было ўзята веравызнанне. Толькі з часу царавання Аляксандра III мова (побач з веравызнаннем) пачала лічыцца галоўным этнічным маркерам у імперыі, а з пачаткам Першай сусветнай вайны – самазаяўленне этноніма асобы.

Гэтыя падыходы ў спалучэнні з гістарычнымі і псеўдагістарычнымі ўяўленнямі адпаведна ўплывалі на афіцыйную статыстыку і складанне этнічных (лінгвістычных) карт навукоўцамі.

У расійскіх навукоўцаў ніколі не выклікала сумненняў прыналежнасць Полацкай (Віцебскай) і Магілёўскай губерняў да беларускай этнічнай тэрыторыі (хоць беларусы афіцыйна не разглядаліся як асобны этнас). Менавіта гэтыя землі і атрымалі ў расійскіх урадавых дакументах супольную афіцыйную назву «беларускія губерні» пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г., у 1796 – 1801 гг. былі аб'яднаны ў адну Беларускую губерню, а ў 1801 – 1840 гг. афіцыйна называліся як «Беларуска-Віцебская губерня» і «Беларуска-Магілёўская губерня». З сярэдзіны 1850-х гадоў у склад беларускай этнічнай тэрыторыі расійскія навукоўцы пачалі залічаць заходнія часткі Смаленскай губерні і паўночныя часткі Чарнігаўскай. Так, у 1855 г. лінгвіст С. Мікуцкі апублікаваў у навуковым выданні Расійскай імператарскай акадэміі навук свае звесткі, што «частка Смаленскай губерні, прынамсі павет Парэцкі, і частка Чарнігаўскай губерні, прынамсі павет Суражскі, трэба прылічыць да беларускай гаворкі» [1, с. 146].

Паводле статыстычных падлікаў М. Цэбрыкава, беларускае насельніцтва Смаленскай губерні ў 1857 г. складала 56% (600 878 чал.), з'яўлялася праваслаўным і было прадстаўлена толькі мясцовым сялянствам [4, с. 127]. Аднак гэтыя даныя М. Цэбрыкаў вывеў штучна і механічна (без апытання саміх сялян ці прынамсі мясцовых святароў). Ён проста падсумаваў колькасць сялянскага насельніцтва Смаленскага, Парэцкага, Краснінскага, Ельнінскага, Духаўшчынскага, часткі Бельскага, Дарагабужскага і Раслаўльскага паветаў, бо гэтыя землі ў XVI – XVII стст. уваходзілі ў склад ВКЛ, а таму, на яго думку, мясцовае насельніцтва злілося «з польскімі і літоўскімі выхадцамі», што з'явілася прычынай «племяннога адрознення» ад велікарусаў [4, с. 125 – 126]. А ўсіх дваран, святароў і разначынцаў Смаленскай губерні М. Цэбрыкаў аднёс да велікарусаў [4, с. 126] і ўказаў, што ўся былая смаленская каталіцкая шляхта ўжо ў XVII – XVIII стст. як па рэлігіі, так і па мове стала велікарускай («чыста-рускай»), у адрозненне ад дваран Віцебскай і Магілёўскай губерняў [4, с. 18, 28].

У 1875 г. А. Рыціх на падставе сабраных у 1850 – 1860-х гадах звестак склаў «Этнаграфічную карту Еўрапейскай Расіі», дзе ў аснову быў пакладзены моўны крытэрый. На поўначы і ўсходзе да абшару рассялення беларусаў ён аднёс не толькі Магілёўскую і Віцебскую губерні, але і палову Смаленскай. У 1885 г. адзін з ідэолагаў заходнерусізму М. Каяловіч таксама выказаўся, што на Смаленшчыне і паўднёвай Пскоўшчыне па ладу жыцця і мове жывуць «тыя ж беларусы» [1, с. 149]. Я. Карскі склаў у 1903 г. «Этнаграфічную карту беларускага племені» і вызначыў беларускія гаворкі, якія на поўначы і ўсходзе дасягалі Апочкі, Вялікіх Лук, Ржэва, Вязьмы і Бранска. Маскоўская дыялекталагічная камісія пры складанні падобных этнічных карт у 1915 г. таксама, не звяртаючы ўвагу на ўласнае атаясамліванне насельніцтва (асабліва сялянскага), абапіралася на моўны крытэрый (фанетычныя асаблівасці).

Пасля ліквідацыі ў 1917 г. Расійскай імперыі ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі праявіліся нацыянальна-культурныя і палітычныя сілы, якія паставілі на мэце палітычнае самавызначэнне беларусаў. Гэта актуалізавала пытанне як пра навуковую канкрэтызацыю меж этнічнай тэрыторыі беларусаў, так і змаганне (у тым ліку ідэалагічнае) з боку розных палітычных і нацыянальна-культурных сіл (беларусаў, літоўцаў, украінцаў, палякаў і рускіх) за тыя ці іншыя тэрыторыі былых літоўска-беларускіх губерняў імперыі.

Пры складанні сваіх карт этнічнай тэрыторыі беларусаў М. Доўнар-Запольскі ў 1918 г. і Я. Канчар у 1919 г. выкарысталі комплекс крытэрыяў (пры дамінаванні моўнага). М. Доўнар-Запольскі аднёс да абшару рассялення беларусаў не толькі Заходняе Палессе, але і ўсе землі, дзе паводле даследаванняў Я. Карскага дамінавала беларуская мова, і пашырыў арэал рассялення беларусаў за лік сумежных зямель (невялікіх частак Ломжынскай, Чарнігаўскай і Арлоўскай губерняў) [5, с. 42]. Я. Канчар яшчэ больш, чым М. Доўнар-Запольскі, пашырыў межы этнічнай тэрыторыі беларусаў на ўсходзе, уключыўшы ў арэал рассялення цалкам Масальскі і Жыздраўскі паветы Калужскай губерні, усю Смаленскую губерню, Ржэўскі і Асташкаўскі паветы Цвярской губерні, Бранскі, Трубчэўскі і Сеўскі паветы Арлоўскай губерні, а таксама тэрыторыю ўсіх трох «інфлянцкіх паветаў» Віцебскай губерні – Рэжыцкага, Дынабургскага і Люцынскага. Відавочна, што М. Доўнар-Запольскі і Я. Канчар былі прадаўжальнікамі традыцыі расійскіх этнографаў і лінгвістаў XIX ст.

У 1918 г. прадстаўнікі беларускага сацыялістычнага руху абвясцілі аб стварэнні незалежнай БНР, дзяржаўнымі межамі якой аб'яўляліся межы рассялення беларусаў паводле М. Доўнар-Запольскага. У сярэдзіне XX ст. некаторыя беларускія мігранцкія палітыкі-сацыялісты ў Францыі і Вялікабрытаніі ў сваіх выданнях адвольна яшчэ больш пашыралі беларускую этнічную тэрыторыю, даводзячы яе на поўначы і ўсходзе за Пскоў, Ржэў, Вязьму і пад Калугу [6; 7].

Іншы погляд на арэал рассялення беларусаў мелі ў канцы XIX – пачатку XX ст. краёўцы-кансерватары (на чале са старшынёй Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі Э. Вайніловічам), якія ў 1917 – 1921 гг. імкнуліся рэалізаваць свае ідэі палітычнай суб'ектнасці беларуска-літоўскіх зямель (ці толькі Беларусі) выключна ў рамках шасці паўночна-заходніх губерняў былой Расійскай імперыі – Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай. А сам арэал рассялення беларусаў акрэслівалі прыблізна ў рамках пяці губерняў – Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Гродзенскай і Віленскай [8, с. 201].

Краёўцы-кансерватары не згаджаліся з пазіцыямі беларускіх сацыялістаў (апошнія прэзентавалі ў 1919 г. у Парыжы і іншых сталіцах Еўропы этнічную карту рассялення беларусаў, падрыхтаваную М. Доўнар-Запольскім), што ў склад беларускай дзяржавы павінны ўваходзіць часткі былых Смаленскай, Пскоўскай, Калужскай і Чарнігаўскай губерняў, бо на гэтых тэрыторыях, на думку краёўцаў, беларусы былі ў відавочнай меншасці [5, с. 42 – 43].

Краёўцы-кансерватары лічылі тэрытарыяльныя жаданні беларускіх сацыялістатаў адносна ўсходняй мяжы Беларусі занадта перабольшанымі і сцвярджалі, што рэальная этнічная мяжа паміж Беларуссю і Расіяй – гэта мяжа паміж ВКЛ і Расійскай імперыяй напярэдані першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г., гэта значыць тагачасныя знешнія паўночныя і ўсходнія межы Віцебскай і Магілёўскай губерняў, без Смаленшчыны і Браншчыны [5, с. 43, 45]. Э. Вайніловіч лічыў, што мяжа паміж беларускім і рускім сялянствам ляжыць у светапоглядзе насельніцтва: усходняя мяжа рассялення беларусаў заканчваецца там, дзе «заканчваецца індывідуальная ўласнасць, а пачынаецца ўласнасць абшчынная» [9]. Мелася на ўвазе тое, што яшчэ ў ходзе падаўлення Студзеньскага паўстання расійскі ўрад 1 сакавіка 1863 г. скарэкціраваў умовы сялянскай рэформы (1861) у Беларусі, выдаўшы загад аб абавязковым пераводзе сялян Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў на выкуп, гэта значыць у катэгорыю зямельных уласнікаў,

з памяншэннем выкупной сумы на 20%, а да канца 1863 г. гэтая мера была распаўсюджана на Віцебскую, Магілёўскую губерні, чым, па сутнасці, скасоўвалася сялянская абшчына ў Беларусі, а сяляне станавіліся паўнапраўнымі прыватнымі ўласнікамі зямлі [10, с. 164]. У той жа час сяляне цэнтральных расійскіх губерняў (у тым ліку Смаленскай) пасля адмены прыгону (1861) да 1880-х гадоў знаходзіліся ў статусе «часоваабавязаных», у сваёй большасці да сталыпінскай аграрнай рэформы і пазней мелі зямлю ў калектыўнай (абшчыннай) уласнасці, а таму перыядычна пераразмяркоўвалі надзелы паміж членамі абшчыны, стрымлівалі выхад селяніна з абшчыны і атрыманне ім належнай долі зямлі ў індывідуальную ўласнасць, што не столькі спрыяла развіццю капіталістычных адносін, колькі кансервавала архаічныя эканамічныя структуры [11, с. 215 – 217].

Уяўленні краёўцаў-кансерватараў аб этнічнай мяжы паміж беларусамі і рускімі (велікарусамі) супалі з вынікамі Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі ў 1897 г., у ходзе якога не праводзілася апытанне аб этнічнай прыналежнасці асобы («народности»), а толькі аб роднай мове і веравызнанні. У Чарнігаўскай губерні беларусаў па мове налічвалася 151,5 тысяч чалавек, а ў Смаленскай – 100,7 тысяч чалавек. Беларуская мова была роднай для 90% жыхароў Краснінскага павета і для 84,7% Суражскага, а ў астатніх паветах Смаленскай і Чарнігаўскай губерняў доля беларускамоўнага насельніцтва была мізэрнай [1, с. 150].

Я. Насытка гэта тлумачыць русіфікатарскай палітыкай этнічных беларусаў Смаленшчыны, большасць якіх пераняла на працягу XIX ст. рускую мову [1, с. 150]. Аднак русіфікатарская палітыка ў Заходнім краі была не меншай. І да таго ж большасць сялян у Смаленскай і беларускіх губернях былі непісьменныя, таму не маглі засвоіць літаратурную рускую мову. На наш погляд, сяляне і іншыя катэгорыі насельніцтва Смаленскай губерні захоўвалі ў XIX ст. фанетычныя асаблівасці мовы (што і было зафіксавана лінгвістамі), але проста не лічылі іх за беларускія, а прыналежнасць да рускага этнасу ўкаранялася ад паўсядзённых нефармальных стасункаў з мясцовымі праваслаўнымі дваранамі і святарамі. Пасля Андрусаўскага міру (1667) Смаленшчына і Старадубшчына ўвайшлі ў склад Рускага царства, і царскі ўрад у канцы XVII – пачатку XVIII ст. зрабіў шмат захадаў, каб парваць усялякія сувязі смаленскай шляхты з ВКЛ: каталіцкія касцёлы пераводзіліся ў праваслаўныя цэрквы, смаленскім дваранам было забаронена пераходзіць у каталіцтва (а толькі спавядаць праваслаўе), прымаць каталіцкіх святароў, вучыцца ў адукацыйных ўстановах Рэчы Паспалітай і г. д. [4, с. 18

– 23]. Таму не дзіўна, што за некалькі дзесяцігоддзяў адбылася этнічная асіміляцыя жыхароў Смаленшчыны і Старадубшчыны і ўключэнне ў склад рускага этнасу.

Увесь час знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі значная частка мясцовага каталіцкага дваранства марыла адрадзіць былую федэрацыйную Рэч Паспалітую, прычым толькі ў межах да першага падзелу ў 1772 г. На нашу думку, рэжым выключных законаў, уведзены расійскім урадам у беларуска-літоўскіх губернях з-за паўстанняў мясцовых каталіцкіх дваран, і карэкціроўка сялянскай рэформы не былі прычынай рознасці этнічнага стэрэатыпа паводзін і светапогляду беларусаў і рускіх, а толькі значна ўзмацнялі своеасаблівасць эканамічна-прававога становішча літоўска-беларускіх губерняў і іх адасобленасць ад рэалій агульнаімперскага жыцця і іншых рэгіёнаў імперыі. Гэта, у сваю чаргу, заканамерна спрыяла кансервацыі стэрэатыпа паводзін прадстаўнікоў беларускага этнасу з-за павелічэння сярэднестатыстычнай частаты нефармальных сувязей унутры сваёй этнічнай сістэмы [12].

Такім чынам, мяжа паміж беларускай і рускай этнічнымі тэрыторыямі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. істотна не змянялася і адпавядала знешнім паўночным і ўсходнім межам Полацкай (Віцебскай) і Магілёўскай губерняў Расійскай імперыі, якія супадалі са знешнімі паўночнымі і ўсходнімі межамі ВКЛ перад першым падзелам Рэчы Паспалітай у 1772 г. Мясцовае каталіцкае маянтковае дваранства мела даволі адэкватнае ўяўленне (зыходзячы са сваёй гістарычна-дзяржаўнай традыцыі, паўсядзённых назіранняў і нефармальных кантактаў з сялянамі) аб межах беларускай этнічнай тэрыторыі і сваімі дзеяннямі нават паспрыяла захаванню непарушнай тэрытарыяльнай мяжы паміж беларускім і рускім этнічнымі масівамі. Канфесійны і моўны падыходы даследавання не ўлічвалі наяўнасці структуры нефармальных сувязей, якія ўтваралі этнічную сістэму.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII ст. – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш.] – Мінск : Беларуская навука, 2011. – Кн. 1. – 584 с.

2. Устрялов, Н. Русская история : в 2 ч. / Н. Устрялов. – 5-е изд. – СПб. : Тип. А. Фридрихсона, 1855. – Ч. 2. Новая история. – 600 с.

3. Долбилов, М. Д. Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М. Д. Долбилов. – М. : Новое литературное обозрение, 2010. – 1000 с.

4. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Смоленская губерния / сост. М. Цебриков. – СПб. : Тип. департамента Генерального штаба, 1862. – 404 с.

5. Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918 – 1922) / К. Гамулка ; пер. з польск. мовы. – Вільнюс : ЕГУ, 2008. – 256 с.

6. Byelorussia (Whiteruthenia) under Russian occupation. – London : Association of Byelorussians in Great Britain, 1949. – 5 p.

7. Rydlevsky, L. Biélorussie. Aperçu sommaire de l'Histoire de la Nation biélorussienne et du Mouvement de Libération Nationale / L. Rydlevsky. – Paris : [s. p.], 1948. – 40 p.

8. Woyniłłowicz, E. Wspomnienia. 1847 – 1928 / E. Woyniłłowicz. – Wilno : J. Zawadzki, 1931. – Cz. 1. – 368 s.

9. Woyniłłowicz, E. Granice Polski w 1771-m i w 1920-m roku (I) / E. Woyniłłowicz // Słowo. – 1927. – № 96. – S. 3.

10. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.] ; рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – 519 с.

11. История России. XX век : в 2 т. / отв. ред. А. Б. Зубов. – М. : АСТ, 2009. – Т. 1. 1894 – 1939 гг. – 1024 с.

12. Раюк, А. Р. Нефармальныя сувязі паміж дваранствам Полацкай (Віцебскай) губерні ў 1772 – 1863 гг. / А. Р. Раюк // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2017. – Вып. 22. – С. 380 – 383.

РЕЗЮМЕ

В статье рассматриваются подходы и представления учёных о территориальной границе между белорусским и русским этносами в конце XVIII – начале XX в. Изучение неформальных сетевых связей позволяет сделать вывод, что граница между белорусской и русской этническими территориями за исследуемый период существенно не менялась и соответствовала внешним северным и восточным границам Витебской и Могилёвской губерний Российской империи, которые совпадали с внешними северными и восточными границами ВКЛ накануне разделов Речи Посполитой в 1772 г.

SUMMARY

The article considers the approaches and ideas of scientists about the territorial border between the Belarusian and Russian ethnic groups in the late XVIII – early XX centuries. The study of informal network connections allows to conclude that the border between the Belarusian and Russian ethnic territories did not change significantly during the studied period and corresponded to the external northern and eastern borders of the Vitebsk and Mogilev provinces of the Russian Empire, which coincided with the external northern and eastern borders of the Grand Duchy of Lithuania on the eve of the partitions of the Polish-Lithuanian Commonwealth in 1772.

***Станкевіч А. А.***

# ТЫПЫ СТРУКТУРНА-СЕМАНТЫЧНАГА МАДЭЛЯВАННЯ ЗМЕСТУ ПАРЭМІЙНАГА ДЫСКУРСУ: БЕЛАРУСКА-РУСКІЯ ПАРАЛЕЛІ

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 12.03.2022)*

Важнейшай часткай традыцыйнай народнай культуры з'яўляецца фальклор, які адыграў значную ролю ў выражэнні народнага светапогляду і менталітэту. Народнапаэтычная творчасць усходнеславянскіх народаў мае агульныя крыніцы і шмат у чым пераклікаецца з фальклорам іншых славянскіх народаў. Даследчык беларускага фальклору К. П. Кабашнікаў, аналізуючы беларуска-рускія фальклорныя сувязі, падкрэсліваў вытокі агульнай фальклорнай спадчыны ўсходніх славян: «Беларуска-рускія фальклорныя сувязі – неад'емная частка вялікага, усеабдымнага комплексу сувязей <…> У фальклоры двух братніх народаў глыбока і аб'ектыўна адлюстроўваюцца агульнасць вытокаў духоўнай культуры, а таксама тэндэнцыі да пастаяннага пашырэння ўзаемадзеяння і ўзаемаўзбагачэння як важнейшых рыс фальклорнага працэсу. Пры гэтым мы памятаем, што ў беларускім фальклоры выразна выяўляюцца таксама сувязі з вуснапаэтычнай творчасцю ўкраінскага, польскага і іншых славянскіх народаў» [1, с. 3].

Супастаўляльны аналіз лінгвакамунікатыўных, прагматычных і аксіялагічных асаблівасцей асобных фальклорных жанраў ва ўсходнеславянскіх мовах дазваляе выявіць тыпалагічныя рысы адзінай гістарычнай спадчыны блізкароднасных народаў, падобныя і адметныя асаблівасці развіцця іх духоўнай культуры.

У агульнай сістэме фальклорных твораў вылучаюцца так званыя малыя жанры – прыказкі, прымаўкі, загадкі, скорагаворкі і іншыя, якія збліжае невялікі тэкставы аб'ём, лаканічнасць, афарыстычнасць, вобразнасць і выразнасць выражэння зместу. У складзе малых жанраў вуснай народнапаэтычнай творчасці прыкметна вызначаюцца прыказкі і прымаўкі, якія з'яўляюцца неад'емным элементам паўсядзённага жыцця, сапраўднай скарбніцай народнай мудрасці. Яны ў вобразнай, дасціпнай і лаканічнай форме адлюстроўваюць багаты жыццёвы вопыт і мудрасць сваіх стваральнікаў, даюць ацэнку ўсіх сфер дзейнасці чалавека і маюць выразную павучальную функцыю. М. Я. Грынблат адзначаў: «Асноўнае ў паэтыцы прыказкі, самая адметная яе адзнака – гэта гранічная эканомія слова, выяўленчых сродкаў, гэта здольнасць прыказкі сказаць сцісла, некалькімі

словамі, часта адной рыскай пра многае, уменне ахарактарызаваць пэўную з'яву, паводзіны чалавека» [2, с. 44].

Прыказкі і прымаўкі як асобны жанр вуснай народнай творчасці ў значна большай ступені, чым усе астатнія малыя жанры, маюць выразную прагматычную накіраванасць: «І прыказкі, і прымаўкі <…> выяўляюць бліскучыя здольнасці народа да вобразнага мыслення, яго выключную назіральнасць, разважлівасць, высокія маральныя асновы, жыццёвы практыцызм і бязмежныя моўныя багацці» [2, с. 10]. У іх сфармуляваны своеасаблівы «кодэкс» паводзін чалавека, выказваюцца агульнапрынятыя філасофскія, сацыяльныя і маральна-этычныя погляды на разнастайныя з'явы жыцця.

Даследчыкі вуснай народнапаэтычнай творчасці высока ацанілі тэматычную разнастайнасць, змястоўнасць, адметныя слоўна-вобразныя якасці, пазнавальнае і павучальнае значэнне парэмійнага фонду: «Прыказкі вызначаюцца завершанасцю і лаканічнасцю формы, яскравай метафарычнасцю, рытмічнасцю мовы, разнастайнасцю сродкаў мастацкай выразнасці» [3, с. 282]. Прыказкі – «мастацкія мініяцюры, якія ў яркай, чаканнай форме адлюстроўваюць факты жывой рэчаіснасці» [4, с. 8].

І. Я. Лепешаў звярнуў увагу на тое, што прыказкі і прымаўкі, у адрозненне ад іншых фальклорных жанраў, «не выконваюцца, а ўстаўляюцца ў маўленне ў адпаведнасці з канкрэтнай жыццёвай сітуацыяй як афарыстычнае закончанае суджэнне, праверанае вопытам многіх пакаленняў», якое мае звычайна павучальны змест [5, с. 4].

Разглядаючы прыказкі і прымаўкі як пэўныя маўленчыя дзеянні, даследчыкі адносяць парэміі да клішыраваных, стандартызаваных моўных сродкаў уздзеяння і кваліфікуюць іх як міні-дыскурсы. Паводле іх меркавання, прыказкі і прымаўкі набылі стандартызаваную форму па прычыне спалучэння семантычнага і прагматычнага аспектаў. «Яны з'яўляюцца спецыялізаванымі формамі выражэння пэўных прагматычных установак і рэгулятываў паводзін <…> выступаюць класічнай формай мнеманічнай мадэлі моўнага існавання» [6].

Аналіз прадметна-тэматычнай і функцыянальна-сэнсавай характарыстыкі народных афарыстычных выслоўяў у беларускім і рускім парэмійных фондах дазваляе вызначыць іх асноўныя функцыі. У першую чаргу адзначаецца кагнітыўная, пазнавальная роля народнай афарыстыкі ў грамадскім жыцці. У прыказках і прымаўках адлюстраваўся, занатаваўся і захаваўся народны вопыт, звязаны з назіраннямі за прыроднымі з'явамі,

асаблівасцямі грамадскага жыцця, гаспадарчай дзейнасці, сялянскага побыту, сямейных адносін і да т. п. У парэміях дэкларуюцца разнастайныя практычныя парады, рэкамендацыі, выказваюцца абагульненыя погляды на жыццё: *«Май халодны – не будзеш галодны»* [7, с. 80]; *«Май холодный — год хлебородный»* [8, с. 144]; *«Дзе гаспадар ходзіць, там жыта (зямля) родзіць»* [7, с. 119]; *«Посеешь густо, не будет пусто»* [8, с. 36]; *«Дарагі той куток, дзе завязалі пупок»* [7, с. 288]; *«Своя хатка – родная матка»* [8, с. 100]; *«Гаспадарка свет корміць»* [7, с. 119]; *«Дружно – не грузно, а врозь – хоть брось»* [8, с. 54]; *«Не піў бы, не еў бы, да на любу глядзеў бы»* [9, с. 8]; *«В семье – любовь да совет, так и нужды нет»* [8, с. 99]; *«Век пражыць – не кашулю пашыць»* [9, с. 405]; *«Жизнь прожить – не поле перейти»* [8, с. 61].

Звязваючы прыроду парэмій з павучальнасцю, адной з асноўных функцый прыказкавых выразаў сучасныя парэміёлагі лічаць дыдактычную, рэгулятыўную функцыю, якая абумоўлівае іх прагматычны патэнцыял. Ступень актуальнасці павучальнага сэнсу парэміі можа быць рознай у залежнасці ад сацыяльна-камунікацыйнай сітуацыі яе выкарыстання [10, с. 9 – 10].

Як паказвае фактычны матэрыял, многія парэміі і ў беларускай, і ў рускай мове маюць выразную лінгвапрагматычную накіраванасць – у іх дыктуюцца нормы маральна-этычных паводзін чалавека. Іх дыдактычная функцыя нярэдка вербалізуецца імператыўнымі формамі, якія адлюстроўваюць ілакуцыйную функцыю маўленчага акту, выражаюць маўленчы намер выказвання: *«За праўду стой гарой»* [9, с. 432]; *«Живи для людей, поживут и люди для тебя»* [8, с. 55]; *«Хто вінен, аддаць павінен»* [7, с. 489]; *«Нашёл – не радуйся, потерял – не тужи»* [8, с. 115]; *«Чужое ў карысць не пойдзе»* [9, с. 436]; *«Чужим умом не выстроишь дом»* [8, с. 69]; *«Не адкладвай на заўтра, што паспееш зрабіць сёння»* [11, с. 90]; *«Других не суди – на себя погляди»* [8, с. 76]; *«Ад добрага не ўцякай і ліхога не рабі»* [10, с. 458]; *«За добро плати добром»* [8, с. 106]; *«Хто рана ўстае, таму бог дае»* [7, с. 174]; *«На чужой каравай рот не разевай, а пораньше вставай да свой приспевай»* [8, с. 137].

Значная група парэмій валодае аксіялагічнай накіраванасцю, мае каштоўнасны арыенцір, у ёй выражаецца прамая або ўскосная пазітыўная ацэнка пэўнага факта, падзеі, з’явы або якасці: *«Дождж у пору – усё роўна што золата»* [7, с. 54]; *«Шчырая праца – мазалёвая»* [7, с. 164]; *«Сваё хазяйства мілей чужога царства»* [7, с. 185]; *«Свой дварочак, як вяночак»* [7, с. 191]; *«Придёт солнышко и к нашим окошечкам»* [12]; *«Не тот молодец,*

*кто нашёл дело, а кто исполняет умело»* [8, с. 39]; *«Правда чище ясного солнца»* [12]; *«Мастерство везде в почёте»* [12].

Супастаўленне тыпаў структурна-семантычнага мадэлявання парэмійнага дыскурсу ў беларускай і рускай мовах дазваляе таксама вызначыць розныя спосабы вербалізацыі прыказкавага зместу – прамыя і ўскосныя тактыкі маўленчага выражэння ў правербіяльных адзінках, якія ў значнай ступені залежаць ад іх інтэнцыянальнасці. Інтэнцыянальны спектр, што адлюстроўвае маўленчы намер стваральнікаў народных прыказак, даволі разнастайны.

Так, з аднаго боку, у многіх народных афарызмах змест выказваецца літаральна, у прамым сэнсе ў форме назіранняў (*«Жураўлі ляцяць нізка – зіма ўжо блізка»* [7, с. 72]; *«Вьюги-метели под февраль полетели»* [8, с. 143]); абагульненняў (*«Учарашняга дня не вернеш»* [7, с. 90]; *«Далей кінеш – бліжэй возьмеш»* [5, с. 151]; *«Поле труд любит»* [8, с. 168]; *«Здоровья не купишь»* [12]); разважанняў (*«Не той багаты, хто мае срэбра і злата, а той багаты, хто мае хлеб»* [7, с. 231]; *«Як гукнеш, так і адгукнуць»* [7, с. 372]; *«Огонь без дыму не живёт»* [12]; *«Куда ветер, туда и тучи»* [8, с. 119]); парад (*«Усё добра, што ў меру»* [7, с. 254]; *«Рыхтуй летам (улетку) сані, а зімой калёсы»* [7, с. 274]; *«Не гонись за двумя зайцами – ни одного не поймаешь»* [8, с. 41]; *«Семь раз примерь, а один отрежь»* [8, с. 41]); рэкамендацый (*«Не адкладвай на заўтра, што паспееш зрабіць сёння»* [11, с. 90]; *«Лепш сто сяброў, чым сто рублёў»* [7, с. 383]; *«Новых друзей наживай, а старых не теряй»* [8, с. 84]; *«С людьми мирись, а с грехами бранись!»* [12]); ацэнкі станоўчай (*«Праца да рукі – моцныя парукі»* [7, с. 164]; *«Хто цярплівы, той шчаслівы»* [11, с. 316]; *«Смелость (отвага) города берёт»* [12]; *«Мастерство везде в почёте»* [12]) ці адмоўнай (*«Хто многа гаворыць, той мала робіць»* [11, с. 316]; *«Гулі не аднаго ў лапці абулі»* [5, с. 142]; *«Живут как кошка с собакой»* [8, с. 94]; *«Ненасытному всё мало»* [8, с. 160]) і іншых.

Пры гэтым у парэміях могуць адлюстроўвацца розныя мадальныя адценні: перасцярога (*«Не падкладай агню ў салому»* [7, с. 60]; *«Не в свои сани не садись»* [13, с. 202]); надзея (*«Будзе і на нашай вуліцы свята»* [7, с. 456]; *«Взойдёт солнце и к нам на двор»* [12]); суцяшэнне (*«Бяда хоць мучыць, ды жыць вучыць»* [5, с. 103]; *«Дождик вымочит, а красно солнышко высушит»* [12]); падтрымка (*«Будзем жывы – не памром»* [5, с. 97]; *«Горе горюй, а руками воюй»* [12]); спачуванне (*«Бог не без літасці, казак не без шчасця»* [5, с. 89]; *«Сей добро, и жди добра»* [12]); разважлівасць (*«Запас бяды не чыніць»* [7, с. 189]; *«Не жалей алтына: отдашь полтину»* [12]);

папярэджванне (*«Едзеш на дзень, бяры хлеба на тыдзень»* [5, с. 184]; *«Хочешь есть калачи, не сиди на печи»* [8, с. 35]) і іншае.

З другога боку, у шматлікіх беларускіх і рускіх правербіяльных выразах выкарыстоўваецца іншасказанне, калі пэўнае назіранне, сентэнцыя або павучанне выражаюцца алегарычна, праз метафару, алегорыю, сімвал, алюзію, алагізм, гульню слоў і іншыя лексіка-семантычныя сродкі выяўленчай выразнасці. У сувязі з гэтым у навуковай літаратуры часта падкрэсліваецца пераносны, алегарычны сэнс многіх прыказак: Прыказка – «устойлівае, узнаўляльнае, не менш як двухкампанентнае афарыстычнае, найчасцей поўнасцю або часткова алегарычнае закончанае выказванне звычайна павучальнага характару» [5, с. 18]; «…афарыстычны выраз, які адлюстроўвае шматвяковы жыццёвы вопыт і мудрасць народа часцей за ўсё ў мастацка-вобразнай форме і ўжываецца пераважна ў пераносным значэнні» [14, с. 398].

У многіх правербіяльных выразах як беларускай, так і рускай мовы метафарычнае мадэляванне прыказкавага зместу грунтуецца на персаніфікацыі, калі фізічная, фізіялагічная або псіхічная, разумовая, маўленчая дзейнасць чалавека прыпісваецца з’явам прыроды (*«Восень кажа: “Я ўраджу”, вясна кажа: “А я пагляджу”»* [7, с. 87]; *«Вясною лес адзенецца, а восенню нявесь гдзе падзенецца»* [7, с. 77]; *«Пытаецца люты, ці добра абуты?»* [7, с. 74]; *«Осень всклочет, да как весна захочет»* [13, с. 238]; *«Придёт осень, за всё спросит»* [13, с. 267]); прамежкам часу (*«Дзень выганяе з хаты, а ноч прыганяе»* [7, с. 89]; *«Летний день год кормит»* [13, с. 100]) або нават адцягненым паняццям (*«Прыйшоў недастатак, забраў астатак»* [7, с. 407]; *«Нужда скача, нужда пляшыць, нужда песенькі пяець»* [7, с. 409]; *«Добрая слава лежит, а худая бежит»* [13, с. 105]; *«Запрос в карман не лезет»* [13, с. 125]).

Даволі часта ў парэміях іншасказанне выражаецца праз метафарызацыю, заснаваную на аналогіях, звязаных з падабенствам прадметаў і з’яў аб’ектыўнай рэчаіснасці. Асацыятамі ў такіх прыказках з’яўляюцца разнастайныя рэаліі аб’ектыўнай рэчаіснасці: прыродны свет, прадметы паўсядзённага і гаспадарчага побыту чалавека. У многіх парэміях як беларускага, так і рускага прыказкавага фонду пры метафарызацыі выкарыстоўваецца зааморфны код (*«Воўка ногі кормяць»* [7, с. 60]; *«І заяц мае дамоўку, хоць пад кустом»* [7, с. 210]; *«Кабыла з ваўком цягалася – хвост ды грыўка асталася»* [7, с. 354]; *«Два медведя в одной берлоге не живут»* [13, с. 383]; *«Заставили козла огород стеречь»* [8, с. 48]; *«Волк коню*

*не товарищ»* [13, с. 70]); арнітаморфны (*«Па пер'і птушку ўзнаюць»* [7, с. 65]; *«Якая птушка, такая і песня»* [7, с. 65]; *«Салавей пяе, да хлеба не дае»* [7, с. 67]; *«Старого воробья на мякине не проведёшь»* [13, с. 397]; *«Цыплят по осени считают»* [8, с. 43]; *«Ворон ворону глаз не выклюет»* [13, с. 73]); фітаморфны (*«Усяка сасна ў сваім бару гудзе»* [7, с. 290]; *«Вярба таўстая, ды ў сярэдзіне пустая»* [7, с. 70]; *«Яблочко от яблоньки недалеко падает»* [13, с. 369]; *«Смола к дубу не пристанет»* [13, с. 413]); прадметны код (*«Каму долата, а каму золата»* [7, с. 428]; *«Змяняў шыла на мыла»* [7, с. 465]; *«Битая посуда два века живёт»* [13, с. 42]; *«Дома и стены помогают»* [13, с. 107]).

У аснову метафарычнага мадэлявання прыказкавага зместу многіх парэмійных выразаў можа быць пакладзена алегорыя, заснаваная на аналогіі паміж пэўным абстрактным паняццем і канкрэтным прадметам, які стварае іншасказальны вобраз гэтага паняцця. У алегарызацыі парэмійнага зместу ўдзельнічаюць, як правіла, субстантыўныя намінацыі – назвы прадметаў сферы побыту і гаспадарчай дзейнасці (*«Парожняя бочка звініць, а поўная маўчыць»* [9, с. 239]; *«Пустая мельница без ветру мелет»* [8, с. 67]), заасферы (*«Арлу з савой не па дарозе»* [5, с. 74]; *«Гусь свинье не товарищ»* [13, с. 405]), фітасферы (*«Дуб ломіцца, а траўка застаецца»* [11, с. 186]; *«Руби дерево по себе»* [13, с. 410]), рэчываў (*«Госць першы дзень – золата, другі – серабро, а трэці – медзь, хоць і дадому едзь»* [11, с. 65]; *«Слово – серебро, а молчание – золото»* [13, с. 420]); прылад працы (*«Адзін з сошкай, а сямёра* [*пяць*] *з ложкай»* [5, с. 55]; *«Один с сошкой, а семеро с ложкой»* [13, с. 485]); адцягненыя назвы (*«Душа ў пяты схавалася»* [11, с. 300]; *«Чужая душа – потёмки»* [13, с. 414]) і іншыя.

Алегарычны вобраз у некаторых парэміях ствараюць таксама дзеясловы, якія абазначаюць фізічнае дзеянне: *«Хто высока лятае, той нізка сядае»* [11, с. 316]; *«Кто другому яму роет, сам в неё попадает»* [13, с. 429]; *«Ад зямлі адарваўся і да неба не дастаўся»* [11, с. 205]; *«Куда ни кинь, везде клин»* [13, с. 428]; *«Цішэй едзеш – далей будзеш»* [11, с. 298]; *«Кто едет, тот и правит»* [13, с. 415].

Супастаўляльны аналіз беларускага і рускага парэміялагічных фондаў даваляе не толькі выявіць агульныя асаблівасці выражэння прыказкавага зместу, але і адзначыць іх пэўныя адрозненні. Так, у рускіх парэміяграфічных крыніцах больш значная ўвага надаецца характарыстыцы паводзін чалавека і яго асобасных якасцей, як станоўчых, так і адмоўных. У беларускіх жа слоўніках прыказак і прымавак большы аб'ём займаюць парэміі, звязаныя з

гаспадарчай, працоўнай дзейнасцю, матэрыяльным побытам, грамадскім жыццём, народным календаром, менш – з характарыстыкай асобы. Пры адлюстраванні ў парэміях асаблівасцей паводзін і характару чалавека ў рускіх прыказках і прымаўках больш разгорнута падаецца негатыўная ацэнка, адмоўная характарыстыка, а ў беларускім парэміялагічным фондзе часцей канстатуюцца станоўчыя адзнакі і пажаданні.

Такім чынам, на аснове параўнальнага аналізу прадметна-тэматычнай і функцыянальна-сэнсавай характарыстыкі народных афарыстычных выслоўяў выяўляюцца агульныя кагнітыўная, лінгвапрагматычная і акцыянальная ролі правербіяльных выразаў у беларускім і рускім парэмійных фондах. Супастаўленне тыпаў структурна-семантычнага мадэлявання парэмійнага дыскурсу ў беларускай і рускай мовах дазваляе таксама вызначыць розныя спосабы вербалізацыі прыказкавага зместу – прамыя, літаральныя (у форме назіранняў, абагульненняў, разважанняў, рэкамендацый, парад, ацэнкі) і ўскосныя, іншасказальныя тактыкі маўленчага выражэння (праз метафару, алегорыю, сімвал, алюзію) у правербіяльных выразах, якія ў значнай ступені залежаць ад іх інтэнцыянальнасці, мэты выказвання і сацыяльна-камунікацыйнай сітуацыі выкарыстання.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Кабашнікаў, К. П. Беларуска-рускія фальклорныя сувязі / К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 238 с.
2. Грынблат, М. Я. Прыказкі і прымаўкі / М. Я. Грынблат // Прымаўкі і прыказкі : у 2 кн. / склад., уст. арт., камент. М. Я. Грынблата ; рэд. тома А. С. Фядосік. – Мінск, 1976. – Кн. 1. – С. 5 – 48.
3. Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – Мінск : Вышэйшая школа, 1979. – 320 с.
4. Пермяков, Г. Л. От поговорки до сказки / Г. Л. Пермяков. – М. : Наука, 1970. – 240 с.
5. Лепешаў, І. Я. Тлумачальны слоўнік прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Гродна : ГрДУ, 2011. – 667 с.
6. Сидоркова, Г. Д. Прагматика паремий. Пословицы и поговорки как речевые действия : автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.02.19 / Г. Д. Сидоркова. – Краснодар, 1999. – 53 с.
7. Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / склад., уст. арт., камент. М. Я. Грынблата ; рэд. тома А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 557 с.
8. Рыбникова, М. А. Русские пословицы и поговорки / М. А. Рыбникова. – М. : Изд-во АН СССР, 1961. – 230 с.
9. Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / склад., уст. арт., камент. М. Я. Грынблата ; рэд. тома А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.

10. Ничипорчик, Е. В. Отражение ценностных ориентаций в паремиях / Е. В. Ничипорчик. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2015. – 358 с.

11. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. Янкоўскі. – 3-е выд., дапрац., дап. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.

12. Даль, В. Пословицы и поговорки русского народа [Электронный ресурс] / В. Даль. – Режим доступа: https://www.100bestbooks.ru/files/Dal_Poslovicy_i_pogovorki_russkogo_naroda. – Дата доступа: 03.02.2022.

13. Жуков, В. П. Словарь русских пословиц и поговорок / В. П. Жуков. – 7-е изд. – М. : Русский язык, 2000. – 554 с.

14. 14 Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1986. – Т. 4. – 742 с.

РЕЗЮМЕ

В статье проводится сопоставительный анализ белорусских и русских провербиальных выражений, на основе их предметно-тематической и функционально-семантической характеристики определяются основные функции паремийных фондов в общественной жизни, в соответствии с типами структурно-семантического моделирования содержания народных афоризмов описываются различные способы вербализации пословичного смысла в белорусском и русском языках.

SUMMARY

In the article Russian and Belarusian proverbial expressions are analyzed comparatively, the main functions of paremia funds in public life are determined on the basis of their subject-thematic and functional-semantic characteristics, in accordance with the types of structural-semantic modeling of the content of folk aphorisms, various ways of verbalization of proverbial meaning in the Belarusian and Russian languages are described.

***Сумко А. В.***

# КУЛЬТУРА ЖЫЦЦЕЗАБЕСПЯЧЭННЯ ПАСЛЯВАЕННАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 28.02.2022)*

Праблема аналізу культуры жыццезабеспячэння (КЖ) была пастаўлена ў этнаграфічнай навуцы ў канцы 1970-х гадоў. Адным з тых, хто першым пачаў распрацоўваць праблему КЖ на тэарэтычным узроўні, быў С. А. Аруцюнаў, які лічыў, што менавіта з гэтай падсістэмы культуры найбольш зручна пачынаць даследаванне культуры этнасу. У 1983 г. выйшла калектыўная манаграфія «Культура жизнеобеспечения и этнос», дзе пазначалася, што КЖ уключаетакія матэрыяльна вызначаныя кампаненты, як

паселішчы, жыллё, ежа, адзенне, непасрэдна накіраваныя на падтрымку базавых патрэб людзей. Нягледзячы на прыналежнасць кампанентаў да матэрыяльнай сферы, КЖ адлюстроўвае разнастайныя аспекты сацыяльнага жыцця і духоўнай культуры [1, с. 8 – 9]. Акрамя таго, аўтары канцэпцыі КЖ адзначалі, што яе даследаванне найбольш паспяхова можна рэалізаваць праз вывучэнне сялянскай грамады, бо менавіта вясковая лінія развіцця, у адрозненне ад гарадской культуры, больш-менш заставалася бесперапыннай, а вёска з'яўлялася носьбітам традыцый народнай культуры [1, с. 10].

Праблематыка КЖ найбольш рэпрезентатыўна прадстаўлена даследаваннямі расійскіх навукоўцаў, якія стаяць на пазіцыях, што тэорыя пра культуру жыццезабеспячэння лагічная і адкрытая для развіцця, паколькі вылучэнне і вывучэнне жыццядзейнасці ўяўляецца перспектыўным ракурсам разгляду этнічных культур [2, с. 15]. У сучасных даследаваннях тэрмін «культура жыццезабеспячэння» трансфармуецца, яго прадметна-аб'ектная вобласць пашыраецца за кошт далучэння сюжэтаўпра выпрацаваны сялянствам механізм пераадольвання цяжкасцей ва ўмовах зменаў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага ладу, пра псіхалагічны мікраклімат і сістэму каштоўнасцей у вясковай грамадзе. Гэта адбываецца пад уплывам змены даследчых парадыгмаў, актуалізацыі антрапалагічнага падыходу, калі ўзмацняецца ўвага да сялянскай ментальнасці, механізмаў дзейнасці і фактараў, што ўплываюць на гаспадарчую і духоўную актыўнасць [2, с. 17]. Антрапалагічныя тэарэтычныя канструкцыі, якія ўдала ўпісваюцца ў КЖ і дазваляюць абнавіць ракурс даследавання, акрэслены ў працы Н. Казловай, дзе сялянская грамада апісана з пункту гледжання «сялянскай цывілізацыі» [3].

Абнаўленне метадаў даследавання і наяўнасць значнага аб'ёму назапашаных крыніц дазваляе па-іншаму паглядзець на гісторыю вёскі, асабліва ў крызісныя і пераходныя перыяды, калі найбольш яскрава праяўляліся змены традыцый, што склаліся ў іншых гістарычных умовах; праблемы пераемнасці паўсядзённых сацыяльных, культурных, эканамічных практык і іх роля ў выжыванні насельніцтва ў неспрыяльны час. З гэтага пункту гледжання лагічным падаецца вылучэнне асобнай даследчай праблемы, а менавітакультуры жыццезабеспячэння беларускай вёскі ў аднаўленчы перыяд пасля Вялікай Айчыннай вайны – складаны і драматычны час у этнічнай гісторыі беларусаў. Беларуская вёска знаходзілася ў цяжкім стане, і аднаўленчыя працэсы расцягнуліся амаль на дзесяцігоддзе з моманту вызвалення рэспублікі ад нацыстаў. Нягледзячы на

адносна невялікія храналагічныя межы, гэта быў шмат у чым вырашальны час у гісторыі, звязаны з сацыякультурнай і эканамічнай трансфармацыяй. Для ўсходніх раёнаў Беларусі гэта перыяд пасляваеннага аднаўлення сельскай гаспадаркі і калгаснай сістэмы, для заходніх – паступовая ліквідацыя аднаасобных гаспадарак і пераход да прымусовай калектывізацыі ў канцы 1940-х гадоў, што суправаджалася разбурэннем традыцыйнага сялянскага ладу жыцця. У цэнтры гэтых падзей знаходзіўся чалавек,які спрабаваў адаптавацца да складаных, а іншы раз экстрэмальных умоў, рэалізаваць увесь свой патэнцыял дзеля выжывання і стварэння прымальнай жыццёвай сітуацыі для сябе і ўласнай сям'і. У гэтым рэчышчы перспектыўным з'яўляецца ракурс разгляду культуры жыццезабеспячэння праз вывучэнне не толькі класічных кампанентаў(жыллёва-пасяленчы комплекс, адзенне і сістэма харчавання), але і стратэгій і практык жыццядзейнасці.

У айчыннай гістарычнай навуцы праблематыка жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі не вылучалася ў асобную даследчую праблему, але, улічваючы досыць шырокую аб'ектна-прадметную вобласць КЖ, пэўныя тэмы знайшлі навуковае асэнсаванне ў працах гісторыкаў і этнолагаў. Прычым у гістарыяграфічны блок неабходна ўключыць і даследаванні этнографаў канца XIX – 1-й трэці XX ст. (М. Нікіфароўскі, Ч. Пяткевіч і інш.) [4 – 6]. У іх працах утрымліваецца багаты этнаграфічны матэрыял (з улікам гісторыка-культурных асаблівасцяў рэгіёнаў Беларусі) пра гаспадарчыя заняткі і побыт вяскоўцаў, без уліку якіх немагчыма даследаваць праблему пераемнасці пэўных паўсядзённых практык жыццядзейнасці і жыццезабеспячэння, што рэалізуюцца этнасам, як толькі падыходзіць крызісны час. Напрыклад, яшчэ ў канцы XIX ст., даследуючы сацыякультурны ландшафт Беларускага Падзвіння, М. Я. Нікіфароўскі сярод іншага вызначыў феномен жабрацтва, прааналізаваў яго прыроду і вылучыў катэгорыі жабракоў. Сучасныя палявыя матэрыялы пра пасляваеннае жабрацтва сведчаць пра пераемнасць мадэляў паводзін, прынятых у субкультуры дарэвалюцыйных жабракоў, і ўзнаўленне традыцый этнічнага вопыту выжывання ў неспрыяльных умовах.

Карыснымі пры разглядзе пасляваеннай КЖ беларускай вёскі з'яўляюцца этнаграфічныя даследаванні савецкага часу. Пад уплывам ідэалогіі марксізму, калі матэрыяльная культура лічылася базісам, а духоўная – надбудовай, даследаванне першага кампанента набывало мэтанакіраваны і сістэмны характар. У гэты час з'яўляюцца грунтоўныя працы, прысвечаныя

народнай архітэктуры, рамёствам і промыслам, народнаму тэкстылю і адзенню. Нягледзячы на тое, што іншы раз храналагічныя межы не адпавядаюць пасляваеннаму аднаўленчаму перыяду, даследаванні даюць уяўленне пра ўстойлівыя формы і рэгіянальную спецыфіку даваеннай матэрыяльнай культуры, пра тэхніку земляробства, адзенне і сістэму ежы (напрыклад, манаграфія Л. А. Малчанавай «Матэрыяльная культура беларусаў», 1968 г.). Гэтая інфармацыя дае магчымасць прасачыць аднаўленне ці паступовую змену традыцый у матэрыяльнай культуры вяскоўцаў. Карыснай з пункту гледжання даследавання ўмоў жыцця вясковай грамады ў экстрэмальны час, у тым ліку і ў першыя гады пасля вызвалення, з'яўляецца манаграфія А. І. Залескага «Быт беларускіх сялян у партызанскім краі» [7]. Аўтар падрабязна разгледзеў праблему аднаўлення жылля ў пацярпелых ад карнікаў вёсках, асаблівая ўвага нададзена працэсу будаўніцтва зямлянак і паўзямлянак, знешняму выгляду і ўнутранаму ўбранню жылля.

Вялікае значэнне для даследавання КЖ беларускай вёскі ў пасляваенны аднаўленчы перыяд маюць апублікаваныя вынікі ўнікальнай этнаграфічнай экспедыцыі, якая адбылася ў пачатку 1950-х гадоў [8]. У якасці аб'екта этнаграфічнага вывучэння быў узяты эканамічна моцны калгас «Бальшавік» Паселіцкага сельсавета Хойніцкага раёна былой Палескай вобласці. У яго вёсках на працягу звыш шасці месяцаў ажыццяўлялася назіранне (у розныя сельскагаспадарчыя сезоны) за штодзённасцю калгаснага сялянства [8, с. 7]. Стацыянарны характар экспедыцыі дазволіў зафіксаваць інфармацыю пра ўзровень жыцця, сабраць даныя пра матэрыяльны дабрабыт, сямейны стан і культуру сялян, шмат увагі было нададзена характарыстыцы калгаснага ладу і зменам вытворчага быту калгаснікаў. Высновы этнаграфічных назіранняў датычыліся вызначэння матэрыяльнай і харчовай забяспечанасці калгаснага сялянства, уплыву на дабрабыт колькаснага складу сям'і пры калгасным ладзе, структуры даходаў, змяненняў планіроўкі сядзібы і двара калгасніка, ступені выкарыстання традыцыйнага саматканага адзення, мадыфікацыі гігіенічных навыкаў. Акцэнты ў выніковай надрукаванай справаздачы былі зроблены ў кантэксце ідэалогіі таго часу, аднак фактычны матэрыял і пэўныя высновы да сённяшняга часу не страцілі сваёй актуальнасці.

Падсумоўваючы наяўныя народазнаўчыя даследаванні, адзначым, што навукоўцы разглядалі пасляваенную вясковую рэчаіснасць пераважна як складовую частку пэўнага прадмета даследавання, у кантэксце трансфармацыі сацыяльна-бытавых умоў жыцця, асвятлення традыцыйнай

матэрыяльнай беларускай культуры [9], традыцый харчавання [10; 11], культуры жывёлагадоўлі беларусаў, традыцыйных уяўленняў аб раслінным свеце [12; 13] і іншага. Гэта датычыць і комплекснага шматтомнага выдання «Беларусы», дзе ў гістарычнай рэтраспекцыі, пераважна на падставе матэрыялаў XIX – XX стст., разглядаецца, напрыклад, дынаміка развіцця промыслаў, а таксама падкрэсліваецца роля этнічнага вопыту, які перыядычна актуалізуецца ў неспрыяльныя эканамічныя перыяды [14].

Што датычыць даследаванняў па айчыннай гісторыі, то, калі аналізаваўсяперыяд пасляваеннага аднаўлення беларускай вёскі, вылучаліся толькі асобныя аспекты, пераважна ў межах вывучэння савецкай аграрнай і сацыяльнай палітыкі. Агульным недахопам з'яўлялася аднабаковасць пры адборы фактаў, а дакументы, якія маглі парушыць прынятую карціну свету, не разглядаліся ці ігнараваліся. Аднак пэўная колькасць прац, прысвечаных развіццю аграрнага сектара, якая выйшла ў савецкі час, нягледзячы на ідэалагічны складнік, не страціла сваёй актуальнасці. Сярод іх вылучаецца манаграфія А. П. Белязо «Беларуская вёска ў пасляваеныя гады (1945 – 1950)» [15]. Аўтар прааналізаваў стан і аднаўленчыя працэсы беларускай пасляваеннай вёскі праз прызму арганізацыі калгаснай вытворчасці ва ўсходніх і цэнтральных абласцях і калектывізацыі аднаасобных гаспадарак у заходніх абласцях рэспублікі. У навуковы зварот уведзена значная колькасць каштоўных архіўных дакументаў, якія сведчаць пра гаротны стан пасляваеннай вёскі; на канкрэтным дакументальным матэрыяле паказана, што на фоне цяжкага матэрыяльна-бытавога становішча «ў жыццё беларускай вёскі таго часу, здавалася, вярнулася далёкае мінулае. Сялянства зноў вымушана было карыстацца такімі прадметамі, як рагаціна і лучына» [15, с. 18]. Для рэканструкцыі вобраза пасляваеннай вёскі аўтар выкарыстаў апублікаваныя на той час успаміны сведкаў падзей, якія дэманстравалі цяжкасці вясковай рэчаіснасці. Аднак разам з тым у манаграфіі на першы план, як адзначыў і сам А. П. Белязо, выходзяць перш за ўсё пытанні, звязаныя з раскрыццём «дзейнасці партыі і ўрада ў вёсцы, канкрэтных мер па аднаўленню калгасаў, МТС» і г. д. Паўсядзённасць уласна вясковай грамады, стратэгіі і адаптыўныя практыкі будзённага жыцця ў тагачасных эканамічных умовах засталіся па-за ўвагай, што было абумоўлена падыходамі, прынятымі ў гістарычнай навуцы.

На сучасным этапе развіцця айчыннай гісторыі адбываецца змена даследчых парадыгм і інстытуалізацыя новых накірункаў: мікрагісторыя, гісторыя паўсядзённасці, гістарычная і эканамічная антрапалогія. Увагу

5. Шарая, В. М. Семантыка абраду «ваджэнне Куста» / В. М. Шарая // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 1996. – № 4. – С. 69 – 76.

6. Шарая, В. М. Ушанаванне продкаў у традыцыйнай культуры: семантыка, аксіялогія, трансфармацыя : аўтарэф. дыс. … д-ра філал. навук : 10.01.09 / В. М. Шарая ; НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск, 2002. – 38 с.

7. Шарая, О. Н. Ценностно-нормативная природа почитания предков / О. Н. Шарая. – Минск : Технология, 2002. – 249 с.

8. Шарая, В. М. Традыцыйны каляндарны абрад: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты даследавання / В. М. Шарая // Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай стагоддзю з дня нараджэння акадэміка П. Ф. Глебкі / рэдкал.: П. Г. Нікіценка [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 31 – 36.

9. Шарая, В. М. Родавая свядомасць у традыцыйнай духоўнай культуры народаў Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы / В. М. Шарая // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка : XIV Міжнар. з’езд славістаў, Охрыд, 2008 г. : даклады беларускай дэлегацыі / НАН Беларусі ; Беларускі камітэт славістаў. – Мінск, 2008. – С. 321 – 334.

10. Шарая, В. Каляндарныя абрады ўшанавання продкаў у традыцыйнай культуры беларусаў: праблемы і перспектывы даследавання / В. Шарая // Acta Albaruthenica. – Warszawa, 2018. – T. 18. – S. 317–332.

11. Шарая, О. Н. Рождественско-новогодняя празднично-обрядовая традиция белорусов в научных работах XIX – XX вв. / О. Н. Шарая // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. / гал. рэд. А. І. Лакотка ; НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. – Мінск, 2021. – Вып. 2. – С. 577 – 581.

12. Шарая, О. Н. Теоретико-методологические проблемы изучения празднично-обрядовой традиции белорусов в условиях культурных изменений / О. Н. Шарая // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2021. – Вып. 29. – С. 450 – 456.

РЕЗЮМЕ

В статье представлен анализ традиционной семейной религиозности белорусов. Особенности традиционной семейной религиозности белорусов рассмотрены в контексте таких календарных празднично-обрядовых комплексов, как Рождество и Троица, а также на примере локальных архаических календарных обрядовых практик. Показано, что семейная религиозность в традиционной культуре белорусов имела синкретический характер.

SUMMARY

Traditional family religiosity of Belarusians is analyzed in the paper. Several features of the Belarusian’s traditional family religiosity are considered in the context of such calendar festive and ritual complexes as Christmas and the Trinity, as well as on the example of local archaic calendar ritual practices. It is shown that family religiosity in the traditional culture of Belarusians had a syncretic character.

*Шэвердак Д. С.*

# БЕЛАРУСКІ ТРАДЫЦЫЙНЫ КІРМАШ: ГІСТОРЫЯ ЭТНАГРАФІЧНАГА ВЫВУЧЭННЯ 2-Й ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*(Паступіў у рэдакцыю 14.03.2022)*

У айчыннай гістарыяграфіі 2-й паловы XIX – пачатку XX ст. беларускі кірмаш як асобная навуковая праблема даследавання не вылучаўся.

У дадзеным артыкуле аналізуюцца працы, у якіх змешчаны апісанні беларускіх кірмашоў 2-й паловы XIX – пачатку XX ст., што будзе карысным даследчыку пры вывучэнні дадзенай праблемы.

Усе звесткі, якія датычацца беларускіх кірмашоў, умоўна можна падзяліць на некалькі тэматычных груп. Да першай групы адносяцца статыстычныя даныя, якія змяшчаюць інфармацыю аб колькасці кірмашоў у год па асобных паветах, губернях, звесткі аб грашовым абарачэнні кірмашоў, спецыялізацыі таргоў (прадукцыі на продаж). Да другой групы належаць звесткі аб удзельніках кірмашоў – іх нацыянальнай прыналежнасці і побыце, удзеле ў кірмашовым асяроддзі. У трэцюю групу ўключана інфармацыя аб гульнёва-забаўнай праграме кірмашоў: кірмашовым тэатры, забавах і іншым.

Найбольш аб'ёмнай з'яўляецца першая група (статыстычныя матэрыялы), якая сфарміравалася як вынік дзейнасці губернскіх статыстычных камітэтаў, што амаль кожны год друкавалі «Памятные книжки» па кожнай губерні. Аўтары пры падачы інфармацыі пра прадстаўнікоў розных этнічных груп Беларусі (у першую чаргу яўрэяў і цыганоў), амаль заўсёды ўзгадвалі кірмашы як адно з месцаў іх прафесійнай дзейнасці.

У 1853 – 1855 гг. выйшла серыя нарысаў П. М. Шпілеўскага «Путешествие по Полесью и Белорусскому краю» [13], дзе разгледжана гісторыя, геаграфія, сучаснае на той момант жыццё беларускага селяніна. Галоўнае месца займаюць сведчанні, якія П. М. Шпілеўскі самастойна збіраў ці назіраў падчас свайго падарожжа. Гэта звесткі аб кірмашах і архітэктуры мястэчак і гарадоў, іх насельніцтве, жыллі і вядзенні сельскай гаспадаркі сялян, хваробах і клопатах і іншае. Так, аўтар маляўніча апавядаў аб Міхайлаўскім кірмашы ў Нясвіжы, яго ўдзельніках (адкуль і хто прыехаў), таварах, якімі гандлявалі, асобная ўвага надавалася забаўным дзеям, галоўнымі асобамі якіх з'яўляліся цыганы. П. М. Шпілеўскі таксама ўзгвадваў Мікалаеўскія кірмашы ў Міры, адметнымі асаблівасцямі якіх называў тое, што асноўнымі

гандлярамі з'яўляліся цыганы, а таварам – коні. У нарысе, прысвечаным Мінскай губерні, аўтар падрабязна апісаў гарадскія кірмашы-«кантракты»: геаграфію ўдзельнікаў, пералік тавараў, баўленне часу (карнавал, тэатр, выступленні артыстаў). Апошнімі кірмашамі, якія апісваў П. М. Шпілеўскі, з'яўляліся барысаўскія. Аўтар даў пералік асноўных тавараў, удзельнікаў, прааналізаваў уплыў яўрэяў на кірмашовы гандаль у Барысаве, вызначыў асаблівасць аднаго з кірмашоў – гандаль коньмі, што прадугледжваў удзел розных слаёў насельніцтва.

«Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» – праца беларускага публіцыста і этнографа У. Сыракомлі, выдадзеная ў 1853 г. [12]. Аўтар ўзгадаў кірмаш у Нясвіжы, даў інфармацыю аб нацыянальным складзе ўдзельнікаў: «Наплыў людзей розных класаў і краёў, змяшанне, як у той Вавілонскай вежы, моў, крыкі і абрыўкі фраз на розных мовах – яўрэйскай, нямецкай, польскай, рускай і кухоннай французскай, гукі арганіка, спеў жабракоў, цыгарэтны дым – усё, як на кожным нашым кірмашы» [12, с. 82]. У. Сыракомля вылучыў характэрную рысу кірмашу ў Нясвіжы – гэта магчымасць убачыць палешукоў, якія прыкметна адрозніваліся ад мясцовага насельніцтва. Далей аўтар узгадаў два кірмашы ў Койданава, а затым паспрабаваў растлумачыць прычыну іх заняпаду. Павелічэнне колькасці яўрэйскага насельніцтва, што прывяло да з'яўлення новых крам, амаль знішчыла кірмашовы гандаль у мястэчку.

У 1854 г. выйшаў другі выпуск «Этнографического сборника Императорского Русского географического общества». У ім змешчаны артыкул «Быт белорусских крестьян» М. Анімеле [2]. На працягу некалькі гадоў ён збіраў этнаграфічныя звесткі аб побыце беларускіх сялян Себежскага павета (зараз частка Віцебскай вобласці). М. Анімеле падрабязна апісаў, як праходзілі «ярмонкі» на гэтай тэрыторыі: у якіх месцах і чаму ладзілі кірмашы; якія тавары набывалі мужчыны і жанчыны; як музыканты забаўлялі публіку; якія гульні сустракаліся на мясцовых кірмашах, дзеля чаго маладыя дзяўчаты і іх маці, а таксама хлопцы наведвалі кірмашы; якія дробныя злачынствы адбываліся падчас гулянняў. Дадзены артыкул з'яўляецца адным з найбольш каштоўных з-за колькасці і якасці інфармацыі адносна беларускіх кірмашоў.

Беларускім землям прысвечана праца М. В. Без-Карніловіча «Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся», надрукаваная ў 1855 г. [3]. Аўтар узгадаў найбольш буйныя населеныя месцы Беларусі. М. В. Без-

Карніловіч у шэрагу выпадкаў пры апісанні населеных пунктаў прыводзіў звесткі аб наяўных кірмашах, часе іх правядзення, асноўных таварах. Пры разглядзе этнічных груп, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі, аўтар апісаў іх асноўныя заняткі. Так, у яўрэяў гэта гандаль, у тым ліку на кірмашы, а ў цыганоў прафесійнай дзейнасцю з'яўлялася варажба, гандаль коньмі, музычныя і танцавальныя выступленні і іншае.

Сведчанні адносна забаўнай праграмы кірмашоў змешчаны ў артыкуле А. Кіркора «Этнографический взгляд на Виленскую губернию», надрукаваным ў «Этнографическом сборнике Императорского Русского географического общества» ў 1858 г. [4]. Аўтар разгледзеў гульні і забавы розных узроставых груп, якія сустракаліся на мясцовых кірмашах.

Шэраг прац быў падрыхтаваны А. М. Семянтоўскім. У 1862 г. выйшла «Статистическое описание Витебской губернии в лесном отношении, составленное и. д. витебского губернского лесничего, капитаном Сементовским» [10], дзе змешчаны пералік тавараў дрэваапрацоўкі, якія прызначаліся для продажу на кірмашах. У 1872 г. была надрукавана кніга А. М. Семянтоўскага «Этнографический обзор Витебской губернии» [11]. Аўтар апісаў асноўныя заняткі цыган на кірмашах, а таксама прааналізаваў ролю яўрэяў у кірмашовым гандлі Віцебскай губерні.

У 1867 г. убачыла свет праца «Памятная книжка Витебской губернии на 1867 г.» [8]. У статыстычным раздзеле змешчаны артыкул А. М. Семянтоўскага «О ярмарках в Витебской губернии», у якім аўтар разгледзеў гісторыю паходжання і ўзнікнення кірмашоў на тэрыторыі Беларусі. А. М. Семянтоўскі ўпершыню даў вызначэнне паняццю «кірмаш» – «храмовый праздник», а таксама паспрабаваў ацаніць уплыў кірмашоў на народную маральнасць. У артыкуле асобна па кожным павеце Віцебскай губерні прадстаўлены падрабазныя звесткі аб месцах і часе правядзення кірмашоў, галоўныя прадметы гандлю, грашовае абарачэнне. У этнаграфічным раздзеле размешчаны артыкул Ф. Сярэбранікава «О народных праздниках Себежского уезда», дзе разглядаюцца асноўныя народныя святы, у тым ліку і кірмашы беларусаў Віцебшчыны. Аўтар апісаў тавары, найбольш папулярныя сярод сялян Себежскага павета, пастаянных удзельнікаў кірмашоў – цыганоў – і іх дзейнасць у кірмашовым ассяроддзі. Асобная ўвага нададзена жабракам, прыведзены тэксты іх малітваў.

Ю. Ф. Крачкоўскі ў 1874 г. падрыхтаваў да друку «Быт западно-русского селянина» [5], у якой на падставе палявых матэрыялаў усебакова разгледжана жыццё беларусаў, у тым ліку і кірмашовыя святы. Так,

Ю. Ф. Крачкоўскі апісаў кірмаш у Дзісенскім павеце Віцебскай губерні: як быў арганізаваны сялянскі быт падчас кірмашу, хто прыязджаў і чым гандлявалі, што куплялі і іншае.

Пад рэдакцыяй А. С. Дэмбавецкага ў 1882 г. выходзіць праца «Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях...» [7]. У этнаграфічным раздзеле размешчаны песні сялян, якія выконваліся падчас кірмашоў. Таксама аўтар узгадаў стараверaў і цыганоў, якія прымалі актыўны ўдзел у кірмашовых дзеях.

З 1892 г. пачала выходзіць серыя нарысаў беларускага этнографа і фалькларыста М. Я. Нікіфароўскага «Очерки Витебской Белоруссии» [6]. У першым нарысе «Старцы» аўтар даў апісанне такой з'явы, як жабрацтва. Асаблівую каштоўнасць мае інфармацыя аб «кірмашовых старцах» – людзях, якія жабравалі толькі на кірмашах. Акрамя агульных звестак аб быце жабракоў і формах жабрацтва, у нарысе аўтар прывёў яскравае апісанне «хожалого старца» Сумона-сляпея, а таксама апублікаваў рэдкія ўзоры жабрацкіх песен. На прыкладзе Сумона можна даведацца аб быце «кірмашовых старцаў» па-за кірмашовымі святамі, як праходзіў працэс выпрошвання міласціны, як ставіліся да жабракоў у сялянскім грамадстве, якія ўзаемаадносіны былі у іх паміж сабой. Апавяданне пра вандроўкі і побыт гэтага жабрака дае магчымасць даследчыку скласці агульную карціну жыцця і дзейнасці беларускіх кірмашовых жабракоў. Каштоўным з'яўляецца таксама нарыс «Дударь и скрипач», дзе М. Я. Нікіфароўскі апісвае не толькі сам інструмент і спосаб яго вырабу, але і дзейнасць прафесійных дудароў і музыкантаў падчас кірмашоў. Прыводзіцца падрабязная інфармацыя, як і чым плацілі музыкам за іх выступленні, разгледжаны паводзіны дудароў і скрыпачоў у кірмашовым ассяроддзі. У нарысе «Питущие и пропойцы» змешчаны звесткі пра баўленне часу ў карчме падчас кірмашу.

У 1907 г. убачыла свет праца этнографа і краязнаўца К. Ц. Анікіевіча «Сенненский уезд Могилёвской губернии» [1]. Дадзеная кніга не змяшчае падрабязнай інфармацыі па арганізацыі і правядзенні кірмашоў, але аўтар пры апісанні этнічных груп, якія пражывалі на тэрыторыі Сенненскага павета, даў звесткі аб удзеле цыганоў у кірмашах. К. Ц. Анікіевіч апісаў асноўныя заняткі жанчын (варажбу па руцэ і на картах, выпрошванне міласціны) і мужчын (гандаль коньмі, лекаванне коней і знахарства). У

раздзеле, дзе апісваюцца асноўныя населеныя пункты павета, прыводзяцца звесткі па колькасці і часе правядзення кірмашоў у гэтых мясцінах.

Такім чынам, асобных прац, прысвечаных кірмашам, у гістарыяграфіі 2-й паловы XIX – пачатку XX ст., у тым ліку беларускай, не існавала. Асобныя тэмы разглядаліся фрагментарна, без паглыблення ў праблему. Найбольш распрацаваным з'яўляецца статыстычны падыход, аднак для асэнсавання феномена беларускага традыцыйнага кірмашу і разгляду яго эвалюцыі наяўных прац недастаткова, што робіць дадзеную тэму актуальнай для будучых даследаванняў.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Аникиевич, К. Т. Сенненский уезд Могилёвской губернии: опыт описания в географическом, историческом, этнографическом, бытовом, промышленном и статистическом отношениях, с картой уезда, схемой двух озер и рисунками в тексте / К. Т. Аникиевич. – Могилёв : Изд. Могилёвского губернского статистического комитета, 1907. – 148 с.
2. Анимелле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимелле // Этнографический сборник Императорского Русского географического общества. – СПб., 1854. – Вып. 2. – С. 111 – 268.
3. Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся / М. О. Без-Корнилович. – СПб. : Тип. III отделения Собственной Е. И. В. Канцелярии, 1855. – 355 с.
4. Киркор, А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию / А. Киркор // Этнографический сборник Императорского Русского географического общества. – СПб., 1858. – Вып. 3. – С. 115 – 276.
5. Крачковский Ю.Ф. Быт западно-русского селянина / Ю. Ф. Крачковский. – М. : Изд-во Имп. общ-ва истории древностей России при Московском ун-те, 1874. – 212 с.
6. Никифоровский, Н. Я. Очерки Витебской Белорусии / Н. Я. Никифоровский ; авт. предисл., сост. А. П. Ващенко. – Минск : Беларусь, 2019. – 271 с.
7. Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях... : в 3 кн. / под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилёв-на-Днепре : Тип. Губернского правления, 1882. – Кн. 1. – 784 с.
8. Памятная книжка Витебской губернии на 1867 год / Витебский губернский статистический комитет. – Витебск : Тип. К. Вульфа, 1867. – 457 с.
9. Романов, Е. Р. Общий очерк Витебской губернии. Оттиски из Памятной книжки Витебской губернии на 1898 год / Е. Р. Романов. – Витебск : Губернская тип., 1898. – 308 с.

10. Сементовский, А. М. Статистическое описание Витебской губернии в лесном отношении / А. М. Сементовский. – СПб. : Тип. т-ва «Общественная польза», 1862. – 104 с.

11. Сементовский, А. М. Этнографический обзор Витебской губернии / А. М. Сементовский. – СПб. : Тип. М. Хана, 1872. – 69 с.

12. Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў / У. Сыракомля. – Мінск : Полымя, 1992. – 159 с.

13. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск : Полымя, 1992. – 250 с.

РЕЗЮМЕ

В статье исследуется история изучения белорусских традиционных ярмарок 2-й половины XIX – начала XX в. Автором проанализированы работы, в которых есть сведения по данной проблеме, определена степень её изученности.

SUMMARY

The article examines the history of the study of Belarusian traditional fairs of the second half of the XIX – early XX centuries. The author of the article has studied the publications which contain the information on this issue, as well as has determined the degree of study of the theme based on the analysis.

# РАЗДЗЕЛ IV
# ПРАБЛЕМЫ ЗАХАВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

***Барвенава Г. А.***

## РЭЧЫ З МАЁНТКА АНЕЛІН КАЛЯ БЫХАВА Ў ЭТНАГРАФІЧНЫМ МУЗЕІ Ў ПОЗНАНІ

*Нацыянальны музей у Познані*

*(Паступіў у рэдакцыю 04.03.2022)*

У Нацыянальным музеі ў Познані, у яго аддзеле «Этнаграфічны музей» (Muzeum Etnograficzne Oddział Muzeum Narodowego w Poznaniu), захоўваюцца калекцыі рэчаў з усіх куткоў Еўропы, а таксама з Афрыкі, Азіі, Амерыкі, Аўстраліі і Новай Гвінеі [4].

У розных месцах Еўропы цікавасць да этнаграфіі, этнаграфічных рэчаў, утварэнне прыватных калекцый і музейных збораў актывізаваліся ў канцы XIX – пачатку XX ст. Нагадаем зборы Івана і Антона Луцкевічаў (Віленскі музей старажытнасцяў, 1855 г.), працу ў пачатку XX ст. Вацлава Ластоўскага і іншых супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага музея, Інстытута беларускай культуры, Беларускай акадэміі навук і многіх іншых рупліўцаў Беларусі і беларускага мастацтва. У той самы час на тэрыторыі Вялікапольсцы, у Познані, дзве жанчыны, Гелена Ціховіч (Helena Cichowicz) і яе дачка Веслава (Wiesława), актыўна заняліся камплектаваннем этнаграфічных збораў. Яны аб’ехалі бліжэйшыя вёскі і за ўласныя грошы набылі сотні рэчаў. Жанчыны былі аднымі з заснавальніц Этналагічнага таварыства (Towarzystwa Ludoznawczego), утворанага ў Познані ў 1910 г., а Гелена Ціховіч стала яго прэзідэнтам. Апантанасць і запал Гелены і Веславы Ціховіч паспрыялі таму, што ўсяго праз год пасля іх актыўных экспедыцый, 28 снежня 1911 г., была адкрыта першая этнаграфічная выстаўка ў сядзібе Таварыства сяброў навук у Познані (Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Poznaniu), дзе прадставілі 800 аб’ектаў. У 1920 г. гэты этнаграфічны збор перадалі Вялікапольскаму музею (цяпер Нацыянальны музей у Познані), пры якім быў створаны аддзел этналогіі [5, s. 23 – 30]. Для параўнання: Іван Луцкевіч падараваў сваю багатую прыватную калекцыю Беларускаму навуковаму таварыству, а яго брат Антон Луцкевіч разам з іншымі яе сістэматызаваў, узбагаціў і ператварыў у Беларускі музей.

Калекцыя рэчаў з Беларусі з’явілася ў Этнаграфічным музеі ў Познані дзякуючы эмігрантам, якія прыехалі ў Польшчу ў розныя перыяды [1; 2].

Сярод прадметаў беларускай калекцыі ёсць рэчы, вывезеныя з Беларусі падчас адной з першых эміграцый пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Уладальнікі маёнткаў выязджалі, пакідаючы свае землі, дамы і набыткі, забіраючы з сабой толькі неабходныя прадметы. Так выехалі гаспадары і некаторыя з сялян з маёнтка Анелін у Быхаўскім раёне Магілёўскай вобласці. Да першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. зямельная ўласнасць у Анэліне ўваходзіла ў склад маёнткаў князёў Сапегаў. У канцы XVIII ст. Анелін перайшоў ва ўласнасць роду Выкоўскіх (Wykowskich) герба «Ястшэмбец» (Jastrzębiec) [3, s. 181 – 182]. На працягу стагоддзя ўладальнікамі Анеліна быў Людвік Выкоўскі, затым яго брат Мечыслаў, пасля – Аляксандр Выкоўскі, а затым яго сын Станіслаў. Апошнім уладальнікам маёмасці, якая налічвала каля 2 000 дзесяцін зямлі, сядзібны дом, флігелі, стайні, адрыны і іншыя пабудовы, да 1917 г. быў Людвік Выкоўскі.

Сядзібны дом у Анеліне ў пачатку XIX ст. пабудаваў Аляксандр Выкоўскі. Дом быў на высокім падмурку, двухпавярховы, з трыма порцікамі, сярэдні з якіх меў чатыры калоны, на якія абапіраўся франтон з фамільным гербам. Станіслаў дабудаваў два флігелі з порцікамі, кожны з якіх меў па дзве калоны, што падтрымлівалі трохвугольны франтон. На супрацьлеглым баку цэнтральнага ганка знаходзілася садовая тэраса, абнесеная парэнчамі. Дом меў каля 20 пакояў, цэнтральным з якіх з'яўляўся вялікі пярэдні пакой і гасцёўня з відам на сад. У сядзібе Выкоўскіх была багатая бібліятэка – каля 3 000 тамоў, вялікая энтамалагічная калекцыя матылькоў, жукоў і іншых, якая налічвала каля 10 000 насякомых, нумізматычная калекцыя складалася з 746 прадметаў. Да сядзібы вялі алеі і дарогі, абсаджаныя ліпавымі дрэвамі і арэшнікам. Апісаны сядзібны дом роду Выкоўскіх быў знішчаны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Як выглядаў маёнтак у Анеліне, зафіксавана ў працы Рамана Афтаназі (малюнак 1) [3].

Малюнак 1. Анелін. Сядзіба Выкоўскіх (каля 1800-х гг.). Фота з кнігі Р. Афтаназі, 1914 г.

У калекцыі Этнаграфічнага музея ў Познані знаходзіцца 4 рэчы з апісанага маёнтка роду Выкоўскіх ў Анеліне. Усе рэчы зроблены ў канцы XIX –

пачатку XX ст. Іх забралі з сабой уладальнікі або дзяржаўцы маёнтка Анелін Станіслаў (III) Шалкоўскі, сын Антонія (нар. у 1867 г.) і яго жонка Станіслава, у дзявоцтве Выкоўская. Пасля Другой сусветнай вайны гэтыя рэчы, разам з іншымі сямейнымі рэліквіямі, былі прывезены пад Познань, у мястэчка Віхровэ Взгужэ (os. Wichrowe Wzgórze), а затым, у 2007 і 2011 гг., падараваны ўнучкай Шалкоўскіх Ядвігай Шалкоўскай-Маліньскай (Jadwiga Szołkowska-Malińska) у калекцыю Этнаграфічнага музея ў Познані.

Малюнак 2. Ігольнік. Анелін, Беларусь, да 1917 г. Нацыянальны музей у Познані, MNP Eu 7763/1-2. Фота Э. Сабяк

Сярод рэчаў у калекцыі Музея захоўваецца ўнікальны экспанат, твор дэкаратыўна-прыкладнога беларускага мастацтва – ігольнік (малюнак 2). Такія багата аздобленыя футаралы для іголак, шыдэлкаў, англійскіх шпілек для вышыўкі і іншых прылад рукадзелля выразалі майстры з косці, грушы, рабілі з бяросты, найбольш багатыя выконвалі са срэбра, залацілі. Дэкаратыўныя ігольнікі маглі быць жаданым падарункам ад жаніха сваёй абранай або падарункам на свята. Таму па дзвюх прычынах яны пераходзілі з пакалення ў пакаленне: як каштоўны твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і як памяць пра сямейную падзею.

Ігольнік, які захоўваецца ў музеі ў Познані, выкананы беларускім майстрам з бяросты, з усіх бакоў багата, тонка і па-майстэрску аздоблены разьбой і гравіроўкай, нягледзячы на малы памер футарала даўжынёй 7 см. Ігольнік быў створаны да 1917 г. у Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні. Дадзены мастацкі твор прэзентаваны, а магчыма, спецыяльна зроблены для выстаўкі традыцыйных беларускіх рамёстваў, арганізаванай падчас святкавання 100-годдзя смерці Тадэвуша Касцюшкі ў Быхаве 1 кастрычніка 1917 г. Выстаўку беларускіх рамёстваў курыравала жонка Станіслава (III) Шалкоўскага. Ігольнік экспанаваўся разам з «беларускімі саматканкамі» і іншымі мастацкімі вырабамі мясцовага насельніцтва. За арганізацыю гэтай выстаўкі Шалкоўскія атрымалі падзяку, дзе напісана: «Падзяка для сям’і Шалкоўскіх за

дэкарацыю месца пад беларускія даматканыя вырабы». Падзяку выказаў Д. Раманоўскі – «дэкаратар з Варшавы, спецыяльнасць “Дэкарацыя выставак”».

Свята падрабязна апісана ў дзённіку Станіслава (III) Шалкоўскага «Pamiętnik», 189 старонак, захоўваецца у архіве сям’і). У сувязі з тым, што захаваныя ўспаміны рэдкасць, працытуем фрагмент дзённіка з апісаннямі святкавання 100-годдзя смерці Тадэвуша Касцюшкі: «Надвор’е было цудоўнае, сонечнае, летняе (нягледзячы на тое, што некалькі папярэдніх дзён і начэй было холадна і ліў дождж, а ў астатнюю ноч была віхура з дажджом). А 10 раніцы адбылася імша ў касцёле, і ксёндз Мірскі агучыў вельмі добрае казанне. З абодвух бакоў вуліцы стаялі войскі легіёнаў польскіх ад касцёла да дома Кілесы, па дарозе на Новы Быхаў. Быў зроблены курган на беразе ракі за гарадскім шпіталем, высокі і акуратны.

Парадак шэсця наступны. Першым ехаў мой Стах на сваім Буланчыку ў чыста кракаўскім касцюме, за ім – штандары легіёнаў польскіх, захаваныя з 1863 года. Пасля вучні Быхава, скаўты магілёўскіх школ польскіх, гімназій Быхава абодвух палоў, пастаўленыя ў 8 шэрагаў, коннае войска і пешыя польскіх легіёнаў з музыкантамі. Шэсце было вельмі ўражальным і прыгожым, парадак і пабудова былі бездакорнымі, велізарная калона шэсця галава да галавы цягнулася не менш як на 2 вярсты, а яшчэ па баках ішлі гледачы і іншыя. Былі пабудаваны святочныя брамы. Калі шэсце прыйшло да кургана, на вяршыні насыпу перад абразом Маці Божай Чанстахоўскай 5 святароў правялі палявую імшу, былі там штандары і ветэраны паўстання 1963 года.

Сказаў слова Літвін Пан Юзэфовіч, усімі шанаваны <...> іграла падчас імшы музыка. Цэлае поле было ўсеяна людзьмі <...> а пры цудоўным ясным, цёплым дні гэта фантастычна выглядала. Пасля імшы людзі адпачывалі, публіка прагульвалася, коннае войска і пешыя легіёнаў (уланы) і хлопцы з татарскай зброяй. Сын мой з уланамі ехаў, а пасля яшчэ з пяхотай. Пасля гэтай цырымоніі быў абед на 2 000 чалавек, вельмі добра арганізаваны ў шатры і пад чыстым небам. З палявых катлоў раздавалі ўсім жадаючым смачны гарохавы суп і выдатны бігас. Было гэта ўсё кранальна, па-хатняму і прыемна ўражвала.

Пасля абеду з кургана прамаўляў простай мовай, вельмі шчыра, смела і сардэчна ветэран паўстання Пан Юзэфовіч, і афіцэр легіёна сказаў прамову. На вяршыні кургана пры захадзе сонца 4 трубачы-жаўнеры з трубамі, аздобленымі сцяжкамі з арламі, прыгожа сыгралі Хейнал.

Было так прыгожа і ўрачыста, што застанецца ва ўсіх у памяці на цэлае жыццё <…> Шэсце, бітва і ўся ўрачыстасць адбыліся надзвычай выдатна. Было шмат людзей з ваколіц, а таксама з Магілёва, Рагачова і іншых гарадоў і мястэчак. Маем прыгожую памяць – курган, толькі трэба яго належным чынам захаваць. Выдаткі на 1 кастрычніка: кніжкі пра Касцюшку – 2 рублі, 2 польскія арлы – 6 руб., 2 партрэты Касцюшкі – 6,5 руб., медалі 2 – 1,8 руб., медаль памятны свабоды польскай – 9,1 руб., тэатр і абед свята Касцюшкі – 14,6 руб., для адукацыі – 1 руб.».

Малюнак 3. Жаночая кашуля, Анелін, пачатак XX ст. Нацыянальны Музей у Познані, MNP Eu 7764. Фота Г. Барвенава, 2022 г.

Наступны рэдкі музейны прадмет з калекцыі рэчаў з Анеліна – бялізна. Жаночая кашуля пачатку XX ст. выканана з батысту, аздоблена фабрычнымі карункамі (малюнак 3). Гэтую кашулю, па ўспамінах Ядвігі Шалкоўскай-Маліньскай, зрабілабеларуская швачка для жонкі ўладальніка маёнтка ў Анеліна: «…сшыла краўцова для жонкі». Кашуля нагадвае сучаснае бодзі. З пункту гледжання выканання дадзеную рэч можна паставіць на адным узроўні з тым, што сёння называецца «высокай модай» і каштуе вельмі дорага. І гэта па дзвюх прычынах: па-першае, кашуля выканана з якаснага матэрыялу; па-другое, вельмі прафесійна пашыта. У яе прадуманы, выверанны крой, дасканалыя машынныя роўныя швы, усе павароты, карункі прышыты вельмі акуратна, па-майстэрску. Даўжыня кашулі – 61 см, шырыня ўверсе – 48 см, унізе па шырокім месцы – 77 см. Швы разам з карункамі шырынёй 1 см утвараюць лаканічны дэкор. На пярэдняй частцы кашулі карункі ўшыты паміж тканінай так, што ўтвараюць чатыры перакрыжаваныя паміж сабой

трохвугольнікі з бакамі 13, 15, 20 см. У прыполе кашулі па баках зроблены ўкосы па 13 см, уздоўж якіх выкананы аналагічны дэкор: паміж тканінай ушыты 2 паласы карункаў з адлегласцю паміж імі 1 см (1-1-1 см). Кашуля, як і сучаснае бодзі, загінаецца ўнізе і зашпільваецца на два гузікі, абцягнутыя ніткамі. Гузікі дыяметрам 0,6 см выкананы з косці і абшыты баваўнянымі ніткамі.

Малюнак 4.

Дзякуючы захаваным ігольніку і кашулі з маёнтка Анелін можна ўявіць, якія рэчы былі ў штодзённым ужытку і ў хатніх куфэрках, шафах беларускіх уладальнікаў, а таксама ацаніць высокае майстэрства беларускіх майстроў, якія выраблялі высокапрафесійныя рэчы. У прыватнай калекцыі аўтара артыкула захоўваюцца рэчы прабабулі Петрунелі Сільвестраўны Дабравольскай (пахавана ў Мінску на Кальварыйскіх могілках), сярод якіх таксама ніжнія кашулі, панталоны зімовыя і летнія, выкананыя з якасных батысту, ільну, аздобленыя прамысловымі карункамі (малюнак 4). Тэхніка і якасць іх выканання ідэнтычныя апісанаму прадмету з калекцыі Этнаграфічнага музея ў Познані. Гэта паказвае агульнае майстэрства беларускіх рамеснікаў, швачак канца XIX – пачатку XX ст., каштоўнасць і трываласць рэчаў.

Акрамя гэтага, выраб або паказ ужо выкананага ігольніка на выстаўцы беларускіх народных рамёстваў, якая была важнай часткай святкавання 100-годдзя смерці Тадэвуша Касцюшкі ярка дэманструе: 1) увагу ўладальнікаў маёнткаў у Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. да традыцыйнага беларускага мастацтва, гонар за майстэрства сялян; 2) разуменне ўладальнікамі маёнткаў, што «беларускія саматканкі» і іншыя мастацкія вырабы мясцовага насельніцтва з’яўляюцца творамі традыцыйнага

мастацтва, якія неабходна цаніць, збіраць, дэманстраваць; 3) зварот беларускай шляхты да традыцыйнага беларускага мастацтва як частка агульнаеўрапейскага працэсу ўвагі да традыцыйнага мастацтва; разуменне, што індустрыялізацыя паспрыяе знікненню «самадзялаў», неабходнасці іх збору і дэманстравання. Апошняе пацвярджае, што за арганізацыю выстаўкі шляхціцы Шалкоўскія атрымалі падзяку.

Наступныя дзве рэчы, якія паходзяць з Анеліна і сёння захоўваюцца ў Нацыянальным музеі ў Познані, кардынальна адрозніваюцца ад вышэйапісаных, бо належаць да традыцыйнага беларускага сялянскага строю. Унікальнасць ім надае тое, што яны былі выкананы ў канцы XIX ст., адпаведна маюць больш за 120 год. Кампаненты не кракаўскага касцюма, які названы ва ўспамінах уладальніка Анеліна, а традыцыйнага беларускага строю шляхціцы забралі з сабой, сто год захоўвалі, перадавалі з пакалення ў пакаленне як памяць пра Беларусь, а пасля ўнучка, разумеючы іх вартасць, перадала рэчы музею. Кампаненты беларускага традыцыйнага жаночага строю заслугоўваюць асобнай увагі, што будзе аб’ектам аналізу ў наступным артыкуле.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Вялікі, А. Беларусь – Польшча ў XX стагоддзі. Невядомая рэпатрыяцыя 1955 – 1959 гг. / А. Вялікі. – Мінск : БДПУ, 2007. – 271 с.
2. Документы из «Особой» папки НКВД: лимиты по расстрелам и высылкам [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://maidan.org.ua/2015/04/dokumentyi-yz-osoboj-papky-nkvd-lymytyi-po-rasstrelam-y-vyiselkam. – Дата доступа: 11.12.2021.
3. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej / R. Aftanazy. – Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1991. 2-e wyd. – T. 1. Województwa Mińskie, Mścisławskie, Połockie, Witebskie – 337 s.
4. Muzeum Etnograficzne w Poznaniu [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://www.facebook.com/muzeumetnograficznepoznan/. – Data dostępu: 12.12.2021.
5. Rzeczy mówią. 100 lat zbiorów etnograficznych w Poznanium / pod red. A. Skibińskiej. – Poznań : Muzeum Narodowe, 2012. – 232 s.



РЕЗЮМЕ

В статье проанализированы произведения белорусского декоративно-прикладного искусства конца XIX – начала XX в., которые сейчас хранятся в Национальном музее в Познани. Впервые представлены фрагменты воспоминаний владельца имения Анелин Станислава Шалковского, где описывается выставка народных мастеров, состоявшаяся в Быхове 1 октября 1917 г. Владельцы белорусских усадеб понимали ценность произведений традиционного белорусского искусства, организовывали их показ по праздникам, коллекционировали, забрали с собой в эмиграцию.

SUMMARY

The article analyzes the works of Belarusian arts and crafts of the late XIX – early XX centuries, which are now kept in the National Museum in Poznan. For the first time, fragments of the memoirs of the owner of the Anelin estate, Stanislav Shalkovsky, are presented, which describe the exhibition of folk craftsmen, held in Bykhov on October 1, 1917. The owners of Belarusian estates understood the value of works of traditional Belarusian art, organized their display on holidays, collected, took with them to emigrate.

***Гужалоўскі А. А.***

## ЭВАЛЮЦЫЯ АРХІТЭКТУРНАГА ВОБРАЗА МУЗЕЯ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 11.01.2022)*

Характарыстыкі вонкавай і ўнутранай прастор музея за некалькі стагоддзяў яго існавання моцна відазмяняліся, што было звязана не толькі са зменай архітэктурных стыляў, але і са стаўленнем музея да таго, штоён захоўваў і дэманстраваў, а таксама да гледача, які павінен гэта ўбачыць.

Практыка паказу мастацтва ў палацах, прыстасаваных для гэтых мэт, была стандартнай з’явай, пачынаючы з эпохі Рэнесансу. З 1820-х гадоў гэты напрамак развіваўся паралельна з іншым (будаўніцтвам адмыслова спраектаваных музейных будынкаў), што сведчыла пра новы спосаб асэнсавання мастацтва і стаўленне да наведвальніка як да паўнавартаснага ўдзельніка функцыянавання музейнай сістэмы. Да сярэдзіны XIX ст. наведванне музея зрабілася настолькі папулярнай з’явай, што сама прыродная і культурная спадчына больш не з’яўлялася толькі спосабам атрымання задавальнення або навучальным сродкам, яна зрабілася «свецкай рэлігіяй».

Такім чынам, музей з месца збору рарытэтаў паступова ператвараўся ў сховішча ўвасобленых у рэчах каштоўнасцей мінулых культур, месца, дзе прадметы сабраны ў большай ступені для вывучэння, чым для атрымання асалоды ад іх. Калі для эпохі Рэнесансу найбольш тыповым з’яўляўся музей-скарбніца, то ў эпоху Асветы фарміруюцца зборы, якія спрабавалі стварыць навуковую карціну развіцця навукі, мастацтва або чалавека. Пераймаючы функцыю тлумачэння рэчаіснасці ў рэлігійных інстытуцый, у пэўным сэнсе замяшчаючы іх, музей сам пачаў выступаць своеасаблівым «храмам навукі і мастацтва», прысвойваючы сакральную функцыю надаваць і вырабляць сэнсы.

Падобная змена інтэлектуальнай парадыгмы сфарміравала адпаведны вонкавы тып музея, прататыпам якога зрабіўся грэчаскі храм з уласцівымі

яму эмацыянальнымі і семантычнымі канатацыямі, а таксама адпаведнай арганізацыяй унутранай прасторы і архітэктурнага аблічча. Неакласіцызм у спалучэнні з мастацкімі прыёмамі, характэрнымі для антычнай традыцыі, былі ўпершыню прапанаваны ў 1803 г. у няйздзесненым музейным праекце французскім тэарэтыкам архітэктуры Жанам-Нікаля-Луі Дзюранам (1760 – 1834). Гэты праект, які называўся «Удакладненне урокаў архітэктуры», вызначыў вонкавае аблічча класічнага музея на некалькі дзесяцігоддзяў наперад [6, с. 11].

Адным з першых, хто ў 1823 г. пачаў рэалізацыю праекта Ж. Дзюрана ў жыццё, быў яскравы прадстаўнік класіцызму брытанскі архітэктар Роберт Смёрк (1781 – 1867). Нарадзіўшыся ў сям'і мастака-партрэтыста, ён вывучаў архітэктуру ў Каралеўскай акадэміі мастацтваў. Пасля яе заканчэння Р. Смёрк будаваў, пераважна ў Лондане,грамадскія будынкі і цэрквы ў стылі позняга класіцызму. Але галоўным праектам яго жыцця, які архітэктар рэалізоўваў на працягу 1823 – 1831 гг., стаў будынак Брытанскага музея. У 1856 – 1857 гг. братам Роберта, Сіднэем Смёркам была пабудавана чытальная зала бібліятэкі музея, перакрытая купалам 42 м у дыяметры. У 2000 г. брытанскі архітэктар Норман Фостэр ажыццявіў рэнавацыю цэнтральнага дворыка Брытанскага музея, узвёўшы ў ім шкляны купал.

Найстарэйшы музей Берліна – Стары музей, збудаваны ў 1824 – 1828 гг. паводле праекта прускага архітэктара і мастака Карла Фрыдрыха Шынкеля (1781 – 1841), таксама ўяўляе адзін з варыянтаў трактоўкі архітэктурнай канцэпцыі Ж. Дзюрана. Ф. Шынкель захаваў з яе цэнтральную ратонду, але падзяліў будынак на дзве часткі, каб сфарміраваць прамавугольны першы паверх і выставачную прастору на другім. Архітэктар таксама паставіў будынак на пастамент, да якога вядуць шырокія прыступкі. Прызматычны аб'ём знешняга выгляду будынка закрывалі два светлыя дворыкі, размешчаныя паабапал ратонды, дзе выстаўляліся скульптурныя творы. Ф. Шынкель па-новаму злучыў класічныя матывы: іанічны ордэр галоўнага фасада быў заснаваны на грэчаскай стоі, у той час як ратонда мела высока збудаваны купал з праёмам па ўзоры Пантэона ў Рыме.

Праектаванне музейных будынкаў для Гліптатэкі (1830) і Пінакатэкі (1836) пачаў у Мюнхене заснавальнік стыля «неагрэк», або «мюнхенскага элінізму», Леа фон Кленцэ (1784 – 1864). Узведзеная паводле заказу караля Людвіга I Вітэльсбаха для яго калекцыі антычнай скульптуры, Гліптатэка ўяўляла класічны грэчаскі храм – аднапавярховы, з цэнтральным порцікам, які ўтрымліваўся васьмю іанічнымі калонамі. Сцены справа і злева ад пор-

ціка былі пазбаўлены вокнаў, але ўпрыгожаны ракамі, дзе змяшчаліся статуі, што сімвалізавалі эвалюцыю гэтага віду мастацтва і вызначалі функцыю будынка як пантэона скульптуры. Першапачаткова праект Л. фон Кленцэ ўвасабляў ідэальны музей Ж. Дзюрана, але ў працэсе работы архітэктар адмовіўся ад упісанага грэчаскага крыжа і цэнтральнай ратонды. Ён размясціў усе экспанаты ў залах у храналагічным парадку, пачынаючы з егіпецкай скульптуры і заканчваючы залай з працамі Антоніа Кановы. Гэта сведчыла аб своеасаблівым антрапалагічным павароце, які адбыўся з музеем у XIX ст., калі з'явіліся экспазіцыі, зразумелыя нават непадрыхтаванаму наведвальніку. З гэтай жа мэтай на балюстрадзе фасада будынка Пінакатэкі архітэктар змясціў статуі вядомых скульптараў і мастакоў, прадстаўляючы гісторыю развіцця мастацтва і вызначаючы тым самым адукацыйнае прызначэнне музея.

У 1898 – 1911 гг. знешняе аблічча класічнага музеёна Музею прыгожых мастацтваў імя імператара Аляксандра III пры Маскоўскім універсітэце (цяпер Дзяржаўны музей выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна) надаў адзін з найбольш запатрабаваных архітэктараў Расійскай імперыі, майстар эклектыкі Р. І. Клейн (1858 – 1924) [6, с. 13].

Такім чынам, 2-я палова XIX ст. мала што змяніла ў храмавай трактоўцы музея як зацішнага месца, прызначанага для шанавання мастацтва. Падобны падыход музея да дэманстраванай у ім спадчыны не раз выклікаў крытыку мастацтазнаўцаў-сучаснікаў. Нават прадуманы дэкор храмаў-музеяў і адмыслова пабудаваныя галерэібылі недастатковай кампенсацыяй страты арыгінальных умоў бытавання музейнага прадмета. Пачатак XX ст. спарадзіў бясконцы шэраг параўнанняў музейнай прасторы з турмой або цвінтаром. Італьянскі паэт Філіпа Марынэці называў музеі могілкамі і заклікаў знішчаць іх.Падобныя ідэі выказваў мастак Эль Лісіцкі, параўноўваючы музеі з размаляванымі трунамі для жывых цел твораў мастацтва. Поль Валеры ў эсэ «Праблемы музеяў», звяртаючыся да гэтай тэмы, пісаў: «Жывапіс і Скульптура – гэта кінутыя дзеці. У іх памерла іх маці – Архітэктура. Пакуль маці жыла, яна паказвала ім месца, прызначэнне, межы» [1, с. 207].

Нягледзячы на шматлікія крытычныя заўвагі, музеі, імкнучыся дысцыплінаваць наведвальніка, усё больш дэкантэкстуялізавалі спадчыну, надзялялі яе падвойнай адчужанасцю: пазбаўлялі архітэктурнага кантэксту і ізалявалі ў галерэях, якія нагадвалі турмы. Падобную музейную прастору крытык Браян О'Догерці назваў «белым кубам» [2].

Маніфестам новай музейнай архітэктуры стаў Музей Гугенхайма на 5-й авеню ў Нью-Ёрку. Аўтар праекта – амерыканскі архітэктар Фрэнк Лойд Райт (1867 – 1959) – прапанаваў новую канцэпцыю музея як эпіцэнтра гарадскога жыцця – камунікацыі, забаў, відовішчаў. Да часу з'яўлення праекта Музея Гугенхайма прызнаны Брытанскай энцыклапедыяй «найбольш значным творчым геніем амерыканскай архітэктуры» Ф. Л. Райт быў шырока вядомы як стваральнік «арганічнай архітэктуры» і так званага адкрытага плана. Спраектаваныя ім «дамы прэрый» зрабіліся правобразам амерыканскай жылой архітэктуры XX ст. Апафеозам творчасці архітэктара стаў Музей Гугенхейма, які архітэктар праектаваў і будаваў на працягу 16 гадоў (1943 – 1959). Звонку музей уяўляе перакуленую спіраль, а яго інтэр'ер нагадвае ракавіну, у яе цэнтры – зашклёны ўнутраны дворык. Ф. Л. Райт меркаваў, што экспазіцыі павінны ўспрымацца зверху ўніз: наведвальнік павінен уздымацца на верхні паверх на ліфце і спускацца па цэнтральным спіральным пандусе па коле. Карціны вісяць на нахіленых сценах, у тым жа становішчы (пад вуглом), што і на мальберце мастака. У якасці арнаменту для музейнай агароджы архітэктар выкарыстаў матывы з карцін В. Кандзінскага. Кіраўніцтва музея выканала не ўсе патрабаванні Ф. Л. Райта, напрыклад, агляд экспазіцыісёння адбываецца знізу ўверх [4, с. 23, 44].

Абстрактнасць і лаканічнасць музейнай архітэктуры дасягнулі максімуму ва ўзведзеным у 1968 г. будынку для Новай нацыянальнай галерэі ў Берліне. Аўтарам праекта з'яўляўся нямецкі архітэктар-мадэрніст, прадстаўнік «інтэрнацыянальнага стылю», дырэктар Баўхаўза, які ў значнай ступені вызначыў аблічча архітэктуры XX ст., Міс ван дэр Роэ (1886 – 1969). Адпаведна ўласнай канцэпцыі, ён пераўтварыў музейны будынак у нябачную абалонкудля дэманстрацыі спадчыны – вялікую празрыстую прастору. Архітэктурная кампазіцыя галерэі складаецца з дзвюх частак: масіўнага маналітнага цокаля (матыў, запазычаны ў Ф. Шынкеля), які змяшчае ў сабе асноўную ўнутраную прастору галерэі з пастаяннай экспазіцыяй і адміністрацыйнымі памяшканнямі, а таксама ўсталяванага на цокалі-пастаменце шклянога паралелепіпеда. Шкляная частка займае прыкладна палову плошчы цокаля, астатняе ўяўляе адкрытую прастору, дзе размешчаны сад скульптур [5, с. 80].

Рэакцыяй на падобны мінімалізм сталі спробы ў 1970-х гадах вярнуць візуальны кантэкст спадчыне, стварыць дынамічнае ўзаемадзеянне паміж спадчынай і архітэктурай, зрабіць музейную прастору больш дэмакратычнай,

захаваўшы пры гэтым яе сакральнасць, неабходную для дэманстрацыі музейных калекцый. Найбольш плённым архітэктарам з тых, хто працаваў у дадзеным накірунку, быў Ё Мінг Пэй (1917 – 2019) – амерыканскі архітэктар кітайскага паходжання, аўтар дзесяці музейных будынкаў. Найбольш славутым з іх з'яўляецца ўзведзеная ў 1989 г. Піраміда Луўра ў Парыжы.

Яшчэ адным музейным архітэктарам па праву лічыцца амерыканскі дойлід Фрэнк Оўэн Геры (нар. у 1929 г.), які прапанаваў найбольш вядомыя сёння ўзоры дэканструктывізму. Паводле ўласнага прызнання Ф. О. Геры, у яго творчасці, мастацкім разуменні архітэктуры ўвесь час прысутнічае лейтматыў абрысу і рухомасці рыбы. Спраектаваны ім Музей Гугенхайма, які ператварыў прамысловы горад Більбаа ў адзін з культурных цэнтраў свету, не стаў выключэннем. Адкрыты ў 1997 г., ён уяўляе спалучэнне мноства розных па велічыні і форме архітэктурных аб'ёмаў. Агульная кампазіцыя будынка размешчана вакол цэнтральнага атрыума. Унутраныя прасторы разнародныя, разам з дзесяццю прамавугольнымі экспазіцыйнымі заламі ў ім маюцца памяшканні самых нечаканых формаў. У дадатак да экспазіцыйнай плошчы тут размяшчаюцца офісы супрацоўнікаў, лекцыйная аўдыторыя, крамы і рэстараны. Штогод Музей Гугенхайма ў Більбаа прымае каля мільёна наведвальнікаў. Дзякуючы арыгінальнай архітэктуры будынак стаў сапраўднай візітнай карткай горада, прыцягваючы ў Більбаа мноства турыстаў з усяго свету. Асэнсоўваючы падобны эфект, даследчыкі ўвялі тэрмін «эфект Більбаа», якім зараз характарызуецца феномен імклівага росту папулярнасці занядбанага раней месца за кошт узвядзення будынкаў эксперыментальных архітэктурных стыляў [3, с. 6].

Другі амерыканскі архітэктар-дэканструктывіст Даніэль Лібескінд (нар. у 1946 г.), паводле яго ўласных слоў, шукае натхненне падчас праектавання музейных будынкаў у музыцы, паэзіі, геаметрыі. Адным з яго найбольш вядомых праектаў лічыцца Яўрэйскі музей у Берліне, прысвечаны шматвяковай германа-яўрэйскай гісторыі. Пасля заканчэння будаўніцтва ў 1999 г. на працягу двух гадоў, пакуль не была зманціравана экспазіцыя, ён дзейнічаў як музей архітэктуры. Але нават пасля афіцыйнага адкрыцця, як лічаць спецыялісты, Д. Лібескінд у архітэктурных формах лепш перадаў феномен яўрэйскай гісторыі ў Германіі, чым музейныя супрацоўнікі з дапамогай экспанатаў.

Спраектаваны ў выглядзе ламанай лініі будынак дае наведвальнікам магчымасць у некаторай ступені адчуць тыя нягоды, якія выпалі на долю яўрэйскага народа. У асноўны корпус музея няма звычайнага надземнага

ўваходу. Туды можна трапіць толькі праз доўгую падземную «чорную» лесвіцу з шыпамі. Цынкавы фасад з хаатычнымі вузкімі шыбамі выбудаваны так, што па ім немагчыма зразумець, колькі ўнутры паверхаў і наогул ці ёсць яны. Трапляючы ўнутр, наведвальнікі губляюць пачуццё раўнавагі, бо голыя сцены – з шэрага бетону, а падлога знаходзіцца пад нахілам, і ўжо з першых крокаў трэба рабіць намаганні, каб рухацца наперад. На ўваходзе ў будынак бачны тры перакрыжаваныя «восі»: вось бесперапыннасці, якая вядзе ў пастаянную экспазіцыю, стэла ў «Садзе выгнання» і вежа Халакосту [5, с. 81].

Эстэтыку іспанска-швейцарскага архітэктара і скульптара, аўтара шматлікіх футурыстычных праектаў, рэалізаваных у розных краінах свету, Санцьяга Калатравы (нар. у 1951 г.) часта вызначаюць як «біятэк». У гэтай эстэтыцы ў 2001 г. у амерыканскім горадзе Мілуокі, паводле яго праекта, быў пабудаваны новы корпус мастацкага музея. На першы погляд, музейны будынак падобны да гіганцкай казачнай белай птушкі, якая збіраецца ўзляцець над возерам Мічыган. Насамрэч гэта 90-тонная кінетычная канструкцыя, «крылы» якой складаюцца з мноства адчувальных да змены ветру і надвор’я рэбраў, злучаных паміж сабой і здольных плаўна закрывацца і адкрывацца, што стварае адчуванне палёту. «Крылы» павільёна з размахам у 66 м распраўляюцца і складваюцца некалькі разоў на дзень, што прыцягвае ўвагу гледачоў. Пешаходны мост, размешчаны побач, з’яўляецца зручнай пляцоўкай для назірання за гэтай дзеяй. Адмысловыя датчыкі кантралююць надвор’е: калі хуткасць ветру занадта высокая, «крылы» аўтаматычна складваюцца.

Мужчынскую манаполію на праектаванне музейных будынкаў парушыла ірака-брытанская архітэктар і дызайнер, прадстаўніца дэканструктывізму Заха Хадзід (1950 – 2016). «Каралева крывой лініі», яна вызваліла архітэктурную геаметрыю, надаўшы ёй цалкам новую выразнасць. Усё гэта праявілася ва ўзведзеных у 2012 г. паводле яе праектаў будынках Мастацкага музея Мічыганскага ўніверсітэта і Цэнтра Г. Аліева ў Баку. У першым выпадку архітэктар абрала шлях кантрасту паміж футурыстычным фасадам з нержавеючай сталі і шкла музейнага будынка і чырвонай цаглянай кладкай класічнага ўніверсітэцкага кампуса. У другім – яна вырашыла ўвогуле адмовіцца ад прамых ліній, што дазволіла прадэманстраваць імкненне ўвышыню і зліццё з зямлёй, сувязь мінулага з будучым.

Калі ўпачатку XXI ст. паўстала пытанне аб стварэнні першага філіяла Луўра па-за межамі Францыі, выбар дырэкцыі музея спыніўся на сталіцы

Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Праектаванне будынка новага музея ў Абу-Дабі было даручана французскаму архітэктару Жану Нувелю(нар. у 1945 г.), імя якога добра вядома ў свеце, у тым ліку дзякуючы такім праектам, як Музей цывілізацыі на набярэжнай Бранлі ў Парыжы (2006). Адышоўшы ад мадэрнізму і постмадэрнізму, ён зрабіўся аўтарам уласнага стылю «хай-тэк», які прадугледжваў уключэнне будынка ў навакольнае асяроддзе.

Ж. Нувель заснаваў праект філіяла Луўр Абу-Дабі на ўласным бачанні галоўнага сімвала арабскай архітэктуры – купала. У выніку галоўным элементам адкрытага ў 2017 г. філіяла, будаўніцтва якога абышлося ў мільярд долараў, стаў вялікі двайны купал дыяметрам 180 м. Яго геаметрычны малюнак утвараюць больш за 8 тысяч металічных зорак, праз іх асвятляюцца ўнутраныя памяшканні, ствараючы эфект так званага «сонечнага дажджу». Пастаянная экспазіцыя і часовыя выстаўкі размешчаны ў белых кубічных стылізаваных будынках, якія разам з купалам утвараюць «музейны горад».

Сёння прыходзіць разуменне таго, што архітэктурны вобраз будынка не павінен перацягваць на сябе галоўную ўвагу ад калекцый. У той жа час ён не можа быць нейтральным у дачыненні да раскрытай музеем тэмы. Стрыманасць павінна спалучацца з выразнасцю і камунікабельнасцю. Прастата, мінімалізм і зварот да традыцыі – вось тыя рысы, да якіх усё больш прыглядаюцца сучасныя еўрапейскія музейныя архітэктары. Напэўна, эксперыменты з празрыстымі абалонкамі і цякучымі формамі, што дэматэрыялізуюць будынак, дасягнулі свайго апагея. Натуральнай рэакцыяй на гэта стала патрэба ў візуальнай стабільнасці, у звыклай для вока структуры, матэрыялізацыі архітэктуры. Калі сучасныя архітэктары звяртаюцца да класічнай архітэктурнай традыцыі, то яны робяць гэта ўжо не ў гульнявой цытатнай форме, а больш сур'ёзна і «сумленна». Калі раней музейная архітэктура ацэньвалася перш за ўсё з пункту гледжання яе арыгінальнасці, то сённяшняя сітуацыя адхіляе такі падыход, аддаючы перавагу пераасэнсаванню традыцыі праз прызму мадэрну.

Добры прыклад падобнага сінтэзу ў музейнай архітэктуры – узведзены ў 2006 г. новы будынак Літаратурнага музея ў нямецкім горадзе Марбаху, на радзіме Ф. Шылера. Спраектаваны Дэвідам Чыперфілдам (нар. у 1953 г.), стваральнікам аднайменнага архітэктурнага бюро ў Лондане, вонкавым абліччам гэты будынак нагадвае Парфенон. Але брытанскі архітэктар перадаў яго сучаснай фармальнай мовай: аб'ём будынка атачаюць стройныя бетонныя апоры, пазбаўленыя баз і капітэляў. Тут прысутнічае класічная ідэя

каланады, але пры гэтым няма ордэрнай сістэмы. Дзякуючы спалучэнню класічнага канона з мадэрнісцкай прастатой будынак Літаратурнага музея ў Марбаху быў заўважаны музейнай і архітэктурнай крытыкай. Пасля заканчэння будаўніцтва Д. Чыперфілд атрымаў за гэты праект прэстыжную еўрапейскую ўзнагароду ў галіне архітэктуры – прэмію імя Д. Стэрлінга. Архітэктура Д. Чыперфілда, функцыянальная і ненадакучлівая, сведчыць пра паступовае адраджэнне традыцыйнага разумення музея як храма культуры, рэабілітацыю базавых сацыякультурных функцый музея і аднаўленне натуральнага балансу паміж імі. [7, с. 42].

